Пралетарыі ўсіх краін, яднайцеся!

Літаратура і Мастацтва

№ 46 (2937)
17 лістапада 1978 г.

ОРГАН МІНІСТЭРСТВА КУЛЬТУРЫ І ПРАЎЛЕННЯ САЮЗА ПІСЬМЕННІКАЎ БССР

Выдаецца з 1932 г.
Цана 8 кап.

БЕЛАРУСКАЯ МУЗЫЧНАЯ ВОСЕНЬ-78

Дзяржаўны народны хор БССР.

Р. Рымбаева і вядучы А. Масляноў.

Дзяржаўны камерны ансамбль Арменіі.

З'яўляецца ў лістападаўскіх газетах фестывальная калонка. З'яўляецца як арыенцір на шматлікіх стракатых і шумных дарогах «Беларускай музычнай восені». «Восеньскія» маршруты прывабілі сёлета артыстаў з Арменіі і Украіны, з Эстоніі і Кіргізіі, з Грузіі і Расіі. У спісе гасцей — сімфанічны аркестр Ленінградскай дзяржаўнай філармоніі, Дзяржаўны Краснаярскі ансамбль танца Сібіры, народная артыстка СССР М. Біешу, прафесар Маскоўскай дзяржаўнай кансерваторыі піяніст Р. Керэр, лаўрэат Міжнароднага конкурсу песні Р. Рымбаева, вакальна-інструментальны ансамбль «Дружба». Пад урачыстай перад'юбілейнай зоркай выступаюць і гаспадары фестывалю: Дзяржаўны народны хор БССР, Дзяржаўны ансамбль танца БССР, папулярныя «Харошкі»...

Багатая гэта «восень»: 1700 удзельнікаў, каля 500 канцэртаў за 10 дзён!

Вакальна-інструментальны ансамбль «Мрыяны» (УССР).

Інструментальная група фальклорна-харэаграфічнага ансамбля «Харошкі».

Фота Ул. КРУКА.

НЕЗАБЫЎНАЯ СУСТРЭЧА

Кнігі ўспамінаў таварыша Л. І. Брэжнева мы чытаем з нязменнай цікавасцю і хваляваннем. Для франтавіка, мабыць, найбольш дарагімі будуць старонкі «Малой зямлі», для будаўнікоў першых пасляваенных год—«Адраджэння». Для мяне ж асабіста, як для колішняга камсамольца - цалінніка, толькі што надрукаваная кніга ўспамінаў «Цаліна», якую я прачытаў на адным дыханні, не адарваўшы вачэй. Яшчэ шырэй яна расхінула неглядныя прасторы юнацтва майго пакалення, паказала ва ўсёй глыбіні неверагодна складаную работу Камуністычнай партыі па пераўтварэнню роднай зямлі.

Цяпер у тых мясцінах, якія мы па даўняй звычцы называем цаліной, шумяць сады, калосяцца нівы, жывуць плённа і шчасліва сучасныя людзі ў добраўпарадкаваных пасёлках, але мы не можам пазбыцца і першаснага сэнсу слова цаліна, якое ў разуменні, у памяці народа злілося з паняццем масавага працоўнага гераізму, з паняццем рэвалюцыйнай рамантыкі, якая дзівосна пераўтварае жыццё чалавека, надае яму высокае і важнае значэнне.

Адна з самых выдатных адметнасцей кніг успамінаў Леаніда Ільіча Брэжнева заключаецца ў тым, што тут канцэнтруецца асабісты лёс мільёнаў людзей, і кожны з гэтых лёсаў адлюстроўваецца ў лёсе краіны, у тых гістарычных здзяйсненнях народа і партыі, пра якія расказвае Генеральны сакратар ЦК КПСС.

Вось чытаю пра першых цаліннікаў, з якімі сустракаўся Леанід Ільіч, а перад вачамі адразу паўстаюць незабыўныя твары маіх сяброў: Івана Капітана, Пятра Лабады, Сямёна Дудкіна і многіх-многіх іншых. Гэта ж і пра нас таксама расказана ў кнізе «Цаліна». Гэта ж і мы бедавалі, мы прыходзілі ў роспач, калі гарэлі, стачваліся дашчэнту сталёвыя лемяшы, а плугі выскоквалі з баразны, няздольныя ўзламаць спечаныя казахстанскім сонцам цалінныя дзірваны. Калі трактары, выдатныя «рабацягі» «ДТ-54», выдыхалі на гэтых дзірванах свае магутныя конскія сілы, бо былі разлічаны на іншыя землі, на іншую глебу. І мы таксама вымушаны былі адкідаць па адным, а то і па два карпусы ад плуга. Мы ламалі галовы, спрабавалі рабіць і так, і гэтак і, нарэшце, дамагаліся свайго, раскарчоўвалі, інакш і не скажаш, тысячагоддзямі некранутую зямлю. Мы — гэта сталыя мужчыны і маладыя хлопцы, механізатары, мы — гэта дырэкцыя і партыйная арганізацыя саўгаса, камсамол, спецыялісты сельскай гаспадаркі.

Леанід Ільіч Брэжнеў, які ў той час узначальваў наступленне на цаліну, пры ўсёй маштабнасці і значнасці задач, якімі ён займаўся, з поля зроку не выпускаў і нашы злашчасныя лемяшы, і лёс таго невядомага хлопца, які не вытрымаў першых цяжкасцей цаліннай пары і сабраўся ўжо сесці ў вагон, каб адагрэцца на беразе Чорнага мора ад пранізлівых буранаў казахстанскай зімы... Вось чаму пра ўсё-ўсё, што адбывалася тады на цаліне, так прачула, з вялікай зацікаўленасцю расказана ў кнізе. У тым і прыцягальная сіла ўспамінаў Л. І. Брэжнева, што глабальнасць, гістарычнасць праблем, якія ў іх асвятляюцца, выдатна стасуюцца з якімі, канкрэтнымі дэталямі жыцця, што гэтыя дэталі гавораць гэтак многа...

...Ёсць у Паўладарскай вобласці саўгас «Пагранічнік», які заснавалі добраахвотнікі-камсамольцы, дэмабілізаваныя з пагранічных войск. Працавалі там і мы, беларускія камсамольцы. Я ўсё збіраюся з'ездзіць туды, сустрэцца з сябрамі свайго юнацтва, якія цяпер маюць дарослых дзяцей, — уяўляю, колькі цікавага ўспомнім мы за сяброўскай размовай!.. Але і сёння, прачытаўшы выдатную кнігу «Цаліна», я адчуваю сябе так, быццам адбылася вельмі важная ў маім жыцці, хвалюючая і незабыўная сустрэча...

Яўген РАДКЕВІЧ.

ЖЫЦЦЁ Ў МАСТАЦТВЕ

У сувязі з юбілеем народнага артыста БССР Еўсцігнея Міровіча павысілася цікавасць да жыцця і творчай дзейнасці гэтага выдатнага рэжысёра, драматурга і арганізатара, які пакінуў яркі след у гісторыі станаўлення і развіцця Першага БДТ (цяпер — Акадэмічны тэатр імя Янкі Купалы). Новыя пакаленні дзеячаў нашай сцэны, тэатразнаўцаў, педагогаў акцёрскага і рэжысёрскага майстэрства звяртаюцца да спадчыны Е. Міровіча, вывучаюць яго вопыт, даследуюць метад яго працы з артыстамі і драматургамі, пастановачныя прынцыпы. Гісторыкі літаратуры звяртаюцца да яго п'ес — «Вова прыстасаваўся», «Графіня Эльвіра», «Кастусь Каліноўскі», «Каваль-ваявода», «Кар'ера таварыша Брызгаліна», «Перамога», «Запяюць верацёны»... Цэнтральны дзяржаўны архіў-музей літаратуры і мастацтва БССР, дзе захоўваюцца старанна сабраныя дакументы і матэрыялы аб жыцці і творчасці Е. Міровіча, прадастаўляе ўсім, хто вывучае яго спадчыну, магчымасць працаваць над дакументамі і рукапісамі. Нядаўна пісьменніца Л. Арабей, напрыклад, перадала архіву унікальны рукапіс — тэкст п'есы «Каваль-ваявода», які даціраваны аўтарам 1924 годам. Маецца ў нас карэктура п'есы «Запяюць верацёны», падрыхтаваная да шматтыражнага выдання. Каштоўныя звесткі мае фонд былога Першага БДТ, якому рэжысёр і драматург аддаў свой талент і мастакоўскі тэмперамент у дваццатыя і трыццатыя гады.

А. АСТРЭЙКА,
старшы навуковы супрацоўнік архіва-музея.

СЦВЯРДЖЭННЕ ГУМАНІЗМУ

Больш чым 600 мастакоў прадстаўлена ў Маскве ў Цэнтральнай выставачнай зале на праходзячай тут Усесаюзнай мастацкай выстаўцы «Маладая гвардыя Краіны Саветаў», прысвечанай 60-годдзю ВЛКСМ. Творы жывапісу, графікі, скульптуры, дэкаратыўна-прыкладнога мастацтва самых розных жанраў ярка раскрываюць шматграннае жыццё савецкага народа ад рэвалюцыі і да нашых дзён.

Заўсёды шмат гледачоў ля работы маладога жывапісца з Маладзечна Аляксандра Пашкевіча «Памяць». Яркім вобразным рашэннем — каларытам, кампазіцыяй, рытмам — аўтар добра раскрывае традыцыйную для беларускага мастацтва тэму мужнасці, храбрасці, самаахвяравання. Гэтай жа тэме прысвечана скульптурная работа мінчаніна Леаніда Давідзенкі «Маці і сын». Работа напоўнена шчырым адчуваннем адказнасці мастака, усіх, хто жыве на зямлі, перад загінуўшымі за шчасце сённяшняга дня. Карыстаюцца поспехам работы заслужанага дзеяча мастацтваў рэспублікі Альгерта Малішэўскага, мастакоў Мінскай, Магілёўскай і Віцебскай абласцей.

А. ЛЕГКІ.

МАСТАЦТВА НА СЛУЖБЕ РЭВАЛЮЦЫІ

«Калі рэвалюцыя прывяла мяне да мастацтва, то мастацтва цалкам увяло ў рэвалюцыю»,— пісаў аб сабе выдатны савецкі кінарэжысёр С. М. Эйзенштэйн.

Стваральніку кінаэпасу рэвалюцыі, аўтару «Стачкі», «Браняносца «Пацёмкіна», «Кастрычніка», быў прысвечаны вечар у Рэспубліканскім Доме кіно. Вядомы кіназнаўца, дырэктар музея-кватэры Эйзенштэйна ў Маскве Н. І. Клейман прааналізаваў асноўныя этапы творчай дзейнасці рэжысёра, спыніўся на адным з галоўных прынцыпаў яго мастацкага метаду — дакументальна-гістарычным падыходзе да адлюстравання рэвалюцыйных падзей.

Прысутныя прагледзелі ўрыўкі з гісторыка-рэвалюцыйнай трылогіі Эйзенштэйна. Быў таксама паказаны і пракаментаваны рабочы матэрыял фільма «Іван Грозны».

ПАЭЗІЯ ГРАФІКІ

У рэспубліканскім Доме кіно два творчыя саюзы — мастакоў і кінематаграфістаў БССР — разгарнулі вялікую выстаўку «Паэзія графікі». Яна прысвечана 60-годдзю БССР і Кампартыі Беларусі. На стэндах экспануюцца 63 графічныя работы 21 аўтара.

Выстаўку беларускіх графікаў адкрыў кандыдат мастацтвазнаўства А. Красінскі. Ён адзначыў, што цесныя сувязі жывапісцаў, графікаў, скульптараў і іншых майстроў разца і пэндаля з мастакамі кіно, тэатра і тэлебачання прынясуць узаемную карысць.

Са словамі прывітання да наведвальнікаў выстаўкі звярнуўся мастак-пастаноўшчык студыі «Беларусьфільм» Я. Ганкін.

Аб творчасці мастакоў-графікаў Беларусі гаварыў вядомы графік У. Басалыга. Ён спыніўся на работах, прадстаўленых на гэтай выстаўцы.

У экспазіцыю выстаўкі «Паэзія графікі» ўваходзяць работы народнага мастака БССР В. Цвірко, заслужаных дзеячаў мастацтваў БССР А. Паслядовіч, А. Кашкурэвіча, а таксама афорты, аўталітаграфіі, акварэлі В. Шаранговіча, Г. Паплаўскага, С. Катковай, Ю. Тышкевіча і іншых. Прыцягваюць увагу афорты А. Кашкурэвіча з «Партызанскай серыі» — «Смага», «На шчасце, на гора», «Развітанне», «Партызанскія маці»; аўталітаграфіі В. Шаранговіча да паэм Я. Купалы: А. Паслядовіч — «Ой, ляцелі гусі», «Ткачыха»; серыя работ П. Драчова «Бярэзінскі запаведнік»; афорты Ю. Зайцава і іншыя.

Выстаўка беларускай графікі выклікала вялікую цікавасць грамадскасці рэспублікі.

І. КРУПЕНЯ.

ПАРТЫЙНАЯ РАБОТА—ТВОРЧАСЦЬ

У Мінскай Вышэйшай партыйнай школе адбылася чытацкая канферэнцыя па кнізе Васіля Якавенкі «Пакуль сонца ў зеніце». Кніга выклікала асаблівую цікавасць слухачоў ВПШ, бо яна прысвечана дзейнасці партыйных работнікаў.

Намеснік сакратара партыйнага камітэта ВПШ Л. Чарапанава, якая адкрыла канферэнцыю, адзначыла, што ў наш час дзейнасць партыйных работнікаў павінна вызначацца ўменнем працаваць з людзьмі, высокай патрабавальнасцю да таварышаў і асабліва да сябе.

В. Якавенка на прыкладзе работы былога сакратара Докшыцкага райкома партыі У. Ф. Крышталевіч паказаў, што партыйная работа не звод правіл і інструкцый, а няспынная творчасць. Нялёгкая барацьба докшыцкіх хлебаробаў за ўраджай, зямля і людзі, партыя і народ, асабістае жыццё і грамадскае, роля і месца партыйнага работніка ў ім — вось кола пытанняў, якое ўзняў у кнізе аўтар. Аб гэтым гаварылі на канферэнцыі дацэнт кафедры партыйнага і савецкага будаўніцтва М. Буйко, слухачы ВПШ Н. Маеўская, У. Ляшкевіч, В. Картановіч.

Ад імя працоўных Віцебшчыны выступалі дырэктар абласной бібліятэкі М. Крупская, адна з гераінь кнігі, старшыня калгаса «Памяць Ільіча» Докшыцкага раёна Т. Псоні. Яны адзначылі, што дзейнасць герояў кнігі — яркі прыклад камуністычнага будаўніцтва ў нашай краіне. На прыкладзе галоўнай гераіні кнігі У. Ф. Крышталевіч аўтар паказаў, як былая батрачка прайшла шлях да пасады першага сакратара райкома.

На канферэнцыі выступілі пісьменнік Леанід Прокша і Герой Сацыялістычнай Працы У. Ф. Крышталевіч.

Васіль Якавенка расказаў аб рабоце над кнігай, адказаў на пытанні слухачоў ВПШ.

А. КАНСТАНЦІНАЎ.

ГОСЦЬ З ЧЭХАСЛАВАКІІ

У творчай камандзіроўцы ў Мінску знаходзіцца вядомы перакладчык беларускай і ўкраінскай літаратур, прафесар Карлава універсітэта ў Празе Вацлаў Жыдліцкі. У яго перакладзе на чэшскую мову выйшлі раманы «Сэрца на далоні» Івана Шамякіна, «Птушкі і гнёзды» Янкі Брыля, аповесці «Дажыць да світання» Васіля Быкава, «Мсціжы» Івана Пташнікава, «Данута» Аляксея Карпюка, раманы і аповесці Уладзіміра Караткевіча «Дзікае паляванне караля Стаха», «Нельга забыць», «Хрыстос прызямліўся ў Гародні», Алеся Адамовіча «Хатынская аповесць».

У Саюзе пісьменнікаў Беларусі адбылася гутарка з Вацлавам Жыдліцкім, у якой прынялі ўдзел першы сакратар праўлення Іван Шамякін, сакратары Анатоль Вярцінскі і Барыс Сачанка, пісьменнікі Алесь Адамовіч, Артур Вольскі, Аляксей Гардзіцкі, Мікалай Кругавых, Іван Пташнікаў, Язэп Семяжон, Янка Сіпакоў, Яўген Каршукоў.

Удзельнікі гутаркі вялі размову пра беларуска-чэшскія літаратурныя сувязі, якія за апошнія гады пашырыліся. Госць расказаў пра свае творчыя планы— нядаўна ён завяршыў пераклад кнігі А. Адамовіча, Я. Брыля, У. Калесніка «Я з вогненнай вёскі...», зараз працуе над перакладам зборніка беларускіх аповесцей, складаннем анталогіі беларускай сучаснай паэзіі і аднатомніка твораў беларускай савецкай літаратуры.

У час сустрэчы. В. Жыдліцкі трэці справа.
Фота Ул. КРУКА.

70 ГАДОЎ «ЖАЛЕЙЦЫ» ЯНКІ КУПАЛЫ

«На вуліцы «Маладой Беларусі» вялікае свята! Сонца жывой, сапраўднай паэзіі заглянула ў ваконца цёмнай, беднай, але вялікай хаты беларускага народа... Мы прысутнічаем пры гістарычнай падзеі надзвычайнай для края важнасці.

Беларуская песня з галіны этнаграфіі пераходзіць у галіну літаратуры... І «Жалейка» Янука Купалы — адзін з несумненных доказаў гэтага буйнога факта... Няхай ён будзе для беларусаў тым, чым быў Шаўчэнка для Украіны... Прыйдуць лепшыя часы, — і за подзвіг яго родны народ заплаціць яму сваёй лепшай удзячнасцю — бессмяроццем!»

Так пісаў у сувязі з выхадам у свет зборніка вершаў Янкі Купалы «Жалейка» адзін з першых яе рэцэнзентаў У. Самойла ў газеце «Минский курьер» за 28 жніўня 1908 г. Да гонару У. Самойлы, ён ужо тады ўбачыў значэнне творчасці Янкі Купалы для беларускай культуры. Станоўчыя водгукі на першы зборнік вершаў Купалы былі апублікаваны ва ўкраінскім, польскім, чэшскім друку. Заўважыў творчасць беларускага паэта Максім Горкі. Купала быў адразу прызнаны як прыкметная з'ява агульнаславянскай культуры.

Сёлета споўнілася 70 гадоў з дня выхаду ў свет «Жалейкі». Гэтай вельмі знамянальнай для беларускай літаратуры даце ў Мінскай цэнтральнай бібліятэцы імя Янкі Купалы быў прысвечаны літаратурны вечар. Сюды прыйшлі пісьменнікі, вучоныя, супрацоўнікі Літаратурнага музея Янкі Купалы, настаўнікі, студэнты, школьнікі.

З уступным словам пра «Жалейку» выступіў паэт, доктар філалагічных навук, прафесар А. А. Лойка.

З вялікай цікавасцю было выслухана выступленне акадэміка АН БССР Г. І. Гарэцкага, які выказаў свае думкі пра творчасць Янкі Купалы і ў прыватнасці пра зборнік «Жалейка». «Памятаю той час, калі гэты зборнік падараваў мне мой брат Максім, сябра Янкі Купалы. З таго часу «Жалейка» стала маёй любімай кнігай», — сказаў ён.

Паэты Алег Лойка, Казімір Камейша прачыталі свае вершы. Вершы ўкраінскіх паэтаў, прысвечаныя Купалу, прачытаў у сваім перакладзе Мікола Базарэвіч.

На вечары выступілі таксама артысты Беларускай дзяржаўнай філармоніі і студэнты фінансава-эканамічнага тэхнікума, якія прачыталі вершы з Купалавай «Жалейкі», вершы, што і сёння гучалі гэтак жа светла і ўсхвалявана, як і 70 гадоў назад.

Н. ЦВІРКА.

ПРА МУЖНЫХ ГЭТЫ РАСКАЗ

«Неўміручы экіпаж» — так называецца адна з дакументальных аповесцей Героя Савецкага Саюза Мікалая Нікольскага, што ўвайшла ў яго кнігу «За лініяй фронту», выпушчаную Ваенным выдавецтвам Міністэрства абароны СССР у серыі «Библиотека юного патриота». У гэтым хвалюючым творы расказваецца пра подзвіг экіпажа легендарнай «трыццацьчацвёркі» ў складзе Герояў Савецкага Саюза Паўла Рака, Аляксандра Пятраева, Аляксея Данілава, які ў сорак чацвёртым годзе першым уварваўся ў заняты фашыстамі Барысаў і гераічна загінуў у змаганні з ворагам.

ТВОРЧАЕ СУПРАЦОЎНІЦТВА

У Гомельскім абласным драматычным тэатры рэжысёр Паўднёва-Чэшскага тэатра Фрыдрых Мілан ставіць спектакль «Забыты чорт ці грэшная вёска» па матывах казкі «Далскабаты» чэшскага пісьменніка Яна Дрды.

— Гэты спектакль, — гаворыць Фрыдрых Мілан, — аб жыцці нашага народа. Пабудаваны на фальклорнай аснове, ён поўны вялікага і светлага аптымізму. Дэкарацыі, якія выкананы мастаком Уладзімірам Ландай, узмацняюць гучанне зместу.

Спектакль, прэм'ера якога адбудзецца 19 лістапада, — сведчанне цеснага сяброўства і творчага супрацоўніцтва двух тэатральных калектываў. Раней гомельскі рэжысёр І. С. Папоў паставіў на сцэне Паўднёва-Чэшскага тэатра камедыю М. В. Гогаля «Рэвізор». Летась Гомельскі абласны тэатр пазнаёміў працоўных г. Чэске-Будзеёвіцы са спектаклем «Забыць Герастрата» па п'есе Г. Горына, а майстры сцэны з братняй Чэхаславакіі ў пачатку сёлетняга года выступілі перад гамяльчанамі са спектаклем «Белая хвароба» па п'есе Карэла Чапека.

А. МАКСІМАЎ.

ПРАЦУЕ СЛАЙДКЛУБ

Пры савеце Дома архітэктараў дзесяты год працуе Клуб маладога архітэктара. Днямі тут адбыліся чарговыя заняткі слайдклуба. Лекцыю на тэму «Помнікі архітэктуры і мастацтва Фларэнцыі, Рыма і Венецыі» прачытала кандыдат архітэктуры Маіна Іванаўна Арцішэўская.

Аб структуры і формах работы клуба мы папрасілі расказаць старшыню праўлення клуба, архітэктара, намесніка дэкана архітэктурнага факультэта БДПІ, выкладчыка кафедры жылых і грамадскіх будынкаў Вячаслава Барысавіча Ангелава.

— Спачатку гэта быў звычайны студэнцкі гурток старшакурснікаў, створаны пры Саюзе архітэктараў. З часам правілы і формы работы клуба мяняліся. Зараз членамі яго з'яўляюцца не толькі студэнты, але і архітэктары, маладыя спецыялісты праектных арганізацый. І наогул, запрашаем любога, хто цікавіцца нашай справай.

Праўленне клуба займаецца падрыхтоўкай і арганізацыяй работы ў некалькіх напрамках. Гэта тэматычныя вечары і вечары адпачынку, дыспуты і размовы, цікавыя сустрэчы. Мы запрашаем да сябе выкладчыкаў нашага інстытута, мастацтвазнаўцаў, вядомых архітэктараў, лаўрэатаў Дзяржаўных прэмій. Так, у клубе ўжо выступалі архітэктары І. Боўт, А. Дзятлаў, А. Сысоеў. Перад удзельнікамі клуба выступаюць артысты тэатраў.

Амаль самая папулярная форма работы — слайдклуб. Кожны такі вечар збірае вялікую аўдыторыю. Гэта, напэўна, таму, што тут, акрамя расказу, ёсць магчымасць яшчэ і ўбачыць. Кожны такі прагляд слайдаў звычайна суправаджаецца зацікаўленым абмеркаваннем убачанага.

С. ФУРСА.

У САЮЗЕ ПІСЬМЕННІКАЎ

Адбылося пасяджэнне Камісіі па рабоце з маладымі Саюза пісьменнікаў БССР. На пасяджэнні абмеркавана інфармацыя членаў камісіі, якія выязджалі ў раённыя і абласныя літаратурныя аб'яднанні. Вылучаны кандыдатуры для ўдзелу ў VII Усесаюзнай нарадзе маладых пісьменнікаў.

У абмеркаванні прынялі ўдзел старшыня камісіі Я. Сіпакоў, пісьменнікі В. Адамчык, С. Грахоўскі, А. Гардзіцкі, У. Дамашэвіч, Я. Каршукоў, Ю. Свірка.

АДНАМУ З ПАЧЫНАЛЬНІКАЎ

У цэнтры пасёлка Радашковічы сабраліся мясцовыя жыхары і госці, каб ушанаваць памяць Ядвігіна Ш. (Антона Іванавіча Лявіцкага), які некаторы час тут жыў і працаваў. Ва ўрачыстай абстаноўцы старэйшы паэт рэспублікі Максім Лужанін адкрыў мемарыяльную дошку аднаму з пачынальнікаў беларускай мастацкай прозы.

Выступіўшыя на ўрачыстасці Іван Чыгрын, Арсен Ліс, вучні Радашковіцкай сярэдняй школы гаварылі пра жыццёвы і творчы шлях Ядвігіна Ш., пра яго творы.

Адбылася таксама сустрэча ў школе, дзе выступілі Максім Лужанін, Уладзімір Караткевіч, Яўген Каршукоў, Адам Мальдзіс, Іван Чыгрын, Арсен Ліс.

Сымон БЕЛЫ.

АЛІМПІЙСКАЯ МАЗАІКА

«Олимпиада-80» — часопіс пад такой назвай толькі нядаўна з'явіўся ў газетных кіёсках, аднак адразу заваяваў шчырую прыхільнасць і папулярнасць у шматлікіх аматараў спорту. Такая прыязнь невыпадковая. Выданне гэтае, якое выпускае Арганізацыйны камітэт Алімпійскіх гульняў 1980 года ў Маскве сумесна з выдавецтвам «Прогресс» на рускай, французскай, англійскай, іспанскай і нямецкай мовах, шырока, папулярна і даходліва расказвае пра ход падрыхтоўкі да гэтых важных спартыўных спаборніцтваў, знаёміць чытачоў з найбольш вядомымі спартсменамі, з гарадамі, дзе пройдуць алімпійскія мерапрыемствы.

Паступіў у продаж чарговы, васемнаццаты, нумар «Олимпиады-80». На першай вокладцы яго — здымак плошчы Якуба Коласа ў Мінску з будынкам інстытута фізкультуры на пярэднім плане.

«Алімпійскія клопаты Мінска» — так называецца адно з інтэрв'ю гэтага нумара. На пытанні карэспандэнта часопіса адказвае старшыня выканкома Мінскага гарадскога Савета народных дэпутатаў Станіслаў Лукашэвіч. Ён падрабязна гаворыць аб тым, што робіцца ў горадзе-героі па падрыхтоўцы да Алімпіяды-80, як рэканструіруюцца старыя і ўзводзяцца новыя спартыўныя аб'екты. Тут жа змешчаны шматлікія здымкі.

Уладзімір Глод сваю карэспандэнцыю назваў «Беларускія сувеніры». У ёй паведамляецца пра рэспубліканскую выстаўку, на якой дэманстраваліся вырабы прадпрыемстваў Беларусі з алімпійскай сімволікай.

На старонках часопіса беларускія матэрыялы змяшчаліся і раней. У прыватнасці, ужо расказвалася пра спартсменаў Мінскага трактарнага завода, пра адкрыты зімовы чэмпіянат СССР па лёгкай атлетыцы, які праходзіў у Мінску...

Е. ДРОМІН.

У САЮЗНЫМ ДРУКУ

Дзесяты нумар часопіса «Наш современник» адкрываецца падборкай вершаў народнага паэта Беларусі П. Броўкі, аб'яднанай назвай «Нязгаснае полымя». Творы на рускую мову пераклаў В. Карчагін.

●

Дзесяты нумар часопіса «Новый мир» змяшчае рэцэнзію Янкі Брыля «Ён — строгі да праўды!» на твор Віктара Казько «Суд у Слабадзе», які быў змешчаны ў «Дружбе народов» (№ 12, 1977 г.). Аўтар рэцэнзіі спыняецца не толькі на аналізе адной аповесці, а дае разгорнутую ацэнку творчасці В. Казько: «Пяць аповесцей — ці шмат гэта? З пачуццём задавальнення адзначаю сабе: так, шмат! Не па колькасці старонак, а таму, што ў іх — цэлы свет, багаты, шматфарбны, хвалюючы. Свет чалавека, які адчувае, любіць жыццё і ўмее аб гэтым расказаць».

●

Часопіс «В мире книг» шырока адзначыў 150-годдзе з дня нараджэння Льва Мікалаевіча Талстога. Сярод іншых матэрыялаў у дзевятым нумары прыцягвае ўвагу артыкул выкладчыка філасофіі Беларускага політэхнічнага інстытута, мінскага кнігалюба Дзмітрыя Мароза «Стыль і дух «Вайны і міру», у якім расказваецца пра ілюстрацыі вядомай эпапеі пісьменніка мастаком М. Башылавым.

●

«Ні дня без трывогі за чалавека» — так называецца артыкул Святланы Хорсун, змешчаны ў адзінаццатым нумары часопіса «Детская литература». У ім аналізуецца кніга лаўрэата Дзяржаўнай прэміі БССР Васіля Віткі «Дзеці і мы».

Пра афармленне беларускай дзіцячай кнігі, пра мастакоў, якія працуюць у гэтай галіне, расказвае Э. Пугачова ў артыкуле «Метамарфозы дэкаратыўнасці».

●

Выйшаў з друку дзевяты, дадатковы том Кароткай Літаратурнай Энцыклапедыі. У ім змешчаны бібліяграфічныя звесткі і пра беларускіх пісьменнікаў.

ЗАСЛОНА АДКРЫТА

Сёлетні тэатральны сезон коласаўцы пачалі атрымаўшы некалькі высокіх узнагарод за ўдзел ва ўсесаюзных аглядах і конкурсах. Рэжысёр спектакля «Сымон-музыка» В. Мазынскі і артыст С. Шульга сталі лаўрэатамі прэміі Ленінскага камсамола Беларусі. Таму, натуральна, калектыў сустрэў першых гледачоў з асаблівым творчым уздымам. У прыватнасці, з добрым артыстычным паглыбленнем у маральна-этычныя канфлікты сучаснасці выконваецца спектакль, прэм'ера якога нядаўна адбылася ў Віцебску. — «Мае Надзеі» па п'есе М. Шатрова (пераклад на беларускую мову Ю. Гаўрука) у пастаноўцы Б. Эрына, аўтар сцэнаграфіі народны мастак БССР Я. Нікалаеў, кампазітар С. Картэс. Што яшчэ з навінак чакае сталых наведвальнікаў Акадэмічнага тэатра імя Якуба Коласа? — на гэтае пытанне карэспандэнта «Літаратуры і мастацтва» адказаў дырэктар тэатра, заслужаны дзеяч культуры БССР Г. Асвяцінскі.

— Цяпер мы захоплены спектаклем, які прысвячаецца 60-годдзю БССР і Кампартыі Беларусі. Гэта — драма У. Караткевіча «Кастусь Каліноўскі». Пастановачная брыгада на чале з галоўным рэжысёрам В. Мазынскім шукае па-мастацку арыгінальнае сцэнічнае вырашэнне гістарычнага матэрыялу, да якога даўно не звярталася тэатральнае мастацтва. Мастак А. Салаўёў, кампазітар С. Картэс, акцёры У. Куляшоў, Ф. Шмакаў, Г. Дубаў, Г. Доля, Ю. Засядацелеў і іх партнёры цяпер матэрыялізуюць задуму, робяць «жывымі» постаці мінулага, рэвалюцыйны напал якога і сёння не можа не хваляваць нас. Спадзяёмся, што спектакль стане сур'ёзным выпрабаваннем калектыву на творчую і грамадзянскую сталасць у асэнсаванні гераічных старонак нашай гісторыі.

Група выканаўцаў на чале з маладым рэжысёрам В. Маслюком падрыхтавала пазапланавы спектакль па п'есе сучаснага польскага драматурга Е. Пшэздзецкага «Брыльянт» (пераклад зрабіў пастаноўшчык). І тут размова ідзе аб сапраўдных чалавечых каштоўнасцях, аб хараستве чалавечай душы, здатнай супрацьстаяць злу і жорсткасці. Пазней мы пакажам сучасную венгерскую п'есу К. Саконі «Тэлевізійныя памехі», якая пры ўсёй адметнасці аўтарскага почырку закранае тыя ж праблемы на арыгінальным жыццёвым матэрыяле сённяшняй Венгрыі.

У другі раз коласаўцы звернуцца да хрэстаматыйнай п'есы М. Горкага «Дачнікі», якую ў 1964 годзе тут ставіў І. Папоў з удзелам нашых ветэранаў. Горкаўскі роздум аб сацыяльным абліччы чалавека і яго адказнасці за грамадскі клімат часу дае трупе артыстаў магчымасць выявіць сучаснае разуменне заўсёды надзённай праблематыкі. Асабліва карысна паспрабаваць свае сілы на такой драматургіі маладым артыстам.

Акрамя таго, на афішы нашага тэатра будуць пазначаны творы А. Петрашкевіча («Напісанае застаецца»), У. Цендракова («Тры мяхі пшаніцы»), А. Арбузава («Жорсткія гульні») і балгарскага драматурга П. Панчава («Казка пра чатырох блізнят»).

Планы, як бачым, вялікія, і калектыў прыкладзе ўсе намаганні, каб здзейсніць задуманае на высокім ідэйна-мастацкім узроўні.

На здымку: артыстка Г. Доля і народная артыстка БССР Г. Маркіна ў спектаклі «Мае Надзеі».

Фота С. КОХАНА.

НАМ ПІШУЦЬ

Курсы па падрыхтоўцы кіраўнікоў мастацкай самадзейнасці і мастакоў-афарміцеляў арганізавала Гомельскае абласное ўпраўленне культуры. Перад слухачамі выступаюць з лекцыямі работнікі ўпраўлення культуры, метадысты дамоў мастацкай самадзейнасці і народнай творчасці, кіраўнікі мастацкіх самадзейных калектываў Гомельскага Палаца культуры чыгуначнікаў імя У. І. Леніна.

Плануецца правядзенне сустрэч курсантаў з кіраўнікамі мастацкіх калектываў.

А. ЖЫЖНЕЎСКІ.

Раённая выстаўка работ народных умельцаў і мастакоў, прысвечаная 60-годдзю БССР і Кампартыі рэспублікі, адкрыта ў Бярозаўскім раённым Доме культуры. У яе экспазіцыю ўвайшлі работы сельскіх мастакоў і народных умельцаў, якія экспанаваліся да гэтага ў сельскіх дамах культуры і клубах — жывапіс, графіка, разьба па дрэве.

Вялікай увагай наведвальнікаў карыстаюцца работы А. Ахрэмкава, А. Маразюка, Д. Рак, С. Юркевіча.

М. КАЗЛОВІЧ.

«Полымя» — так названы агіттэатр, створаны пры Слонімскім раённым Доме культуры. Цяпер тут распрацоўваюцца дзве новыя тэматычныя праграмы, прысвечаныя надыходзячаму святу — 60-годдзю БССР і Кампартыі Беларусі. Умоўныя назвы гэтых прадстаўленняў «Хатынь» і «Старажытны і вечна малады Слонім».

М. РЫЛКО.

Самадзейныя артысты народнага тэатра Краснапольскага раённага Дома культуры паказалі працаўнікам палёў і ферм калгаса «Камінтэрн» спектакль па п'есе І. Шамякіна «І змоўклі птушкі». Гэтым вызным спектаклем народны тэатр пачаў свой новы тэатральны сезон.

Цяпер калектыў працуе над п'есай Івана Мележа «У новым доме». Гэта пастаноўка прысвячаецца 60-годдзю БССР і Кампартыі Беларусі. У галоўных ролях выступяць загадчыца секцыі універмага Н. Баранава, метадыст РДК Т. Чахоўская, шафёр А. Калеснікаў і інш.

Г. САПЛІНА.

У рабочым пасёлку Дзітва закладзены парк імя 60-годдзя БССР і Кампартыі Беларусі. Плошчу пад яго падрыхтавалі механізатары мясцовага саўгаса імя Леніна, саджанцы — старшакласнікі, а таксама рабочыя торфабрыкетнага завода і саўгаса.

Дрэвы згрупавалі ў выглядзе невялічкіх гаёў. У адным месцы пасадзілі бярозы, у другім — клёны, у трэцім — ліпы.

Тут будуць пракладзены алеі, пастаўлены лаўкі, разбіты клумбы для кветак.

А. СТАДУБ.

Сцяпан

ГАЎРУСЁЎ

Каб чалавекам быць...

Приходит время зрелости суровой.
Эдуард БАГРЫЦКІ.

Перад сумленнем цяжка апраўдацца,
Калі ў ім будзе з праўдай разнабой.
Але штодзённа трэба спавядацца,
Каб чалавекам быць — перад сабой.

Ты прысягаў.
Каму?—
Свайму народу!
Ты прысягаў.
Чаму?—
Сваёй зямлі,—
Каб ускаціць з чужога агароду
Валун вайны
злачынцы
не змаглі.

●

Прымярацца да шчасця,
Мабыць, трэба з пары,
Калі грозяцца ўпасці
У бяздоннасць бары.

Столькі ў юнасці сілы:
Ледзь яе закрані —
Затрымцяць небасхілы,
Загудуць карані.

Не баішся нічога —
Ні сумненняў, ні здрад.
Пралягае дарога
Міма суму і страт.

Сам сабе не дваішся —
Справа ёсць да ўсяго.
Аднаго і баішся —
Абмялення свайго.

Можа, выйдзе не гэтак —
Сцежка мкне на шашу,
Закрасуе палетак,
Ускалосіць душу.

●

Анатолю ВЯЛЮГІНУ

Усё аддаць — сябе прыдбаць,
Вярнуцца з восені ў прадвесне,
Сябе штодзённа адчуваць
У эпіцэнтры юнай песні.

Між гэтых ломкіх гаясоў
І крыл, яшчэ не ацвярдзелых,
Адчуеш горды шум лясоў
І водар ніў, ад рос спацелых.

Адно пяро з свайго крыла
Падлётку ўручыш на дарогу,
Глядзіш — пабольшала святла,
Што нашу значыць перамогу.

І новы жаўра з-за пляча
Зноў сочыць, тоячы дыханне,
Ты палюбіў асмужаныя скалы,
Дзе колькі раз зіхцелі на штыку
Абрысы Мінска і Масквы кварталы,
Байкальскі вецер і агні Баку.
У сэрцы адчаканена нібыта,
Што з гэтых высяў адчуваў нутром —
Гагарынская зорная арбіта
І —
бамаўскі тысячамільны гром.

Дык хай жа звоніць верш раздольнай
сталлю
І мне перадае характар свой,
Каб вырвацца з няўдач,
як са шпіталю,
І —
зноў спяшацца да перадавой!

Ірынка

Як сонца жарынка,
мне ў грудзі балюча запала —
Дзяўчынка Ірынка
з бацькамі на Усход адступала.
Ад цёмнага жалю
лясы да зямлі прыпадалі.
Аблокі дрыжалі,
праменні ў вачах прападалі.
Яна гарадская —
на ножках бялеюць
тарксінкі.
Уся трапяткая —
дрыготней світальнай расінкі.
І мы, як ні цыркай,
не здолелі гэтак напяцца:
Умела, як цыркуль,
яна крутануцца на пятцы!

І што нам вайна!
Што чорнае ліха з бядою:
Так слаўна яна
бярэ гладышок сырадою!

Паехалі рана.
За імі услед — бамбавозы.
Зусім нечакана
назад прыскрыпелі калёсы.

І мы не ахвочы
паверыць — шнурочкі-павекі
Яснейшыя вочы
закрылі навекі-навекі.

З-пад русых кудзерцаў
блішчыць журавінка-крывінка.
Як крык нашых сэрцаў
пачуць не магла ты, Ірынка?!

Сястрыца мая,
я ведаў цябе дзве гадзіны,
Ды ўсё жыццё я
клянуся табе штохвіліны:

Жыць буду пад сонцам,
пакуль яно ў сэрцы іскрыцца:
З апошнім забойцам
за першы свой боль разлічыцца!

Як з паляшуцкага карча
З'явіўся дзед, нібы паданне.

І як там дні не халадзей,
Але нікому не зайздросціў,
І стаў за многіх маладзей
На столькі ясных маладосцяў.

●

Магілёўскі, палескі ці мінскі,
Вецер сціхні над кожнай
вярбой —
Развітаўся Іосіф Камінскі
Са сваёю пякельнай журбой.

Трыццаць год палымнеў ён
няспынна
На вачах утрапёнай зямлі,
Але рукі жалезнага сына
Адпусціць яго боль не маглі.

Скамянеў ад адчаю і гора,
Якім будзе на векі вякоў.
А прайшоў бы ад мора да мора,
Каб вярнуць у агонь чужакоў!

●

От чаму нашы маці галосяць,
Прыпадаюць грудзьмі да зямлі
І нябёсы роспачна просяць,
Каб дачасна сыноў не ўзялі.

Абшчапіўшы адчайна драбіны,
Выдыхае:
— Сынок мой, сынок!..
Цяжка падаюць слёзы-бабіны
У суцішаны пыл каля ног.

Хмурыць брат несярдзітыя
бровы
І не можа падняць галавы:
— Мама, грады патопчуць
каровы,
Можа б, неяк вярнуліся вы...

Неба просінь скразная такая,
Галашэннем абмыта нібы,
І калі чаго ў ім не хапае,
Дык архангела грознай трубы.

Сэрца маці ў жалезным капкане,
Вечны боль не адпусціць яго
І нівек не кране хваляванне
З-за цяжкога набытку свайго.

— Мой сыночак... Чаму ж яно
гэтак...
Хоць дзянёчак пабыў бы...
Але
Усё кілішкі іскрыстыя кветак
Ставіць лёс на жалобным стале.

От чаму нашы маці галосяць,
Прыпадаюць грудзьмі да зямлі
І карміцельку роспачна просяць,
Каб дачасна сыны не ляглі.

●

Неба ўздыбіцца ці прагнецца
Пругкім люстрам тваёй душы,—
І зямля да нутра здрыганецца:
Зноў акопы і бліндажы!

І пад рокатам бамбавозавым,
Што даносіцца ўсё часцей,
І сумленнем сваім, і розумам
Атуляеш усіх дзяцей.

Можа спрэчка слепая
выбліснуць —
Не падзеляць чаго тузы —
Чалавецтва з калыскі выплеснуць
З-за нікчэмнейшай драбязы.

І планета ўся ходзіць ходырам,
Веюць атамныя дымы.
Людзі, дыхайце чыстым водарам,
Беражыце свае дамы!

Людзі добрыя, што вы робіце
На пагібель сваёй душы?
Застаюцца салдатам дробязі,
А зачыншчыкам — барышы.

На пейзаж наглядзішся гэты —
Веюць ветры з усіх бакоў!
Вы куды плывіцё,
пакеты
Санітарныя
аблакоў.

Перадзім'е.
Фотаэцюд В. ФЕДАРЭНКІ.

КНІГАПІС

КЛЕЦК

А. БУШЭНКА. Клецк. Гісторыка-эканамічны нарыс. На рускай мове. Мінск. «Беларусь». 1978.

Серыя «Гарады Беларусі», якую вось ужо некалькі гадоў выпускае выдавецтва «Беларусь», палюбілася шырокаму колу чытачоў не толькі ў рэспубліцы, але і далёка за яе межамі. Чытачы пазнаёміліся ўжо з учарашнім і сённяшнім днём Слуцка і Бярозы, Салігорска і Чэрвеня, Лепеля і Жлобіна і іншых раённых цэнтраў.

І вось гісторыка-эканамічны нарыс Аляксандра Бушэнкі, прысвечаны Клецку, які сёлета адзначае сваё 850. годдзе.

Пра ўзнікненне горада і далейшае фарміраванне ягонага вобліку аўтар расказвае ў раздзеле «Далёкіх гадоў кароткія штрыхі». Наступны — «Абуджэнне» — ўзнаўленне рэвалюцыйных падзей, што мелі месца ў пачатку нашага стагоддзя. Гаворыцца ў нарысе таксама пра жыццё працоўных пры белапольскай акупацыі і ў радасныя месяцы вызвалення, калі былыя заходнія вобласці Беларусі аб'ядналіся ў адзінай савецкай сям'і.

Падрабязна асвятляецца ўдзел мясцовых жыхароў ва ўсенароднай барацьбе з нямецка-фашысцкімі захопнікамі ў раздзеле «Гады суровых выпрабаванняў». Сённяшняй Клеччыне, яе заўтрашняму дню прысвечаны раздзелы «У мірныя дні», «Жыхары раёна — Героі Сацыялістычнай Працы», «Крокі ў заўтра».

С. ВІРЗОЎСКІ.

СПОВЕДЗЬ ПЕРАД ЛЮДЗЬМІ. Зборнік. На рускай мове. Мінск, «Беларусь», 1978.

У аўтараў гэтай кнігі розны ўзрост і розныя прафесіі, але ўсіх аб'ядноўвае тое, што яны ў свой час былі веруючымі, і толькі пасля цяжкага роздуму, доўгіх пошукаў знайшлі сваё сапраўднае месца ў жыцці. І вось цяпер, калі ёсць магчымасць асэнсаваць раней шае, яны дзеляцца перажытым з іншымі, і робяць гэта дзеля таго, каб тыя не паўтарылі іхніх памылак, каб адчулі ў паўсядзённасці шчасце і радасць.

Зборнік, складзены А. Кругловым і Д. Мацяс, з цікавасцю прачытаюць і атэісты, і самі веруючыя, чытач знойдзе ў ім адказы на многія пытанні, якія хвалююць і непакояць людзей, патрабуюць свайго неадкладнага вырашэння.

В. РАСОЛЬКА.

НА АТРЫМАННЕ ДЗЯРЖАЎНАЙ ПРЭМІІ БССР

„Я СВОЙ РАДОК НА СЭРЦАХ ВАЖУ...“

Максім Лужанін — адзін са старэйшых дзеячаў нашай літаратуры — па-добраму здзіўляе і радуе сваёй творчай актыўнасцю і душэўным неспакоем.

Штогод — кніга!

І пры гэтым без якіх бы там ні было заўважных адзнак паспешлівасці, унутранай мітусні. Вершы, паэмы, проза, публіцыстыка, літаратуразнаўства, артыкулы аб мове... Шматжанравасць у яго зусім не азначае раскіданасці творчых задум. Наадварот, яны пранікнуты цэласнасцю і адзінствам светапогляду, пячаццю буйной творчай індывідуальнасці.

Сярод твораў, вылучаных сёлета на атрыманне Дзяржаўнай прэміі БССР імя Я. Купалы, — нядаўняя кніга вершаў і паэм М. Лужаніна «Лявоніха». Склалася яна з дзвюх паэм («Бяссонны тэлефон» і «Лявоніха») і некалькіх цыклаў вершаў, у тым ліку сатырычных. Склалася, відаць, — як гэта характэрна для многіх лужанінскіх кніг — паступова: адлегласць паміж задумай і яе ажыццяўленнем дасягае ў яго часам не аднаго дзесяцігоддзя. Словам, яму не адмовіш ва ўменні і таленце апрацаваць рэч «з цярпеннем», як гэтага патрабаваў М. Багдановіч.

Новы зборнік вабіць добрай разнастайнасцю — тэматычнастылявой і жанравай. Грамадзянска-палітычная лірыка мяжуе з інтымнай, пейзажнай, філасофскай... Усё гэта цэментуецца выразнай ідэйна-эмацыянальнай еднасцю — еднасцю і непаўторнасцю асобы паэта, значнасцю яго жыццёвага вопыту, багаццем эстэтычнага ідэалу, мудрым уменнем «бачыць сэрцам».

Менавіта так трэба разумець радкі паэта:

А спяваецца затое —
Ці хачу, ці не хачу —
Толькі тая, толькі тое,
Што з вачэй прыйшло ў душу.

Гаворачы пра паэзію М. Лужаніна, даводзіцца звяртацца да такіх капітальных і ўзаемазвязаных эстэтычных катэгорый, як гістарызм і народнасць.

Гістарызм паэта ідзе ад багацця перажытага ім і краінай, ад умення бачыць сённяшні дзень у святле гістарычнай рэтраспекцыі і перспектывы, імкнення ўзняцца да значных сацыяльных абагульненняў. У «Лявоніхе» выразна праявілася настроенасць паэта на дыялог з часам, гісторыяй, сябрамі маладосці.

Ідэйны цэнтр кнігі — паэма «Бяссонны тэлефон». Ленінская тэма не ўпершыню прыцягвае ўвагу М. Лужаніна. Вытокі яе звязаны з 20-мі гадамі, з такімі работамі паэта, як, скажам, «Хадок» і пазнейшымі, у якіх ленінская тэма паядналася з тэмай Радзімы, савецкай дзяржаўнасці, росквіту роднай зямлі, што ўвасобіла ў сабе «жывыя рысы Ільіча». «Пра Леніна, — прызнаецца паэт, — думаецца часта і многа. З таго самага студзеньскага вечара, калі з вятрамі і маразамі цяжкай зімы дваццаць чацвёртага на плечы краіны нізрынулася гара...

Як кропля вады, тоячы рокат марскіх глыбінь, адбівае ў сабе і ззянне сонца і красаванне дня, так і жыццё аднаго чалавека можа раскрыць кіпенне часу, спадзяванні і здзяйсненні ўсяго народа».

Гэта — думкі паэта пра Леніна.

У адным з ленінскіх зборнікаў ён прачытаў пра існаванне пры жыцці Уладзіміра Ільіча спецыяльнага тэлефона (у паэме паведамляецца нават нумар 3-61-82), па якім можна пазваніць яму ў любы час. Выдатнае праяўленне ленінскага дэмакратызму, сувязі правадыра рэвалюцыі з народнымі масамі! Лужанін вельмі асабіста асэнсоўвае гэты канкрэтны гістарычны факт. Перад яго вачамі праходзяць этапы нашай сацыялістычнай гісторыі, знітаваныя з асабістым лёсам паэта. У паэме ўзнімаецца тэма адказнасці савецкага чалавека за лёс Радзімы, за агульны рух наперад, тэма ягонай адданасці велічным камуністычным ідэалам.

Не выбіраючы гадзін,
Не адкладаючы ані,
Нам права дадзена:
Будзі!
Нам права дадзена:
Звані!
Дабро ад зла адгарадзі...

Гістарызм у Лужаніна спалучаны з глыбокай народнасцю: яго мысленне, на маю думку, уражвае перш за ўсё сваім народным характарам. Народнасць — агульная адметнасць беларускай паэзіі (і літаратуры наогул) — у творчасці Лужаніна праяўляецца па-свойму. Дзеля народнасці ён ніколі не ахвяруе індывідуальнай культурай верша, асабовасцю псіхалагічнага малюнка. І ў той жа час яго паэзія жыве народнымі прыкметамі, народным поглядам на рэчы, ладам і логікай мыслення. Гэтым, думаецца, якраз і цікавы верш «Малады снег», прасякнуты пяшчотай хлебароба, які ведае яму цану — гэтаму першаму снегу:

Паляжы, мой пульхны, за прысадамі,
Пацурчы ручайкамі ля меж.
Ты збярэшся ў воблакі, каб выліцца,—
Страпянуцца грывамі дажджы.
Першы снег...
На лёгкай кроплі вільгаці
Восень хлеб замешвае ў дзяжы.

Фальклорнае ў Лужаніна падпарадкавана індывідуальнаму, мастакоўскаму. Ягоная думка абмінае каноны, яна — дынамічная і асацыятыўная.

Сярод яго ўлюбёных герояў — народныя тыпы: Лявоніха («з касою аж па пяты, з азерцамі вачэй»), Гудзец («зазнаў ён шмат напасці, трох перажыў цароў»), Кастусь Каліноўскі («светлы чалавек») і іншыя, якія падаюцца часцей за ўсё ў абагульнена-ідэалізаваным выяўленні, з прымеркай пад народнае:

І фландрскаму герою,
Што ўсім краям сваяк,
Даводзіцца сястрою
Лявоніха мая.

Але героі Лужаніна пазбаўлены фальклорна - паэтычнай статычнасці, яны знаходзяцца ў жывых гістарычных сувязях са сваім часам. Героі гэтыя — вельмі зямныя. Тое ж самае можна сказаць пра ўсю паэзію Лужаніна. Якраз у гэтым яе істотная асаблівасць. Не прыземленая, а зямная!

З гэтым звязана асаблівасць творчай лабараторыі паэта.

Мяне, прызнацца, спачатку нават здзіўляла тая глыбокая, я б сказаў, страсная цікавасць паэта да эканомікі, статыстычных зборнікаў, лічбаў, дакументаў. Думалася, — ну, калі цікавіцца праэаік, яго яшчэ можна зразумець. А паэт? Паэт жа жыве эмоцыямі, перажываннямі, пафасам. Лічбы для верша не патрэбныя! Не, аказваецца, патрэбныя: з іх якраз і нараджаецца пафас.

Мастацкая пераканаўчасць паэзіі Лужаніна абумоўлена сувяззю яго твораў не проста з жыццём, а з фактамі жыцця, гісторыі, нашай рэчаіснасці. Але факт у яго часцей за ўсё пераасэнсаваны, узведзены ў ступень, вылучаны, абагульнены. (Як, скажам, у паэме «Бяссонны тэлефон»). Паэт умее падаць яго шматмерна, узмацніць шматпланавасць, сцісла расказаць пра многае.

Такі, напрыклад верш «Успамін».

Вайна, часовы адпачынак у нейкай школе, на стале—кніга Талстога «Вайна і мір», непадалёк стаіць зенітны батальён — дзяўчаты. Кароткае знаёмства, развітанне... Просценькі, бытавы сюжэт, усяго толькі, здавалася б, замалёўка. Але паэт адкрывае тут цэлую сістэму асацыяцый, падсветак, намёкаў, насычае карціну псіхалагічна.

Прайшоў паўз вокны манеўровы,
Гукнуў і ахінуўся ў дым.
Бывай, Наташа не-Растова!
Куды мы едзем? Памаўчым.

Вунь той, дужэйшы цягнічыска
Пасля падзеліцца з табой,
Што вёз нас, колькі можна, блізка
Туды, дзе пагрукотваў бой.

І такіх вершаў, якія хочацца перачытваць, у кнізе шмат. Адчуваецца, што майстар знаходзіцца ў добрай форме.

Сёння песня паэта дасягнула, можна сказаць, восеньскай пары спеласці. Нядаўна, у ліпеньскай кніжцы, «Полымя» надрукавала новы цыкл яго вершаў з восеньскай назвай «Галасы пад выраем». Між іншым, гэтая метафара сустракаецца ўжо і ў «Лявоніхе» — раздзел «Два галасы пад выраем». Яна, здаецца мне, азначае ў паэта маўклівую (але эмацыянальна вельмі насычаную) размову з тымі, каго часцей за ўсё ўжо няма побач, хто «ў выраі». Гэты вобраз якраз перадае агульны пафас унутранай працы паэта, скіраванай на заглыбленне ў жыццёвы вопыт, на асэнсаванне ісцін, праверанных жыццём, часам, гісторыяй.

Таму і хочацца сказаць, што вылучэнне кнігі Максіма Лужаніна «Лявоніха» на атрыманне Дзяржаўнай прэміі БССР— з'ява ўнутрана заканамерная. Асабліва для юбілейнага года, калі Савецкай Беларусі і Кампартыі рэспублікі спаўняецца 60 год. Гэта кніга ўсім сваім зместам сцвярджае маральна-гуманістычную і палітычную сталасць нашага грамадства развітога сацыялізму ў цэлым і духоўнае багацце савецкага чалавека ў асаблівасці. Паэт вядзе дыялог з людзьмі, з самім сабою («Я свой радок на сэрцах вáжу таго, хто сталь будзіў разцом») праўдзіва сведчыць пра час, умацоўвае веру ў жыццё, у чалавека.

Уладзімір ГНІЛАМЕДАЎ.

М. Лужанін. Лявоніха. Вершы і паэмы. Мінск. «Мастацкая літаратура». 1977.

ДУМКА ЧЫТАЧА

ЧЫТАЙ, БЕЛАРУСЬ!

Двухтомная анталогія літоўскай савецкай паэзіі, якая нядаўна выйшла ў выдавецтве «Мастацкая літаратура», — значная падзея ў літаратурным жыцці нашых братніх рэспублік. У ёй прадстаўлены 86 паэтаў, гэта значыць, вы, нашы беларускія сябры, можаце пазнаёміцца і з паэтамі-класікамі, і з творчасцю прадстаўнікоў маладзейшых пакаленняў, хто пачаў пісаць у пасляваенны час, а таксама з творчасцю маладых. Гэтае выданне тым больш неабходнае і карыснае, што папярэднія кнігі «Паэты Савецкай Літвы» і «Галасы сяброў» даўно ўжо сталі бібліяграфічнай рэдкасцю.

Мне хочацца выказаць некалькі заўваг пра пераклады асобных паэтаў, у першую чаргу пра класікаў літоўскай савецкай паэзіі.

Радуюць пераклады твораў Вітаўтаса Монтвілы, асабліва вершы «Песня свабоды», «Вянок Літве», «На вясну калі займае...» (пер. А. Лойкі) — у іх сапраўды пазнаеш Монтвілу, яго стрыманае, важкае слова.

Тое самае можна сказаць і пра асобныя вершы Саламеі Нерыс, асабліва пра адзін з іх — «Я вярнуся», які друкаваўся і ў зборніку «Калі зямля прачынаецца» (1971). Гэты верш-песня — дарагі кожнаму літоўцу, мы яго ведалі на памяць яшчэ ў пачатковай школе, яго ведае і спявае кожны — і малы, і стары. Пераклад зроблены, можна сказаць, удала. Аднак радкі «зрыкашэціць нуля злая, смерць абыдзе стараной» гучаць штучна, гэта не ўласціва С. Нерыс, тут не адчуваецца яе душы.

Добрым словам хочацца ўспомніць пераклады К. Камейшы верша «Чаму маўчыць зямля», Е. Лось — «Калі ўспыхне бэз...», І. Калесніка — «Літве» і «Яблыні цвітуць». Чытаеш іх і знаходзіш усё, што ёсць у арыгінале, адчуваеш саму душу паэтэсы. Праўда, як мне здаецца, у анталогіі не хапае некаторых твораў, якія асабліва яскрава характарызуюць яе як літаратара — «Спявай, сэрца, жыццё...», напрыклад, не ўвайшоў таксама і ў папярэдні зборнік «Калі зямля прачынаецца»...

Арыгінальным гучаннем, высокім мастацкім узроўнем вылучаюцца пераклады вершаў «Веюць ветры ад Урала» Л. Гіры (М. Лужанін), «Маці» У. Мазурунаса (С. Грахоўскі), «Зямлю я вітаю» В. Мікалайціса-Путінаса (П. Прыходзька), «Кажаны» і «Заява» Т. Цільвіціса (Я. Семяжон), «Камсамольскі білет» А. Юнінаса (У. Шахавец), «Маці Пірчуніса» і «Літве» Я. Дзегуцітэ (В. Іпатава), «Маці ідуць па зямлі» А. Малдоніса (У. Паўлаў), «Балада пра баразну» А. Балтакіса (Р. Барадулін), «Ленін працуе» і «Нашы бабулі» Ю. Марцінкявічуса (Я. Семяжон і Я. Сіпакоў) і іншыя.

Шкада, што ў анталогію не ўвайшлі некаторыя вартыя ўвагі вершы А. Венцлавы і Э. Межэлайціса.

Крыху пра пераклады Шырвіса. Гэты паэт карыстаецца вялікай любоўю сярод літоўскіх чытачоў, яго зборнікі не залежваюцца ў кнігарнях. Хацелася б у анталогіі ўбачыць і «Нёман», «Салдат, мой браце»... Змешчаныя ж пераклады добрыя, асабліва сярод іх вылучаюцца зробленыя А. Вольскім і Р. Семашкевічам.

З перакладаў твораў пасляваеннага пакалення лепшае ўражанне робяць вершы «Я — сасна» Д. Саўкайцітэ (А. Разанаў) і «Маці» В. Пальчынскайтэ (В. Вярба).

Ад імя ўсіх літоўскіх чытачоў хочацца падзякаваць беларускім паэтам-перакладчыкам за тое, што наш голас чуе блакітнавокая Беларусь, што мастацкае слова паэтаў ад бурштынавых берагоў Балтыкі гучыць на зямлі Купалы і Коласа.

Юозас РЫБІКАЎСКАС.
Каўнас.

НА АТРЫМАННЕ ДЗЯРЖАЎНАЙ ПРЭМІІ БССР

НЕВЫЧЭРПНАСЦЬ ДУХУ І ЧАЛАВЕЧНАСЦІ

Ёсць у твораў Васіля Быкава адметная асаблівасць — яны не проста перачытваюцца намі, а застаюцца ў памяці назаўсёды, застаюцца як самы дарагі і самы каштоўны скарб — скарб духоўны. Яны ў пэўным сэнсе вечныя, як і вечныя праблемы чалавечага духу, якія даследуюцца ў гэтых творах.

Пры ўважлівым іх прачытанні адразу становіцца бачнай вызначальная аснова творчасці мастака — высокі духоўны і маральны патэнцыял савецкага чалавека, невычэрпнасць яго духу і чалавечнасці. Сапраўды, «у Быкава, як зазначыў С. Андраюк, «матэрыял» для агульназначных вывадаў, філасофскіх абагульненняў дае сам чалавек, пастаўлены ў такія ўмовы, калі ён выяўляе сваю існасць да канца і тым самым выяўляе духоўную субстанцыю чалавека наогул».

Творы пісьменніка прысвечаны ваеннай тэме, але ў цэнтры іх не батальныя сцэны, не ваенныя аперацыі, не ход баёў, а менавіта чалавек. Чалавек, якога празаік убачыў на вайне ў самых суровых і драматычных абставінах, у самых крызісных сітуацыях, на грані жыцця і смерці, у хвіліны бескампраміснага маральнага выбару, гераічнага парыву, вышэйшага напружання думкі, гранічнага абвастрэння маральных пачуццяў і крайняй мабілізацыі волі...

«Ішла вайна, гінулі сотні тысяч людзей, асобнае чалавечае жыццё, здавалася, страціла звычайны свой кошт, вызначалася толькі мерай шкоды, якую яно наносіла ворагу. І тым не менш, будучы сам салдатам і сам кожную хвіліну рызыкуючы галавой, Валошын не мог не адчуваць, што ўсё ж САМАЕ КАШТОЎНАЕ НА ВАЙНЕ — ЖЫЦЦЕ ЧАЛАВЕКА. І чым больш у чалавеку сапраўды чалавечага, тым важней для яго сваё ўласнае жыццё і жыцці блізкіх яму людзей. І ў той жа час якім бы ні было дарагім жыццё, ёсць рэчы, даражэйшыя за яго, нават не рэчы, а паняцці, пераступіўшы цераз якія, жыццё траціла сэнс, рабілася прадметам ганьбы, а можа, і цяжарам для сябе самога...».

У гэтых радках з аповесці «Яго батальён»» — ключ да разумення галоўнай ідэі ўсёй творчасці пісьменніка. Поспех і прызнанне быкаўскіх твораў абумоўліваюцца якраз тым, што ён як сапраўдны філосаф і мастак змог ацаніць вартасць чалавечага жыцця на вайне, з выключнай сілай выявіў духоўны і маральны патэнцыял чалавека, без скідак і недагаворак намаляваў яго характар, раскрыў яго думкі і пачуцці, паняцці і ўяўленні, ідэалы і мары — усё тое, чым ён жыў, чаму радаваўся, што любіў альбо ненавідзеў.

Любімыя героі В. Быкава — гэта заўсёды крыштальна чыстыя, сумленныя людзі, людзі подзвігу, высокага грамадзянскага абавязку, якія ў сваім маральным развіцці праходзяць шлях ад асабістай сумленнасці да сумленнасці грамадзянскай: перад тварам суровых выпрабаванняў, перад тварам смерці застаюцца высакароднымі і мужнымі, захоўваюць цвёрдую волю, яснае разуменне сваёй праваты, нягледзячы ні на што, «становяцца вышэй за свой лёс і, значыцца, вышэй за магутную сілу выпадку», якая не ўладарна над іх чалавечнасцю.

Але і на вайне яны застаюцца ў душы людзьмі мірнымі. Яны кахаюць, пакутуюць, сумуюць па родных і блізкіх, балюча перажываюць горыч страт франтавых сяброў. Таму і сіла духоўнага выпраменьвання гэтых герояў непадзельна ад іх прыналежнасці да лёсу іншых людзей.

Ці не па той прычыне нават у хвіліны рэдкага зацішша думае камбат Валошын («Яго батальён») пра сваіх байцоў, імкнучыся кожнага зразумець, па магчымасці апраўдаць нейкія іх пралікі, бо людзі ў жыцці розныя, рознымі прыходзяць на фронт. А тут «раптам да ўсіх аднолькавыя патрабаванні і, вядома, не ўсе ім адпавядаюць. Патрэбен час, каб прыцерціся, а часу няма...»

А паведамленне аб узнагародзе яго ордэнам успрымае хоць і з радасцю, але і з пэўным недаўменнем: «ордэн — гэта няблага, але чаму толькі яму?»

У аповесці «Яго батальён», адным з лепшых апошніх твораў В. Быкава, раскрываецца прывабнейшы вобраз камандзіра з выключна сканцэнтраваным пачуццём маральнай чысціні і бескампраміснасці, душэўнага высакародства. У нечым ён падобны і да Карпенкі («Жураўліны крык»), і да Шчарбака («Здрада»), і да Ананьева («Атака з ходу»). І ўсё-такі ў значнай ступені гэта новы вобраз, які дазваляе нам гаварыць аб эвалюцыі мастака. Як ні ў кім з іншых камандзіраў, у Валошыне змог В. Быкаў выявіць незвычайную сілу ўнутранай чалавечай прыгажосці, талент чалавечнасці. А як гэта было важна ў той, «пазвярынаму труднай» вайне!..

...Несправядліва абышоўся з камбатам франтавы лёс: ён быў адхілены ад камандавання. (Валошын адступіў з батальёнам, не ўзяўшы вышыню. «Але ён іначай не мог. Ён не мог узнімаць батальён пад такім агнём з вышыні—гэта было б свядомым яго знішчэннем. Роты, зрэзаныя кулямётным шквалам, назаўжды б засталіся на яе мёрзлых схілах...»).

Валошын «не мог так проста і раптоўна вырваць са сваёй душы гэтую сотню людзей, з якім яго зраднілі сумесна перажытыя пакуты і пралітая кроў, з кім ён гінуў, уваскрасаў і, як умеў, рабіў сваю салдацкую справу». У гэтыя невымерна цяжкія для яго, камандзіра, хвіліны адкрылася ў ім нейкая незвычайная, невядомая дасюль сіла, якая да болю ў свядомасці абвастрыла паняцце абавязку перад батальёнам, які ён выхаваў і навучыў, які даўно ўжо стаў яму домам, ягонай крэпасцю і аховай. І ён ідзе ў бой, разам са сваімі таварышамі да канца дзеліць усю неабдымнасць іх салдацкага ліха, ваюе, як салдат, застаючыся па вышэйшаму, чалавечаму абавязку, камандзірам.

«Людзьмі мужнымі, ад якіх ідзе непераходзячая чалавечая прыгажосць — унутранае свячэнне моцнага чалавечага характару» назваў быкаўскіх герояў Ю. Бондараў. І адзін з такіх людзей — баец-партызан Ляўчук з аповесці «Воўчая зграя», які, рызыкуючы сваім жыццём, цаной неверагодных намаганняў, ашукаўшы самую смерць, выратаваў з пекла вайны маленькае дзіця. Кінуць яго было прасцей простага, але Ляўчук не зрабіў гэтага. «Ён дужа хацеў зберагчы малога, бо той «нейкім чынам звязваў яго з усімі, каго не стала... ён даваў Леўчуку нейкае абгрунтаванне ягоных пакут, як і апраўданне ягоных памылак... Калі б ён яго не ўратаваў, то навошта тады гэтая яго ашалелая барацьба за жыццё...».

Як і ўсіх сваіх герояў, В. Быкаў ставіць Леўчука ў абставіны выключна жорсткія і непрадбачаныя, дзе ідзе пастаянны бой жыцця са смерцю, чалавечнасці з жорсткасцю, самаахвярнасці з карысцю. І як сапраўдны чалавек Ляўчук адольвае гэтыя абставіны, процістаўляючы свой чалавечы пачатак звярынай сутнасці фашызму...

Зноў і зноў перачытваючы творы Васіля Быкава, мы бачым, як усё выразней гучыць у іх душэўная дамінанта ў славу яго вялікасці Чалавека, як напружана б'ецца выпакутаваная, вынашаная і глыбока ўсвядомленая думка, што «ўсё адолее чалавек. Адолее і будзе жыць!»

Любоў КАРНІЛОВІЧ.

В. Быкаў. Воўчая зграя. Аповесць. Мінск. «Мастацкая літаратура», 1975.

В. Быкаў. Яго батальён. Аповесць. «Маладосць». 1975, №№ 11—12.

АД ВЫТОКАЎ — ДА ДЗЁН СЁННЯШНІХ

Па сутнасці, Віктар Каваленка ўпершыню ў сучасным літаратуразнаўстве зрабіў спробу даць шырокае тэарэтычнае асэнсаванне вытокаў развіцця новай беларускай літаратуры, разгледзець шматлікія факты ўплыву іншых літаратур на яе станаўленне і, урэшце, вызначыць асноўныя моманты паскоранасці росту беларускай культуры ўвогуле і яе літаратуры ў прыватнасці. Аўтар манаграфіі даследуе перыяд развіцця літаратуры XIX — пачатку XX стст., той самы перыяд, на які прыходзіцца не толькі нараджэнне новай літаратуры беларускага народа, але і яе сапраўдны, паскораны ўздым «па асноўных эстэтычных крытэрыях».

Чым жа абумоўлена ўзнікненне новай беларускай літаратуры і яе паскоранае развіццё? Спрыяльных, рухаючых фактараў, як правільна паказвае даследчык, было нямала.

З аднаго боку, далучэнне тэрыторыі Беларусі да Расіі і ўзмацненне буржуазна-таварнага пачатку ў грамадскай вытворчасці выклікае змены ў грамадскіх узаемаадносінах і абуджае нацыянальную свядомасць. Апошняе стварае ўмовы як для культурнага развіцця самога беларускага народа, так і для яго «сардэчнай прывязанасці да роднага кутка». Само ж «свядомае нацыянальнае пачуццё ўсё глыбей звязвалася з народным светаадчуваннем, чэрпала ў ім сілы для таго, каб стаць шырокай светапоглядная канцэпцыяй». Таму натуральна, што парасткі народнасці і нацыянальнай самабытнасці знаходзяць у літаратуры гэтага перыяду, у адрозненне ад літаратуры мінулага, спрыяльную глебу для свайго росту.

З другога боку, агульны працэс нацыянальнага адраджэння народаў царскіх украін стварыў умовы і для больш шырокага пранікнення на тэрыторыю Беларусі тэндэнцый і традыцый развітых культур, асабліва рускай і польскай. Адсюль — інтэнсіўнасць, паскоранасць, насуперак усякім формам прыгнёту, уласна беларускай культуры, у тым ліку і літаратуры. Пры гэтым В. Каваленка падкрэслівае думку аб тым, што маладая беларуская літаратура, якая мела параўнальна слабыя нацыянальныя традыцыі ў асэнсаванні з'яў жыцця, не магла абысціся без «ідэйна-мастацкіх сувязей з суседнімі літаратурамі». Разам з тым, запазычанні традыцый і тэндэнцый, форм, метадаў і сродкаў у іншых народаў новая літаратура ўжо была здольнай «перапрацаваць» у здабытак уласна нацыянальнага эстэтычнага развіцця».

Аўтар не падзяляе мяжой пытанні ўплыву на беларускую літаратуру і працэсы яе паскоранага развіцця, а разглядае іх у адзіным, сінтэтычным рэчышчы. Творчасць кожнага з пісьменнікаў, пры ўсёй храналагічнасці ў пабудове работы, даследуецца якраз у гэтым полі зроку. Апошняе і дае яму магчымасць не толькі доказна аспрэчваць тыя ці іншыя палажэнні папярэдніх літаратуразнаўцаў, але і выказаць свае, новыя назіранні аб сутнасці самога працэсу паскоранасці і «межах» уплыву, аб ролі традыцый уласных і традыцый іншых народаў, аб месцы фальклору і яго эстэтычным пераасэнсаванні.

Гаворачы пра беларускую літаратуру мінулага стагоддзя, аналізуючы фарміраванне яе нацыянальных асноў, В. Каваленка разглядае ў гэтым аспекце творчасць самых розных літаратараў, што так ці інакш надавалі нашай літаратуры «энергію паскоранасці»: А. Міцкевіча, Я. Баршчэўскага і П. Багрыма, Я. Чачота і У. Сыракомлі, А. Вярыгі і аўтараў ананімных паэм «Тарас на Парнасе» і «Энеіда навыварат», творчасць В. Дуніна-Марцінкевіча і аўтара «Дудкі беларускай» Ф. Багушэвіча, руска-беларускіх пісьменнікаў П. Шпілеўскага, Д. Лапы, Я. Брайцева, А. Пшчолкі. Як вынік, даследчык заўважае не проста існаванне, а зблізжэнне двух важных працэсаў: выпрацоўка нацыянальных форм і метадаў мастацкага выяўлення жыцця, з аднаго боку, і запазычанні з братніх славянскіх літаратур, з другога.

Асобна, глыбока і шматпланава аналізуе В. Каваленка асноўныя працэсы паскоранага развіцця ў беларускай літаратуры пачатку нашага стагоддзя. Менавіта подых рэвалюцыі 1905 года, адзначае даследчык, прыносіць у літаратуру новую хвалю ўздыму. «Скачок наперад», імкненне «дагнаць» жыццё, дайсці да пэўных мастацкіх вышынь нават ліквідуе на нейкі час многія сённяшнія літаратурныя сувязі з яе папярэднімі здабыткамі. «Разам з колькасным узбагачэннем літаратура відавочна і імгненна абнаўляецца якасна», падкрэслівае літаратуразнавец. У гэтым, зноў жа, прыкмета паскоранасці.

Ці не таму, піша В. Каваленка, «статычнае апісальніцтва» ўступае месца новым творчым прынцыпам, дзе галоўным становіцца не сама дасканаласць мастацкіх сродкаў, а імкненне «дайсці да свайго чытача, разварушыць, падняць яго». Таму не агульначалавечае, а «нацыянальнае ў агульначалавечай сутнасці» знаходзім усё больш і больш у творах Цёткі, Багдановіча, Купалы і Коласа гэтага перыяду. Разам з тым, як справядліва заўважае даследчык, з'яўленне ў літаратуры магутных фігур, якімі былі Купала і Колас, не адкінула ўбок незавершаныя ў мінулым працэсы. Наадварот, беларуская літаратура першых двух дзесяцігоддзяў іх «паўтарала, развівала далей, паглыбляла, заканчвала...»

Выяўляючы ступені сталення беларускай літаратуры, Каваленка-даследчык зноў і зноў засяроджвае ўвагу чытача на плённасці ўплыву рускіх, украінскіх, польскіх і іншых пісьменнікаў. На пачатку XX стагоддзя ўсё больш і больш маюць месца «не столькі канкрэтныя запазычанні, колькі свядомая арыентацыя на пэўныя ўзоры развітых літаратур». І ўжо бясспрэчна тое, што не паўтарае, а вучыцца на пушкінскіх, някрасаўскіх, шаўчэнкаўскіх і іншых традыцыях беларуская літаратура. Вучыцца наватарскаму падыходу да праблем рэчаіснасці, вучыцца асэнсоўваць іх у нацыянальна спецыфічным мастацкім стылі. Асобная роля належыць тут заснавальніку метаду сацыялістычнага рэалізму М. Горкаму, дзякуючы якому паказ асобы чалавека ва ўсім яго духоўным змесце дазволіў параўнальна маладой літаратуры ўзняцца на новую ступень, каб ісці «ўпоравень з часам», у агульнай садружнасці ўсіх братніх літаратур. Сведчанне гэтаму сёння — не толькі купалаўская і коласаўская творчасць, але і лепшыя творы многіх цяперашніх прадстаўнікоў беларускай літаратуры.

Тым не менш беларуская літаратура, увайшоўшы ў «сілавое поле» літаратуры сусветнай і пазбавіўшыся «адкрытых» працэсаў паскоранасці, не страчвае і не можа страчваць «паралельных» сувязей у раўнапраўнай садружнасці літаратур.

Кніга В. Каваленкі «Вытокі. Уплывы. Паскоранасць» вызначаецца не толькі глыбінёй тэарэтычнага асэнсавання складаных праблем развіцця новай беларускай літаратуры. Яна — сталае, сур'ёзнае падсумаванне шматлікіх распрацовак гэтай праблемы ў нашым сучасным літаратуразнаўстве ўвогуле. У гэтым яе каштоўнасць як тэарэтычнага даследавання.

Інга КЛЮЧАНОВІЧ.

В. Каваленка. Вытокі. Уплывы. Паскоранасць. Развіццё беларускай літаратуры XIX—XX стагоддзяў. Мінск. «Навука і тэхніка», 1975.

РАМКІ СТРОГІЯ АКТАВЫ...

Калі-небудзь даследчыкі будуць спецыяльна аналізаваць характар рыфмоўкі, памер, асаблівасці рытму вершаў гэтага зборніка, напісанага некалькі нязвыклымі для беларускага вершаскладання актавамі. А чытач, якога цікавіць у першую чаргу змест, пачуццё, данесенае ў вершах, не заўважыць, бадай, ніякай ненатуральнасці, ніякіх слядоў намагання ўціснуць думку ў строгія рамкі формы. Яго захопіць у першую чаргу багацце думак, глыбіня роздуму над праблемамі сучаснасці, уменне аўтара бачыць хараство ў жыцці.

Сто дваццаць вершаў-актаў, падзеленых на чатыры раздзелы, утвараюць у кнізе ўнутраную цэласнасць, якая толькі падкрэсліла цесную сувязь кожнага паасобнага васьмірадкоўя з агульнай накіраванасцю зборніка, што прысвечаны надзённым грамадскім, маральна-этычным праблемам.

Актавы загаварылі жывой гутарковай, сапраўды народнай мовай, загаварылі аб тым, што хвалюе сёння кожнага савецкага чалавека. У васьмірадкоўях Гілевіча захавалася адна з асаблівасцей класічнай актавы — яе своеасаблівая інтымнасць, спавядальнасць, калі верш здаецца адрасаваным табе асабіста. Аднак ад гэтага вершы не сталі камернымі, калі закранаюцца нейкія прыватныя праявы жыцця. Аўтар жыве людскімі клопатамі, сягае і да тых, якія хвалююць усё чалавецтва.

Ці дзень, а ці вечар — жыццё нам
нагадвае.
Не трацячы мужнасці тону свайго:
У свеце, глабальна расколатым надвае.
Ад слова да бомбы—паўкрока ўсяго.
І як ні спакусна зацішшам
настроіцца —
Пра гэта, мой дружа, ты мусіш забыць.
Ад полымя слова да полымя стронцыя
Адлегласць бясконцай нам трэба
зрабіць!

Класічная форма актавы напоўнілася новым, сучасным зместам. Высакародная заклапочанасць паэта захаваннем міру на зямлі, шчаслівым будучым чалавецтва — у адным з галоўных рэчышчаў нашай паэзіі. Прычым, гэтая тэма ў яго часта знітавана, пераклікаецца з тэмай Радзімы, Бацькаўшчыны, роднай беларускай зямлі. Многія звыклыя матывы, сюжэтныя хады, звязаныя з гэтай тэмай, гучаць па-новаму, свежа. Вось распаўсюджаны матыў прыезду ў родныя мясціны, «дзе вучыўся араць і сеяць, адкуль панёс і песню ў свет сваю». Сустрэча з імі выклікае шчымлівыя пачуцці, наводзіць на глыбокі роздум: «Скажы, ты шчаслівейшы стаў за тых, што тут араць і сеяць засталіся?» — пытае сам сябе лірычны герой. За радкамі адчуваецца неспакойная, уражлівая душа паэта, чалавека духоўна багатага, чуйнага да праяў чалавечага быцця, з пранікліывым позіркам і аптымістычным светаўспрыманнем.

Кніжка паказвае нам аўтара ў разнастайным коле яго інтарэсаў, у такіх сферах яго дзейнасці, як педагагічная, паэтычная, перакладчыцкая. Як чалавек, звязаны з выхаваннем студэнцкай моладзі, Н. Гілевіч і ў вершах удзяляе нямала ўвагі маральна-этычным праблемам, дзе ўсур'ёз, а дзе з усмешкай апавядае аб праявах душэўнай чэрствасці, глухаты да прыгажосці, абыякавасці. Яго непакоіць небяспека адрыву ад роднай глебы, ад тых карэнняў, якія жывяць у чалавеку лепшыя, высакародныя пачуцці, робяць яго сапраўды паўнацэннай асобай. Вось паэт заўважае, што чутыя ад маці мелодыі «душой дзяцей тваіх не завалодалі — скрыгочуць рытмы дзікія ўвушшу. Заносяць сэрцы як пяскі балотныя», і паказвае ахвяру гэтакіх адносін да ўсяго роднага — чалавека, які, апынуўшыся на ўлонні прыроды, —

...З вялізнымі вушамі быў, а птушку
Пачуць не змог: славіў у скрынцы джаз
І громкасць уключыў на ўсю катушку.

У вершах зборніка неаднаразова акцэнтуецца любоў да роднага слова, увага да народнай творчасці. Н. Гілевіч вядомы як нястомны збіральнік фальклору, што, несумненна, узбагачае яго і як паэта. Мабыць, таму і нарадзіліся вось гэтыя радкі, поўныя ўдзячнасці тым, хто падзяліўся з паэтам скарбамі народнай мовы:

Жанчыны вёсак беларускіх, вам
Я кланяюся ўклонам самым нізкім —
За кожную іскрынку хараства,
Што ззяе ў слове, ад калыскі блізкім.

Пачуеш вас, не зманеных маной, —
І весялей глядзіш у твар эпохі.
Дык пасядзіце ж, любыя, са мной,
Пагаманіце, пагукайце трохі...

На дзіва да месца аказалася тут гэта мясцовае «пагукайце» (у значэнні — пагаварыце), слова, пачутае аўтарам у вандроўках па роднаму краю. Жывым народным словам аздоблена і творчасць Н. Гілевіча. І яшчэ адна яе асаблівасць, якая выявілася і ў зборніку «Актавы» — каларытны народны гумар. Ён часам дапамагае аўтару нечаканым паваротам завяршыць васьмірадкоўе, перавесці размову аб сур'ёзным на жарт, не змяншаючы пры гэтым важнасці праблемы.

Форма актавы, абраная Н. Гілевічам, аказалася выйгрышнай яшчэ і тым, што яна дае магчымасць павялічыць умяшчальнасць думкі, зрабіць выказванне больш ёмістым, сціслым, афарыстычным. Шэраг вершаў завяршаецца адным — двума радкамі, у якіх выказваецца асноўная думка, гэтыя радкі маглі б існаваць самастойна, як афарызм. Напрыклад:

Табе зрабіўся блізкім цэлы свет!
А ці бліжэйшым стаў табе сусед?

У асобны раздзел кнігі вылучаны вершы, напісаныя ў форме запрашэнняў балгарскім сябрам. Гэтыя васьмірадкоўі ўяўляюць сабой невялікія, кожны раз звязаныя з асобай таго, каму прысвечаны верш, яго схільнасцямі або пэўным выпадкам, часам сур'ёзныя, часам гумарыстычна-гіпербалізаваныя, афарбаваныя пачуццём сардэчнасці, дружбы.

Зборнік «Актавы» не пакідае абыякавым, глыбока ўзрушвае і прымушае аб многім задумацца. Аўтар знайшоў удалую форму для шчырай зацікаўленай размовы з чытачом. Зборнік выйшаў у 1976 годзе, паспеў здабыць прыхільнасць чытачоў, атрымаў станоўчую ацэнку ў друку і, можна сцвярджаць, прадаўжае сваю высакародную службу, абуджаючы пачуцці любві да Айчыны, чуласці да людзей, сцвярджаючы ідэалы дабра і справядлівасці. Не выпадкова кніга вылучана на атрыманне Дзяржаўнай прэміі БССР.

Міхась КЕНЬКА.

Н. Гілевіч. Актавы. Мінск. «Мастацкая літаратура», 1976.

УЗВЫШЭННЕ

ЗНАЧЭННЕ гэтых дзвюх кніг цалкам цяжка нават усвядоміць. Красамоўным, шматзначным з'яўляецца тое, што яны выйшлі да слаўнай даты — 60-годдзя БССР і Кампартыі Беларусі. Яны — вынік росту беларускага савецкага літаратуразнаўства, падагульненне шляху, вышыня, этапныя кнігі, працы, якія, несумненна, становяцца ў рад з вішнёвымі, як іх назваў паэт, дванаццаццю тамамі Беларускай Савецкай Энцыклапедыі.

Лягчэй ацэньваць рэчы ў параўнанні, а яшчэ зручней — бачачы іх у перспектыве развіцця, бо калі ў перспектыве, то мы не ўхіляемся ад параўнання і разам з тым знаходзімся на вышыні гістарызму, які робіць нас больш відушчымі.

Акадэмік Я. Ф. Карскі—аўтар фундаментальнай працы «Беларусы»—у 1922 г. пісаў у прадмове да трэцяга выпуску трэцяга тома сваёй капітальнай манаграфіі, якім якраз азначаўся пачатак беларускага савецкага літаратуразнаўства: «У рабоце, — зазначаў ён, маючы на ўвазе свае задачы як літаратуразнаўцы, — мелася на ўвазе галоўным чынам зарэгістраваць паэтычны матэрыял з мэтай азнаямлення з ім чытача, крытычная ацэнка гэтага матэрыялу з мастацкага боку; высвятленне ўмоў творчасці таго ці іншага аўтара, якасці яго таленту; адлюстраванне ў творах, што разглядаюцца, акаляючай нас рэчаіснасці і летуценняў аб будучым — толькі часткова ўваходзіла ў задачы аўтара нарысаў. Усё гэта павінны зрабіць наступныя гісторыкі літаратуры і культуры беларускай».

Тое, што «толькі часткова ўваходзіла ў задачы» аднаго з першапраходцаў у галіне гісторыі беларускай літаратуры, сёння, можна сказаць, вырашылася ў поўным аб'ёме. Прычым, улічваліся не толькі задачы, якія ставіў перад сабой калісь акадэмік Я. Ф. Карскі, — час, агульнае развіццё сённяшняга савецкага літаратуразнаўства гэтыя задачы і ўдакладнілі і ўскладнілі. Менавіта з усведамленнем поўнага аб'ёму задач, што сёння час дыктуе, пісаліся абодва тамы гісторыі беларускай літаратуры — дакастрычніцкай і савецкай, і гэта стала адной з першых зарук поспехаў даследчыкаў роднай літаратуры.

Вядома, поспех «Гісторыі» — поспех, падрыхтаваны часам, і ён не прыйшоў бы, каб не наступныя зрухі, што адбываліся ў росце беларускага савецкага літаратуразнаўства пасляваеннага часу. Зрухі гэтыя былі звязаныя як з акадэмічнымі распрацоўкамі, так і са з'яўленнем цэлай бібліятэкі асобных манаграфій, праблемных літаратуразнаўчых прац, архіўных матэрыялаў, бібліяграфічных даведнікаў і г. д. Але зірнём, як ішло ўзвышэнне даследчыцкай думкі ў рамках, жанрава блізкіх да сённяшніх «Гісторый». Першым выхадам беларускіх даследчыкаў да ўсесаюзнага чытача быў «Очерк истории белорусской советской литературы» (1954). Яго, па сутнасці, варыянтам на беларускай мове з'явіліся затым «Нарысы па гісторыі беларускай літаратуры» (1956). 60-я гады далі большае — ужо не нарысы, а двухтомную «Гісторыю беларускай дакастрычніцкай літаратуры» (т. 1, 1968; т. 2, 1969), двухтомную «Гісторыю беларускай савецкай літаратуры» (т. 1, 1965; т. 2, 1966). Усе чатыры кнігі выйшлі на беларускай мове. Цяпер жа з'яўленне двух фундаментальных тамоў — «Гісторыі беларускай дакастрычніцкай літаратуры» і «Гісторыі беларускай савецкай літаратуры» на рускай мове — гэта ўжо і не нарысы, і не варыянт гісторыі 60-х гадоў. Гэта амаль поўнасцю новы погляд і на шматвяковую гісторыю літаратуры беларускага народа і на 60-гадовы шлях развіцця беларускай савецкай літаратуры. Новы, таму што беларуская літаратура, нарэшце, асэнсоўваецца, па-першае, не ў фрагментах, па-другое, не ў адарванасці, а ў арганічным кантэксце літаратур усходнеславянскіх, літаратур польскай і літоўскай, літаратур еўрапейскіх, літаратур народаў СССР.

Трэцім, на мой погляд, важным момантам, што абумовіў навізну гісторыі дакастрычніцкага часу, з'явіўся падыход яе як да з'явы, у якой штучна не адасаблялася, як раней гэта бывала, толькі тое, што было ў форме беларускай старажытнай мовы; новаму адкрыццю гісторыі паслужыла і новая перыядызацыя, уведзеная пры даследаванні старажытнага перыяду. Новая перыядызацыя — гэта заўсёды выяўленне новай канцэптуальнасці. Вельмі прыемна, што новы погляд, новая канцэптуальная думка шырока ўвайшлі і ў раздзелы, якія раскрываюць шляхі развіцця савецкай літаратуры, асабліва ў раздзелы манаграфічныя. Якраз навізну трактовак, поглядаў на тыя ці іншыя з'явы, тыя ці іншыя творчыя індывідуальнасці — усё гэта і ёсць яшчэ адзін з важных момантаў, што ўзвышаюць абедзве «Гісторыі» ў цэлым. Не займелі б яны разам з тым высокага прэстыжу, калі б у іх, асабліва ў томе дакастрычніцкай гісторыі, не было столькі новага шматзначнага матэрыялу, фактаў малазнаных, а то і зусім нязнаных.

У выніку, думаецца, можна з поўным правам сказаць: Вялікая Кастрычніцкая сацыялістычная рэвалюцыя вярнула нам і нашу гісторыю. Бо гэта якраз з вышыні, прадвызначанай Кастрычнікам, і стала магчымым убачыць і асэнсаваць тое, што ўбачана і асэнсавана сёння аўтарамі двух тамоў — «Гісторыі дакастрычніцкай беларускай літаратуры» і «Гісторыі беларускай савецкай літаратуры».

Алег ЛОЙКА.

Гісторыя дакастрычніцкай беларускай літаратуры. Гісторыя беларускай савецкай літаратуры. На рускай мове. Мінск. «Навука і тэхніка», 1977.

КНІГАПІС

У. МЕХАЎ. Зарыва. Аповесці, апавяданні, нарысы. Пераклад з беларускай. Мінск, «Мастацкая літаратура», 1977.

У зборніку сабраны аповесці, апавяданні, нарысы пра людзей, імёны якіх засталіся ў рэвалюцыйнай гісторыі Беларусі. Асаблівую цікавасць уяўляюць тыя, у якіх расказваецца пра Апанскага, Берсана, Пуліхава і іншых змагароў за светлую будучыню. Маючы дакументальную аснову, яны разам з тым сведчаць пра багатую творчую фантазію У. Мехава, пра яго ўменне пісаць займальна, не адыходзячы ад жыццёвай праўды.

І. ФЕДАРАЎ.

М. ПРУДНІКАЎ. Домік у лесе. Запіскі партызанскага камандзіра. На рускай мове. Для дзяцей сярэдняга і старэйшага школьнага ўзросту. М., «Детская литература», 1978.

Пра Вялікую Айчынную вайну напісана нямала цікавых кніг, у якіх праўдзіва і пераканаўча паказана веліч подзвігу савецкага народа ў змаганні з нямецка-фашысцкімі захопнікамі. І ўсё ж сярод іх асаблівую цікавасць маюць творы, напісаныя непасрэднымі ўдзельнікамі тых незабыўных падзей. Некалькі дакументальных аповесцей і ў Героя Савецкага Саюза генерал-маёра Міхаіла Сідаравіча Прудніка.

І вось новы твор праслаўленага партызанскага камандзіра.

У аповесці «Домік у лесе» М. Прудніка нагадвае толькі пра некаторыя эпізоды з жыцця партызан, што заслугоўваюць асаблівай увагі. Народныя мсціўцы зрабілі ўсё магчымае, каб выратаваць дзяцей, якія знаходзіліся ў дзіцячым доме ў Быкоўшчыне.

І. ВІШНЕЎСКІ.

Л. ПРОКША. За Добрыцай рэчкай. Дакументальная аповесць. Пераклад з беларускай. М., «Советский писатель», 1978.

Дакументальная аповесць Леаніда Прокшы «За Добрыцай рэчкай», што ў перакладзе на рускую мову Г. Пацыенні выйшла ў выдавецтве «Советский писатель», прысвячаецца людзям, якія ўзводзілі Мазырскі нафтаперапрацоўчы завод, а цяпер на старажытнай палескай зямлі паспяхова асвойваюць новыя прафесіі. Адметныя рысы гэтага цікавага твора—дакументальнасць асновы і разам з тым значнасць мастацкіх абагульненняў, што дазваляе аўтару ўвасабляць яркія, тыповыя характары нашых сучаснікаў, тых, хто смела глядзіць у камуністычнае заўтра.

В. САЕНКА.

Аляксандр КАПУСЦІН

Белыя коні з казкі

ЦЕПЛАХОД бойка шыбаваў пасярэдзіне Волгі ўніз па цячэнню. Магутнаму рухавіку дапамагала імклівая плынь ракі. За кармою над успененымі хвалямі лёталі чайкі. Весела мітусіліся, як не краналіся адна адной пругкімі крыламі, прарэзліва ўскрыквалі. Сам таго не заўважаючы, Лёня ўсміхаўся чайкам. А калі яны раптам павярнулі за другім цеплаходам, які прайшоў насустрач, услед ім памахаў рукою: да пабачэння, мілыя птушкі, да пабачэння.

Абодва берагі былі далёка. У Лёні мільганула ў галаве: можа, ён і не даплыў бы да іх, каб нырнуў з борта. А можа, і даплыў бы? Ён жа ўпарта трэніруе сябе па плаванню... Мільганула і знікла, толькі пакінуўшы глыбока ў душы нейкае няяснае жаданне. Пакупацца б, ці што?

Думкі вярнуліся да таго, на чым, адабраўшы яго ўвагу, перапынілі іх чайкі. Волжскія берагі... Шмат чаго, пра што Лёня і ў школе вучыў, і ў кніжках чытаў, звязана з імі. Але як усё тут адбывалася?.. Ён стараўся ўявіць, як вялі сваіх ратнікаў на разгром польскіх феадалаў Кузьма Мінін і Дзмітрый Пажарскі, як разгаралася тут сялянская вайна, калі паўстаў Сцяпан Разін, як збіралася сялянская рацъ пад сцягі Емяльяна Пугачова. І бачылася яму, як наляталі адзін на аднаго коннікі на ўзмыленых конях, ён чуў тупат капытоў і ляскат, звон жалеза. Але яму хацелася ўявіць нешта большае, што было за гэтымі знешнімі карцінамі бою, заўважыць штосьці такое, што не пабачыш зрокам. Што?

Жвевы, гаваркі выкладчык гісторыі Андрэй Максімавіч, якога вучні любілі не толькі за цікавыя расказы на ўроках, а і за яго прыгожы смуглявы твар, і за тое, што ён гуляў з імі ў валейбол, не раз гаварыў у класе: ты, вучань, павінен імкнуцца ў кожнай вучэбнай тэме глыбока выяўляць галоўнае. Тады і ўся тэма раскрыецца табе больш поўна і ўсебакова, і часам высвеціцца аддаленая акалічнасць, якая таксама зробіць пэўную адмеціну ў тваёй душы. Ускалыхне ў табе трапяткое адчуванне як бы нейкай тваёй асабістай далучанасці да падзеі, узбадзёрыць цябе жаданнем нейкага пошуку, акрыліць парыванням да нечага ўзвышанага і высакароднага. Праўда, Лёня не мог сказаць, што гэтае павучанне глыбока пранікала яму ў душу, узрушвала яго, тым не менш яно не заставалася па-за яго ўвагай, не тое, каб у адно вуха ўлятала, а з другога вылятала.

Нешта падобнае даводзіў Лёню і яго тата. Сядзяць яны іншы раз у гасцінай за сталом, гавораць пра кніжку, якую Лёня прачытаў. Тата, паслухаўшы яго, і скажа: «Ты, сын, заўсёды старайся зазірнуць у сутнасць падзеі, імкніся ўсякую з'яву разгледзець знутры. І параўноўвай, параўноўвай, бо ўсё пазнаецца ў параўнанні». А як гэта — знутры?

Аднаго разу Лёня не стрываў, з прыхаванай іроніяй сказануў: «Дык жа разгледзець знутры можа толькі доктар, ты, тата. Забаліць нешта ўсярэдзіне ў каго, дык ты павінен разгледзець, што забалела. Інакш як жа ты будзеш лячыць? А калі я вывучаю паўстанне Пугачова?.. Бедныя паўсталі супраць сваіх прыгнятальнікаў. Дык дзе тут, тата, тое нутро?»... Іронія яго ішла ад зніякавеласці, што ён не мог звесці качцы з канцамі ў татавых разважаннях, хаця падсвядома і адчуваў, што яны правільныя і былі б яму на карысць, каб толькі праясніліся. Слухаць, што яшчэ скажа тата, ён не стаў. «Пайду ў двор, у валейбол пагуляем»,— кінуў таропка і ўскочыў з крэсла, патэпаў моцнымі загарэлымі нагамі да дзвярэй.

Цяпер, стоячы на палубе цеплахода, Лёня раптам пачуў у сабе адзінае: яму дужа захацелася дзведацца, што адчувалі, перажывалі тыя барадатыя з сякерамі, мячамі і косамі, з доўгімі стрэльбамі людзі, якія ішлі «ваяваць Казань», выступалі супраць прышэльцаў-палякаў, змагаліся з жорсткімі бязлітаснымі баярамі. І з радасцю падумалася: дык ці не яно гэта — тое галоўнае, пра што гаварылі яму Андрэй Максімавіч і тата?

Шукай галоўнае, зазірай у сутнасць, параўноўвай... Вось ён і шукае, зазірае... А ў Горкім і Чэбаксарах, у Казані і Ульянаўску, у Валгаградзе і Саратаве што рабіў?.. Усюды ж, дзе яны пабывалі, Лёня ва ўсе вочы глядзеў на шырокія прасторныя вуліцы і прыгожыя дамы, помнікі і музейныя экспанаты, глядзеў і параўноўваў з тым, што бачыў папярэдне, пра што захоплена, цікава расказвалі экскурсаводы, усе ў сваёй захопленасці падобныя да Андрэя Максімавіча.

У Горкім яго дужа ўразіў помнік буравесніку рэвалюцыі — так сказала экскурсавод — Максіму Горкаму. Велічна ўзвышалася гордая фігура з задумлівым і рашучым, скіраваным удалечыню поглядам, з расхінутым плашчом, які раскрыліў за спіною волжскі вецер. «Горкі думае пра народ,— сказаў Лёню тата, калі экскурсавод закончыла свой расказ.—Бачыш, думка гэтая адбілася ў позірку, на твары ў яго». А Лёня, мусіць, і сам, без татавай падказкі зразумеў бы гэта, каб яшчэ якую хвіліну папрыглядаўся. Бо ён чамусьці пазіраў на помнік так, як на жывога чалавека, які нечым неадольным захапіў усю яго ўвагу.

Калі яны адплывалі ад горада, Лёня доўга, пакуль хапала зроку, глядзеў на панараму і час ад часу на памяць яму прыходзіла: «Горкі думае пра народ». Слухаючы скрозь гэты ўспамін, як б'юцца аб барты пругкія хвалі, ён тым часам і слухаў нешта ў сабе. У душы ў яго як бы таксама штосьці ўсплёсквалася, наплывала і адкатвалася, наплывала і адкатвалася. Аднаго разу, калі тая ўнутраная хваля наплыла, накацілася, можа, нейкім дзевятым валам, Лёня пачуў, не — пабачыў тое, што яна прынесла з сабою. У парку па-над Свіслаччу крочыць Янка Купала. Крочыць з горда ўзнятай галавою насустрач ветру... «А пра што ён думае?— мільганула ў Лёні ў галаве.— Можа, якраз у гэты момант ён складае: «Мой мілы таварыш, мой лётчык, вазьмі ты з сабою мяне! Я — ведай— вялікі ўжо хлопчык, і ўмею ўжо лётаць у сне». Прыгадаўшы гэтыя радкі, Лёня спачатку абрадаваўся: пра такіх, як ён, хлапчукоў Янка Купала думае, пра тое, каб дапамагчы ім здзейсніць свае мары і імкненні... Потым засаромеўся: дык жа вершык гэты для малых, для тых, што толькі пераступілі парог школы, а ён жа ўжо перайшоў у восьмы клас.

Лёню прыцягвала ўсё, што ён бачыў, пра што чуў у гарадах, куды яны заплывалі. З захапленнем, з нястрымнай дапытлівай цікаўнасцю ён аглядваў Горкаўскі і Казанскі крамлі. Магутныя, адмысловых узораў сцены з байніцамі, вежы, вароты былі так пабудаваны, што бачыліся яму на ўсёй іх суровай, але па-свойму прыгожай гармоніі. Захапленне яго ўзмацнялася ўражаннем, быццам ад гэтых збудаванняў веяла самой сівой гісторыяй, жорсткай і мужнай. А яшчэ тым, што ўзводзілі іх не звыклыя Лёні людзі, якіх усюды — у трамваі і тралейбусе, на вуліцах і ў парках, на стадыёне і ў тэатры — бачыць ён штодня, а такія загадкавыя, як намаляваныя на карцінках, у доўгіх, падперазаных вяроўкамі кашулях барадачы, якія адгукнуліся на зварот Мініна і Пажарскага, на ваяўнічыя поклічы Разіна і Пугачова.

І ўсё ж найбольш Лёчеву ўвагу прыцягвалі помнікі. Зажураны, поўны клопатаў і надзей паэт Някрасаў на Волжскай набярэжнай у Яраслаўлі: магутны, непахісны Іван Сусанін у скверы ў Кастраме; смелы, як стэпавы арол, і віхурны, як вецер, Чапаеў на ўздыбленым кані ў скверы ў Чэбаксарах; скручаны калючым дротам, але нязломлены, мужны верай у перамогу над гітлераўскімі заваёўнікамі, паэт, Герой Савецкага Саюза Муса Джаліль у Казані велічны і непаўторны як само жыццё,—так гаварыў Лёню тата — помнік-ансамбль, створаны ў азнаменаванне перамогі савецкага народа ў бітве на Волзе ў час Вялікай Айчыннай вайны і яго галоўны манумент Радзіма-маці — наМамаевым кургане ў Валгаградзе... Такімі запомніліся Лёню людзі, увасобленыя ў бронзе і граніце. Гэтыя вызначэнні ім ён дасло́ўна пачуў ад экскурсаводаў, аднак яму здавалася, што экскурсаводы пераказвалі яго словы, бо ён сам, паглядзеўшы помнікі, менавіта так сказаў бы цяпер пра іх.

Ва Ульянаўску Лёня быў па-ранейшаму надзвычай уважлівы да ўсяго, але як бы нейкі не пастаянны: то маўклівы і глыбока задумлівы, то нейкі мітуслівы. І ў адзін, і ў другі бок кідаўся, то адно, то другое яму рупіла.

Дзьмуў свежы ветрык з сонцам, на вуліцах і плошчах была цяплынь, тратуары і сцены нагрэліся, шыбы ў вокнах ззялі светлымі вясёлымі водбліскамі. Наўкола чуліся гамана, смех і жарты. Аднекуль з набярэжнай даносілася музыка духавога аркестра. Лёню здавалася, што гэтае рознагалоссе часам то было вельмі гучнае і перашкаджала яму на чымсьці засяродзіцца, то як бы глухла недзе ў паветры і даходзіла да яго свядомасці толькі разуменнем, што ажыўленая вуліца не можа быць без вясёлых чалавечых галасоў, а святочны парк — без музыкі. Той дзень яму здаваўся якімсьці вялікім, незнаёмым і непаўторным святам.

Калі іхняя група экскурсантаў знаходзілася ў флігелі, дзе нарадзіўся Ленін, сцішаны Лёня доўга стаяў незварушна і адчуваў: быццам усё ў ім абуджалася, імкнулася кудысьці, нават кроў прыхлынула да твару. Вялікія карыя вочы свяціліся агняным бляскам, у галаве мілагучна, як бы недзе далёка-далёка, але надзвычай часта, малінавым звонам адлічвалі час куранты Спаскай вежы Казанскага крамля, тонка звінела. З самага споду яго душы ўзнімалася і нібыта прасілася на волю бурная ўзрушанасць, якой і колі раней не было ў ім.

Словы экскурсавода пра малога Валодзю Ульянава як бы звязваліся адно з адным трывалым непарыўным вязьмом і гучалі ў Лёневым сэрцы працяглым несціханым водгаласам. Ён напружана ўзіраўся ў кожную рэч, якая была перад вачамі, час ад часу неяк па-даросламу пацiраў лоб кругавымі рухамі пальцаў, усё роўна як масажыраваў свае нейкія надзвычай вагомыя думкі. Раптам ён на хвіліну заплюшчыў вочы. А калі падняў павекі, на вуснах з'явілася ледзь улоўная шчаслівая ўсмешка.

Такім Лёня заставаўся потым увесь час, калі яны былі ў іншых мясцінах, звязаных з імем Леніна. Яны агледзелі архітэктурны помнік правадыру — Ленінскі мемарыял, велічны будынак з белага мармуру, у якім размясціўся філіял Цэнтральнага музея У. І. Леніна, наведаліся ў музей-кватэру сям'і Ульянавых, а таксама ў дом-музей У. І. Леніна, азнаёміліся з выстаўкай падарункаў у сувязі са стагоддзем з дня нараджэння Уладзіміра Ільіча. Да помніка правадыру на цэнтральнай плошчы, якая носіць яго імя, паклалі жывыя кветкі. Лёня таксама беражна паклаў свой букецік чырвоных гваздзікаў, які разам з татам купіў у кветкавым магазіне.

Пасля Ульянаўска Лёня нібыта пастражэў да сябе. Сам таго не ўсведамляючы, ён пачаў яшчэ ўважлівей, як бы нават патрабавальней ставіцца і да таго, што пабачыў і пачуў у гарадах, куды яны затым завітвалі. Асэнсоўваючы свае ўражанні, стараўся неўпрыкмет для сябе павярнуць іх і так, і гэтак, быццам прымерваў адно да аднаго.

ЦЕПЛАХОД падплываў да Астрахані. Лёня, як і ўсякі раз, калі сустрэча з незнаёмым горадам была ўжо блізкай, востра адчуваў у сабе прагу кранацца душой яго прыгажосці і ўдыхнуць, як тата кажа, паветра яго гісторыі. Але адчуванне гэтае было як бы нейкім крыху прыдзірлівым: што ў Астрахані ў параўнанні з Ульянаўскам ці Валгаградам можа быць незвычайнае? У яго разуменні гэта азначала: больш уражлівае.

Удалечыні паказаліся стромкія шматпавярховыя гмахі. Яны ззялі на сонцы снежнай белізной. На палубе стала ажыўленей, пабольшала людзей. Экскурсанты збіраліся каля бартоў, бадзёра віталіся, весела перагаворваліся. Аднекуль з насавой часткі цеплахода, валюхаста перастаўляючы кароткія ногі, прытэпаў Толік. З гэтым моцна збітым, кірпаносым, з маленькімі вочкамі хлапчуком Лёня ўпершыню сустрэўся, калі цеплаход адплываў ад Паўночнага рачнога вакзала сталіцы на Хімкінскім вадасховішчы канала імя Масквы. Толік тады, засунуўшы рукі ў кішэні, паважна пахаджваў па палубе і паказаўся Лёню капрызным задавакам. Пасля Лёня неаднойчы бачыў, што паводзіў ён сябе неяк дзіўна: то быў маўклівы, насуплены і ў вачах яго адбівалася як бы нейкая пакутлівая радасць, то раптам ні з таго ні з сяго пачынаў весела і радасна смяяцца. Заліваўся так, што яго пухлы твар наліваўся густой, памідорнага колеру чырванню. Лёня на разумеў Толіка і праз гэта, мусіць, у іх не завязалася сяброўства. Больш таго, Толік быў не сімпатычны Лёню, і той, відаць, гэта адчуваў, бо заўсёды пазіраў на яго востра і недаверліва.

Шлэпаючы па палубе велікаватымі на яго нагу спартыўнымі тапачкамі, Толік зірнуў на Лёню, прыпыніўся, як бы разважаў, падысці, ці не. Колькі секунд яны пазіралі адзін на аднаго, быццам пабачыліся ўпершыню. Лёня не жадаў, каб задавака падыходзіў, хацелася пабыць аднаму.

— Прыгажуня-Астрахань — бачыш?— усклікнуў Толік, паказаўшы рукою ў бок горада. Глыбока ўдыхнуў густое, вільгатнаватае паветра, са свістам, праз ноздры выдыхнуў і пакрочыў далей. Тады раптам Лёня адчуў: яму чамусьці стала шкада, што Толік пайшоў ад яго. Хай бы яшчэ што сказаў.

За спіной у Лёні хтосьці спыніўся. Ён адразу здагадаўся, хто — тата. Часта так бывае: тата падыдзе і стаіць моўчкі. Ці то назірае, як Лёня натхнёна любуецца наваколлем, ці проста не хоча перашкаджаць яго ціхім, глыбакадумным развагам. Потым, калі Лёня скажа: «Ну чаго ты маўчыш, тата?», ён заводзіць гаворку і абавязкова папытае, каторы з тых гарадоў, якія яны наведалі, прыгажэйшы. І Лёня кожны раз яму адказвае: «Дык мы ж дамовіліся, што гэта я скажу ў канцы нашага падарожжа, калі ўсё пабачым. Так жа дамовіліся?» Тата кладзе сваю вялікую далонь на яго кучаравую чарнявую галаву, ціха ўсміхаецца: «Так, сынок, так».

Астрахань сустрэла іх спорным, цёплым дожджыкам, што праліўся з невялікай хмаркі. Імклівая хмарка выслізгнула немаведама адкуль, дожджык весела прашумеўшы, так жа нечакана перастаў, як і ўсчаўся. Абмытыя ім, больш рэзка запахлі ў скверах і на плошчах пабуялыя кветкі.

Лёню здавалася, што ён чуў прыемны пах кветак і тады, калі знаходзіўся ў доме-музеі Сяргея Міронавіча Кірава.

Ціха-ціха было ў музеі. Толькі мякка гучаў голас экскурсавода. Калі яна расказвала пра Часовы Ваенна-рэвалюцыйны Камітэт, якім у грамадзянскую вайну кіраваў Сяргей Міронавіч, вочы Лёні раптам пачалі расшырацца, губы здзіўлена здрыгануліся. Ён ледзь не пляснуў далонямі: і гэта той Сярожа Кострыкаў, хлопчык з Уржума, пра якога ён чытаў у кніжцы! Потым, праз мінуту, Лёня паправіў сябе: Сярожа Кострыкаў і ў дзяцінстве быў ого якім справядлівым, мужным і палымяным! Лёс наканаваў яму цяжкія, суровыя выпрабаванні і калі Лёня чытаў кніжку пра яго быў момант, што на густа-чорныя літары раптам капнула неспадзяваная гарачая сляза. Але ў сэрцы чуліся не столькі жаль і спагада, колькі гонар і вера: не абяссілее Сярожа ў змаганні за праўду і дабро, не. Дужы Сярожа і нязломны.

З такім жа трапяткім пачуццём, як у доме-музеі, Лёня стаяў каля помніка Кіраву. Потым, калі аглядваў старажытны крэмль, помнікі Леніну, Пушкіну, карцінную галерэю імя Барыса Міхайлавіча Кустодзіева і краязнаўчы музей, яму ўвесь час здавалася, што недзе побач з ім знаходзіўся нябачымы хлопчык з Уржума Сярожа Кострыкаў. Ён адчуваў: пачаў напаўняцца як бы нейкай новай радасцю, новай сілаю.

Увечары, калі Лёня стомлены, але задаволены, радасна ўзбуджаны вяртаўся на цеплаход, тата абняў яго за плечы, зазірнуў у твар:

— Ну вось, сын, і пазнаёміліся мы з цудоўнымі волжскімі гарадамі. Дык які

з іх самы прыгожы? Які самы светлы?

Лёня зірнуў на яго з-пад ілба з нясмелай усмешлівай увагай. І тады быццам упершыню заўважыў, які тата моцны — высокі, з вялікай галавою і шырокім мужным тварам.

— Усе прыгожыя, а каторы прыгажэйшы — мне трэба падумаць, — адказаў стрымана.

— Падумай, падумай, калі трэба. — Тата нахіліўся, прыгрэў яго вуха сваёй цёплай шчакою. Лёня варухнуў плячом, быццам яму было непрыемна, а сам не змог схаваць шчаслівай усмешкі.

УМІНСК яны вярталіся самалётам. Лёня быў шчаслівы і стомлены. Сядзеў, заплюшчыўшы вочы, драмаў. Успамінаў пра тое, што пабачыў на берагах Волгі-матухны. Ён так і называў раку, наслухаўшыся, як велічаюць яе людзі. Думкі, як і рака, цяклі то імкліва, часам віравалі, то спакойна і прывольна. Неўпрыкмет у гэтую няроўную плынь уліўся ўспамін пра школу, пра клас, у якім вучыўся Лёня. Прыгадалася — як заблішчала. Так хораша было яму сядзець на парце каля акна, час ад часу, калі да яго падступалі якія няўтрымныя развагі, пазіраць на горад! За акном — то жоўтае лісце ляціць з дрэў, то дождж праліўся з сіняй хмары, то віхурыць сярдзітая сівая мяцеліца. Асабліва прыцягваў яго ўвагу Палац культуры трактарабудаўнікоў — з вялізнымі шырокімі вокнамі, абсаджаны густалістымі пышнымі дрэвамі. Лёня, пазіраючы на яго, імкнуўся ўявіць, як людзі глядзяць там кіно, выступаюць у спектаклях, спяваюць і танцуюць.

На аэрадроме, выйшаўшы з самалёта, Лёня падняў рукі ўгору, быццам вітаўся з роднай зямлёю, выцягнуў іх так, што аж нешта хруснула ў суставах. Там, дзе канчаўся аэрадром, распаленае сонца прыгожа садзілася за гарызонт. Ён азірнуўся наўкола, паглядзеў на горад і як бы з нейкай прытоенай палёгкаю заключыў:

— Вось мы і дома.

Назаўтра раніцай, паснедаўшы, Лёня хуценька зас[illegible]біраўся на двор. На татава запытанне, куды так спяшаецца, адказаў:

— Пайду Зіне раскажу пра падарожжа. Вунь яна кветкі на газоне паліває.

Зіна, дачка іхніх суседзяў, была яго таварышкай. Яны вучыліся ў адным класе, сядзелі за адной партай. Улетку разам хадзілі на возера купацца, а зімою — у басейн паныраць з вышкі і на каток паганяцца адзін за адным навыперадкі. У адрозненне ад Лёні, якому трэба было да ўсяго новага ўдумна прыгледзецца, нешта паслухаць, Зіна любіла пасмяяцца, нават пасваволіць. Шэрыя вочы яе, вострыя і жвавыя, быццам толькі і чакалі прычыны для смеху. Нярэдка — легкадумнага і пустога. Тым не менш гэтая рознасць у характарах не перашкаджала Лёню і Зіне хораша, шчыра сябраваць. Сяброўству іх у пэўнай меры, мусіць, спрыяла тое, што ён таксама быў здатны пасмяяцца — толькі не абы з чаго, а з сапраўды смешнага, яна ж, у сваю чаргу, умела слухаць і дасціпна распытваць пра цікавае.

Калі Лёня, скачучы ўніз па лесвіцы праз тры прыступкі, вылецеў з пад'езда, Зіна ўжо скончыла паліваць кветкі, ішла ў пад'езд. Яны ледзь не сутыкнуліся нос у нос.

— Ой, Лёня, калі ты прыехаў! — Дзяўчынка адступіла на крок, павяла па ім уважлівым позіркам з галавы да ног. — Які ты смешны стаў, смуглы, як цыганё, і цыбаты нейкі. — Яна залілася тонкім звонкім смехам.

— А ў цябе вунь нос лупіцца, як цыбуліна стаў. — Лёня не хацеў гаварыць гэтага, бо не меў намеру крыўдзіць сяброўку — само вырвалася.

— Ты скажаш — як цыбуліна. — Зіна склала пухнаценькія вусны ў капрызны трохкутнічак і ў наступны момант натуральна весела, быццам і не было той крыўды ў яе, усклікнула: — Давай, Лёня, на возера паедзем! Ух паплаваем!

— Давай! — ахвотна згадзіўся Лёня, адчуўшы палёгку, што яна не пакрыўдзілася. — Я дык і засумаваў крыху па возеру. Гідравеласіпед возьмем, пакатаемся.

Яны ўжо наважыліся ісці, як Лёня раптам уважліва, быццам прасіў яе аб нечым, зірнуў на Зіну.

— Не, давай лепш па гораду паездзім. На трамваі, тралейбусе, аўтобусе пакатаемся.

Сустрэліся позіркам. У Зініных вачах Лёня пабачыў непаразумеласць: адкуль яно з'явілася ў цябе — такое дзіўнае жаданне? І растлумачыў, сам яшчэ не ўсведамляючы, што гаварыў не тое, што на самай справе адчуваў глыбока ў душы:

— Нешта захацелася пакатацца.

Зіна таксама добра не ўсведамляла, што чамусьці не паверыла яму. Ён узяў яе за руку, памалу сціснуў вузкую далонь гарачымі пальцамі, якія ледзь улоўна нецярпліва ўздрыгвалі.

— Паедзем пакатаемся. — Зіна тузанула яго за руку і яны лёгка пабеглі з двара.

Увесь дзень яны калясілі па гораду. Праехалі Ленінскі, Партызанскі, Пушкінскі праспекты, былі ў Зялёным Лузе, Серабранцы і Чыжоўцы, хадзілі па плошчах Леніна і Перамогі, наведаліся да помнікаў Янку Купалу, Якубу Коласу, юнаму партызану Марату Казею, лётчыку Грыцаўцу, які стаў першым у нашай краіне двойчы Героем Савецкага Саюза. Лёня расказваў Зіне пра тое, што бачыў у волжскіх гарадах, і сам глядзеў, глядзеў наўкола ва ўсе вочы. Часам ён змаўкаў, пра нешта думаў, і тады быццам убіраў у сябе тое, што было перад ім, на што так прагна пазіраў. А Зіна тармасіла яго за руку: чаго ты маўчыш? Ну расказвай жа, расказвай...

Дадому ён вярнуўся надвячоркам. Мама адразу задала яму прачуханку: куды знік, нічога не сказаўшы, дзе цэлы дзень прападаў? Яны з татам перахваляваліся, усялякае перадумалі.

Потым яны пілі чай з электрасамавара. Мама частавала яго свежым клубнічным варэннем, усё падкладвала і падкладвала пахкія, насычаныя цукрам ягады яму ў шклянку. Падавала пульхныя булачкі, масла, сыр.

— Еш, сынок, еш, схуднеў ты як — аж касцямі брынчыш.

Тата глядзеў на Лёню з усмешкай, як бы гаварыў вачамі: «А пра нашу дамоўленасць ты забыўся?» Дапіў свой чай, адставіў парожнюю шклянку і спытаў:

— Ну дык які табе волжскі горад больш за ўсё спадабаўся? Цяпер ты ўжо можаш сказаць?

Мама рэзка павярнула да яго галаву: не дасць дзіцяці пад'есці. Яе доўгія каштанавыя валасы пераляцелі з пляча на плячо. Лёня памаўчаў, нечакана прыгадалася, што сказаў яму Толік, калі яны ў Астрахані развіталіся:

— Мне больш за ўсё спадабаліся Чэбаксары. Там жа Чапаеў на кані!

На міг яму нават падалося, што ён адчуў Толікаву потную далонь і цвёрды поціск кароткіх таўставатых пальцаў.

— А я дык не вызначыў яшчэ, які мне спадабаўся найбольш, — прагаварыў Лёня так, быццам адказваў Толіку.

— От калі думаю пра кожны паасобку, дык бачу тое, што найбольш спадабалася, а калі пачынаю параўноўваць, то... Заўсёды, калі пачынаю параўноўваць, чамусьці прыгадваюцца тыя белыя коні з казкі, якую ты, тата, расказваў мне. Помніш — расказваў, калі я быў малы? Дужыя, такія прыгожыя коні, і я іх бачу далёка-далёка... Як тады, калі слухаў тваю казку. Скачуць яны, вецер доўгія грывы развявае... Ці, можа, тата, не казка то была? Можа, ты скакаў на тых конях?..

Тата пільна-пільна ўглядваўся Лёню ў твар, быццам па яго выразе хацеў улавіць тое, што засталося за словамі.

У расчыненае акно дзьмухнуў свавольны ветрык, паварушыў гардзіну. Яна напялася і зноў апала. На стале замітусіліся цені. Ветрык і заходнае сонца забаўляліся з лісцем клёна, які цягнуўся галінамі да акна.

— А самы прыгожы быў бы наш Мінск. — Радасная думка, якая жыла ў Лёневай душы, затрапяталася мацней.

— Чаму, сын? — пераглянуўшыся, разам спыталі тата і мама.

Лёня не ведаў — чаму. Можа, таму, што ён жыве ў гэтым горадзе? Ён не адказаў ім. Паглядзеў на аднаго, на другога і задумліва прамовіў:

— Каб толькі Ленін нарадзіўся ў Мінску і быў тут, як ва Ульянаўску, Ленінскі мемарыял.

Прасторы вабяць

Упершыню случчане даведаліся, што побач з імі жыве сталы, удумлівы, з уласным почыркам мастак, здаецца, у той год, калі Уладзімір Сцяпанавіч Садзін вярнуўся з творчай камандзіроўкі ў Крым і прадставіў на суд аматараў жывапісу свае работы. З яго пранізаных сонцам, напоўненых яркімі паўднёвымі фарбамі пейзажных лістоў дыхнула горным паветрам, пахам мора, вочы песціла блакітная бездань крымскага неба. Фактычна з тых работ ён па-сапраўднаму і заявіў аб сабе як мастак, хоць быў ужо ў гадах, меў за плячамі нялёгкі багаж перажытага на вайне. З яго пакалення,

У. Садзін. «Па Енісею».

як сведчыць статыстыка, выжыла толькі тры працэнты франтавікоў. Артылерыст-разведчык Уладзімір Садзін ішоў па франтавых дарогах у складзе 100-га гвардзейскага мінамётнага палка. Данбас, Беларусь, Украіна, Польшча, Усходняя Прусія — вось няпоўны пералік мясцін, дзе яму давялося ваяваць, мокнуць у сырых траншэях, хаваць загінуўшых сяброў-аднапалчан...

Ужо на фронце дваццацігадовы юнак спрабаваў свае сілы ў жывапісе і графіцы. Нядаўна на выстаўцы мастака ў Слуцкай гарадской бібліятэцы імя Н. К. Крупскай я бачыў тыя першыя спробы, зробленыя, напэўна, спехам, па гарачых слядах баёў. Палонныя немцы ў Кёнігсбергу. Дагараючыя на вуліцы нейкага гарадка «тыгры». Партрэты нашых байцоў. Паміж тымі франтавымі замалёўкамі і крымскімі пейзажнымі лістамі ляжаў адрэзак часу ў дзесяць гадоў. Уладзімір Сцяпанавіч пасля дэмабілізацыі прыехаў у Слуцк, палюбіў гэты гарадок на ўсё жыццё не менш, чым сваю вёску Чыркова на Пензеншчыне, дзе прайшло дзяцінства і юнацтва. Працаваў і адначасова вучыўся завочна на курсах у Доме народнай творчасці імя Н. К. Крупскай, якія паспяхова закончыў у 1954 годзе. Сустрэча з народным мастаком, лаўрэатам Ленінскай прэміі акадэмікам У. А. Фаворскім была каштоўнай для Уладзіміра Сцяпанавіча тым, што Фаворскі, паглядзеўшы работы, параіў яму паспрабаваць сілы ў графіцы: ужо ў першых пейзажных накідах праглядваўся «почырк» здольнага, з вострым адчуваннем прадмета мастака-графіка. Уладзімір Сцяпанавіч успрыняў параду старэйшага калегі па прафесіі на поўным сур'ёзе, стаў настойліва працаваць над павышэннем свайго майстэрства. Яму ў гэтым дапамагалі мастакі Ю. Няпрынцаў, М. Жукаў, У. Антошчанка-Аленеў.

Памятаю, як у пачатку шасцідзесятых гадоў у гарадскім Доме культуры паявілася адна з першых яго графічных работ «Салігорск. Калійны камбінат». То быў час стварэння на Палессі хімічнай індустрыі на базе багацейшых залежаў калійных солей, і прафесія гарняка для беларусаў была новай, незвычайнай, як і пейзаж з шахтнымі капрамі. Адна за адной выходзяць у свет яго гравюры: «Салігорск будуецца», «Дарога на калійны камбінат», «Салігорск. Мантаж капра» і іншыя.

Але ўжо тады было відаць, што Уладзіміра Сцяпанавіча прыцягваюць не толькі індустрыяльныя, а і лірычныя пейзажы. Гравюра «Алея ў Вясеі» трапіла на выстаўкі графікі беларускіх мастакоў у Францыю і Бельгію. Веснавы, хутчэй за ўсё сакавіцкі сонечны дзень. Алея з клёнаў і ліп, што ўзнялі ў халоднае неба голае голле. Па алеі ідуць дзеці, і, нібы ўслед за імі, цягнуцца цені дрэў. Воддаль, на шашы, што праходзіць у канцы алеі, — аўтобус. І ўсё. Дэталей няшмат, а настрой яны ствараюць веснавы, радасны.

У 1963 годзе Уладзімір Сцяпанавіч пабываў у тых мясцінах, дзе вясной сорак пятага грозныя залпы «кацюш» адпявалі хаўтуры па Гітлеру, — у раёне порта Пілаў (цяпер горад Балтыйск). З групай мастакоў ён на працягу трох месяцаў стварае гравюры, прысвечаныя будням рыбакоў і партовых рабочых, маракоў Чырванасцяжнага Балтыйскага флоту. Дамоў вярнуўся з неблагім багажом: графічныя лісты «Падводнікі. Трывога», «Ракетныя катэры» і іншыя атрымалі высокую ацэнку, тры работы экспанаваліся на рэспубліканскай выстаўцы.

Як сапраўднага мастака, Уладзіміра Сцяпанавіча вабілі новыя, яшчэ нязведаныя далі. І ён падарожнічаў. Ехаў туды, дзе ўзводзіліся новыя гарады, гідраэлектрастанцыі, плаціны.

— Такія паездкі ўзбагачаюць ужо тым, — гаворыць Уладзімір Сцяпанавіч, — што адкрываюць мастаку вочы на грандыёзнасць нашых планаў па пераўтварэнню некалі бязлюдных месц на хараство і веліч прыроды. Вяртаешся дамоў «заражаным» духам творчасці на многія месяцы.

І ўсё ж, мне думаецца, заморскія далі (мастак пабываў таксама ў ФРГ, Швейцарыі, Японіі) не засланілі ад яго мясцін, дзе прайшла большая палова жыцця — блізкай сэрцу Случчыны. Уладзіміра Сцяпанавіча часцяком можна ўбачыць на заходняй украіне горада, дзе за апошнія дзесяць гадоў выраслі буйныя прамысловыя прадпрыемствы, жылыя масівы. Толькі за апошнія два гады ў штотыднёвіку «Неделя» з'явілася серыя яго работ на тэмы індустрыяльныя і лірычныя: «Ільнозавод у Слуцку», «Элеватар», «Гарадскі парк». Некалькі работ друкавалася ў часопісе «Маладосць».

Ёсць у яго клопат і чыста педагагічны: вось ужо 26 гадоў Уладзімір Сцяпанавіч перадае свой вопыт мастака юным гурткоўцам студыі выяўленчага мастацтва пры гарадскім Доме піянераў. Два разы на тыдзень студыйцы прыходзяць сюды на заняткі. А колькі вучняў Уладзіміра Сцяпанавіча сталі вядомымі беларускімі мастакамі: браты Уладзімір і Міхаіл Басалыгі, Мікалай Карзеў, Уладзімір Федаровіч...

На традыцыйнае пытанне, чым ён заняты цяпер і якія выношвае задумкі на бліжэйшае будучае, Уладзімір Сцяпанавіч, паправіўшы далонню ледзь кранутую срэбрам густую капу валасоў, адказаў са сціплай усмешкай:

У. Садзін. «Паўночнае ззянне».

— Думаю прадставіць на выстаўку, прысвечаную 60-годдзю БССР і Кампартыі Беларусі, серыю графічных лістоў аб нафтавіках Палесся, дзе мне давялося пажыць і шмат цікавага ўбачыць. Працую над гравюрамі, якія будуць аб'яднаны ў серыю «Японія вачамі мастака». Сёе-тое ўжо накідаў. Збіраюся ў новую паездку ў Крым...

Міхась ТЫЧЫНА.

ФАРМІРАВАННЕ ІДЭЙНАЙ ПЕРАКАНАНАСЦІ І МАЙСТЭРСТВА МАЛАДЫХ МАСТАКОЎ

З ПЛЕНУМА ПРАЎЛЕННЯ САЮЗА МАСТАКОЎ БЕЛАРУСІ

ТВОРЧАЯ моладзь: яе месца ў агульным творчым працэсе, шляхі развіцця і станаўлення маладых талентаў — гэтым пытанням быў прысвечаны чарговы пленум праўлення Саюза мастакоў Беларусі, які адбыўся напярэдадні Кастрычніцкіх свят.

З дакладам на пленуме выступіў старшыня праўлення Саюза мастакоў БССР В. Грамыка.

Разумеючы ўсю складанасць і шматграннасць работы па выхаванню і навучанню маладога мастака, адзначыў дакладчык, на яе можна і трэба глядзець толькі з пазіцыі высокай адказнасці перад грамадствам за сённяшні дзень нашага мастацтва і яго будучыню, за лёс кожнага таленту.

Поспех заўсёды вызначаўся не толькі ступенню таленавітасці, узроўнем прафесійнай падрыхтоўкі, але і ступенню ідэйнай загартоўкі і перакананасці. Чым больш складаная задума ў маладога мастака, тым багацейшы грамадскі і эмацыянальны яе змест, тым большага майстэрства патрабуе яе ўвасабленне.

Неаднойчы ўжо адзначалася змястоўная шматграннасць і духоўная напоўненасць творчасці маладых у 70-я гады. Вырасла роля глыбока асабістага, эмацыянальнага ўспрыняцця і ацэнкі рэчаіснасці. І гэтую якасць можна разглядаць як працяг развіцця таго лепшага, што было знойдзена, што выспявала ў мастацтве мінулых дзесяцігоддзяў, кожнае з якіх вызначалася творамі, што ўвайшлі ў духоўную скарбніцу краіны.

Зараз, калі ў лепшых работах маладых мастакоў паспяхова вырашаюцца надзвычай не простыя творчыя задачы, як ніколі зразумела, што рух наперад немагчымы як без крытычнага асэнсавання пройдзенага этапу, так і без засваення мастацкага вопыту мінулага.

На жаль, у мастацкім асяроддзі, адзначыў дакладчык, слабасць у маладога мастака выразных светапоглядных перакананняў не заўсёды нават і заўважаецца, як заўважаецца слабы малюнак альбо неахайны жывапіс. Між тым, часта многія беды маладога спецыяліста, здавалася б, чыста прафесійнага складу, пачынаюцца менавіта ад гэтага.

І тут узнікае неабходнасць больш зацікаўленых кантактаў паміж творчым саюзам і мастацкай ВНУ. Мастацкая навучальная ўстанова і творчы саюз з'яўляюцца школамі майстэрства розных ступеней. І таму ўзгодненасць іх сістэм, прынцыпаў засваення матэрыялу жывой рэчаіснасці і ёсць неабходная ўмова для непарыўнага росту прафесійнага майстэрства, правільнага развіцця і станаўлення асобы. Творчая практыка на базе грамадска-значнага сацыяльнага заказу вонкава паказвае ўсе хібы навучальнай праграмы і ўсе яе недапрацоўкі. Недастаткова правільна арганізаваны навучальны працэс, работа па ідэйнаму выхаванню, непрадуманасць планаў і метадычных распрацовак ясна прачытваюцца ў самай невялікай дыпломнай рабоце. А за кожнай работай — лёс чалавека, творцы.

Фарміраванне асобы мастака, яго светапогляду — працэс складаны і доўгі, але і недапушчальна вялікія страты для мастацтва — калі ён зацягваецца, выходзячы далёка за рамкі вышэйшай навучальнай установы.

Дакладчык падкрэсліў важнасць штодзённай выхаваўчай работы ў інстытуце і творчым саюзе, неабходнасці спалучэння добразычлівай патрабавальнасці і разумення.

Збліжэнне мастацтва і рэчаіснасці, якое атрымала практычнае афармленне ў паездках маладых творцаў на будоўлі і буйнейшыя прадпрыемствы краіны па лініі Саюза мастакоў і камсамола, заслугоўвае асаблівай увагі. Зразумела, што мастак, які не здолеў адшукаць цікавую тэму дома, не знойдзе яе і за сотні кіламетраў, але пашырэнне грамадскага кругагляду, набываемыя веды і ўражанні ствараюць лепшыя ўмовы для поўнага раскрыцця і сцвярджэння творчай асобы. Якое рашучае ўздзеянне аказвае, напрыклад, жыццё БАМа на станаўленне маладога таленту, бачна на прыкладзе творчага росту А. Гаршкавоза. Яго першыя акварэлі, прысвечаныя «будоўлі веку», зрабілі аўтара прыкметным на рэспубліканскіх выстаўках.

Маладым мастакам, на думку дакладчыка, часта бывае, цяжка спалучыць свежасць пачуцця з даволі жорсткімі законамі, па якіх нараджаецца і жыве карціна ці графічная серыя. Патрабуе напружанай душэўнай працы працэс адбору і абагульнення, лагічнае кампазіцыйнае рашэнне і выбар мастацкіх сродкаў. Але пераадольваючы цяжкасці, настойліва працуюць над карцінамі і прыкметна выраслі В. Яўсееў, У. Тоўсцік, В. Маркавец і іншыя маладыя жывапісцы і графікі.

Вялікае значэнне ў беларускім мастацтве набыла тэма Вялікай Айчыннай вайны, і ад дзесяцігоддзя да дзесяцігоддзя мяняюцца прынцыпы яе вобразнага адлюстравання! Сёння яна ўсё часцей гучыць як тэма памяці. Памяць увекавечваецца, сцвярджаецца яе вышэйшы гуманістычны сэнс для будучыні ў творах мастакоў-ветэранаў: і прыкладам духоўнай сувязі старэйшага і малодшага пакаленняў можа служыць палатно Н. Лівенцавай «Бацьку і маці, партызанам Беларусі, прысвячаецца». У інтэрпрэтацыі маладой мастачкі тэма мужнасці бацькоў паказана апасродкавана, метафарычна, як сінтэз адносін маладога пакалення да народнага подзвігу.

Памяць не аб асабіста перажытым, а памяць народа, гэта эмацыянальная памяць, святое пачуццё да перажытага народам падказала тонкую выразнасць мастацкіх рашэнняў у палатне В. Квяткоўскага «Вясна загінуўшых паэтаў», гарманічнай і строгай рабоце В. Ціханава «Спадчына».

Памкненні беларускай моладзі, як адзначыў дакладчык, паступова набываюць характар праграмных, асаблівасці яе вобразнага мыслення і светапогляду дастаткова моцныя і плённыя. Лепшыя творы даносяць чысціню і яснасць грамадзянскага, гуманістычнага ідэалу. І гэта галоўнае, што дазваляе аптымістычна глядзець на перспектывы будучыні.

Падсумоўваючы сказанае, дакладчык гаворыць аб тым, што размова пра творчасць маладых мастакоў, пра плён і выдаткі рэспубліканскай выстаўкі, прысвечанай 60-годдзю камсамола, дазволіць лепш акрэсліць напрамкі работы з моладдзю, прааналізаваць стан гэтай дзейнасці — у сувязі з рашэннямі, пастаўленымі ў дакуменце ЦК КПСС «Аб рабоце з творчай моладдзю».

Пра энтузіязм, хваляванне, якія папярэднічалі юбілейнай маладзёжнай выстаўцы гаварыў мастак А. Арцімовіч. Ён выказаў меркаванне аб неабходнасці стварыць маладзёжныя аддзяленні пры секцыях для актывізацыі работы, для падтрымкі маладых у іх пошуках, у іх жаданні вывучаць жыццё, адчуць сябе самастойна.

Творчыя сілы Саюза мастакоў, моладзь аднесліся да выстаўкі «Маладая гвардыя Краіны Саветаў» з вялікай адказнасцю, адзначыў мастак В. Шаранговіч,— з пяцісот прадстаўленых работ адабрана для экспазіцыі каля дзвюхсот пяцідзесяці, і большая частка работ — творы маладых аўтараў. Шырока прадстаўлены абласныя творчыя арганізацыі.

Аднак выстаўкі нярэдка рыхтуюцца паспешліва. Таму, на думку В. Шаранговіча, і мела месца недастатковая патрабавальнасць да работ у некаторых маладых мастакоў, якія прапаноўвалі на выстаўку да дзесятка твораў — на выбар. Усё яшчэ мала тэматычных карцін, мала прадстаўляе работ мінскае маладзёжнае аб'яднанне, а гэта сведчыць аб адарванасці аб'яднання ад творчых секцый.

Пра недастаткова наладжаную сувязь Беларускага тэатральна-мастацкага інстытута і Саюза мастакоў у выхаванні творчай змены гаварыў прарэктар інстытута С. Лакішык. Прывабіць увагу маладых мастакоў да сацыяльных праблем, шырока паказаць іх работы, арганізаваць іх абмеркаванне — няма такіх магчымасцей у інстытуце. Больш цесныя адносіны, больш уважлівая зацікаўленасць з боку Саюза мастакоў да маладых, несумненна, спрыяла б іх росту.

Мастацтвазнавец А. Сурскі засяродзіў увагу на тым, што абмеркаванне выстаўкі не павінна насіць фармальны характар. Ды і незразумелы сам прынцып адбору. Непрадуманасць тым часам прыводзіць да непаразумення: а што ж хацелі ад выстаўкі яе арганізатары — адлюстраваць працэс работы маладых на сучасным этапе ці маладзёжную, камсамольскую тэматыку? А можа, хацелі праз рэтраспекцыю адлюстраваць рост маладых мастакоў?

У беларускім мастацтве відавочна новая тэндэнцыя, якая звязана з прыходам новага пакалення. У параўнанні з мінулымі дзесяцігоддзямі, гаварыў А. Сурскі, адчуваецца ў моладзі большае жаданне ўзараць глыбей душэўны пласт, выказацца іншай мовай, мовай больш сучаснай, эрудзіраванай. Але ж часам гэта выглядае не інакш, як імкненне прадэманстраваць сваю эрудыцыю. Кожная эпоха, вядома, вызначае свой ідэал хараства, але моладзь, імкнучыся ісці ў нагу з сучаснымі моднымі тэндэнцыямі, нярэдка аказваецца ў іх палоне. Між тым сучасны мастацкі працэс — вельмі складаны. І ці ўсё трэба браць з сабою ў дарогу? Сакратар праўлення Саюза мастакоў А. Зіменка спыніўся на ролі старэйшага пакалення ў фарміраванні светапогляду маладога мастака — работа па ідэйнаму выхаванню павінна весціся штодзённа, быць мэтанакіраванай і паслядоўнай.

Гаворачы пра работу з творчай моладдзю напярэдадні выставак, А. Зіменка адзначыў, што жыццё карціны, графічнага ліста ці скульптуры часцей за ўсё вельмі кароткае. Таму неабходна ствараць перасоўныя выстаўкі, перадаваць работы на прадпрыемствы і ў арганізацыі рэспублікі.

Звяртаючы ўвагу на ўдзел моладзі ў захаванні помнікаў культуры, А. Зіменка звярнуў увагу на такую акалічнасць: неўзабаве пачнецца аднаўленне Мірскага замка, і ўжо сёння трэба дбаць пра тое, у чыіх руках будзе гэта важная справа, як шырока будзе абмяркоўвацца гэты вялікі сацыяльны заказ.

На гэтым жа спыніўся і мастацтвазнавец В. Шматаў. Ён падкрэсліў, як важна мастаку разумець у поўнай меры сваю адказнасць перад часам, перад народам. Першыя роспісы, першыя помнікі, пастаўленыя ў краіне,— яны шырока абмяркоўваліся. Гісторыя такога стаўлення да мастакоў і іх твораў — даўняя. Вялікія майстры старажытнасці перш чым прыступіць да выканання вялікага заказу, прадстаўлялі на суд сучаснікаў тое, што задумана і знайшло адлюстраванне ў эскізах, кардонах, матэрыяле.

На жаль, нашы роспісы, помнікі, вялікія палотны шырока ніколі не абмяркоўваліся, хоць гэта дазволіла б пазбегнуць многіх памылак, многіх няўдач. Бо ці ж не ў гэтым прычына, што вялікія манументальныя творы не прыцягнулі ўвагі грамадскасці, не становяцца падзеяй у культурным і творчым жыцці горада і рэспублікі.

Надзённасць, своечасовасць пытання, вынесенага на пленум, падкрэсліў мастацтвазнавец У. Бойка. Узроставыя межы пакаленняў рухомыя, але ў гаворцы пра творчую моладзь прамоўца не падзяляе той аптымізм, які ўзнік пры разглядзе іх работ.

Маладыя працуюць актыўна, унутраны свет іх дастаткова цікавы. Папярэднія мастакі ішлі не з такім тэхналагічным уменнем, не з такой эрудыцыяй. Але з'явіліся і трывожныя ногкі: часцей за ўсё гаворка ідзе пра тое, як зроблена карціна, якімі мастацкімі сродкамі. Але ж мастак — гэта грамадзянін, гэта чалавек, які павінен падпарадкаваць задуме тое вынашанае ў сабе, што складае яго светапогляд.

Мы часта хвалім мастака, адзначае У. Бойка, за ўмение маляваць, за выкарыстанне жыццёвага матэрыялу, за кампазіцыю, а між тым — мастака няма. Тэма названа, а не вырашана. У большасці карцін — слізганне па паверхні тэмы, дзе адчуваецца, што многаму навучылі аўтара, але ёсць інфантылізм мастацкага мыслення.

Прычыны таго, што ствараецца мала работ ці што яны не адказваюць патрабаванням, не толькі ў дагаворнай сістэме...

Адносіны паміж мастаком і заказчыкам — складаныя. Заказчык — народ, і таму павінна быць грамадскае, кампетэнтнае, шырокае абмеркаванне твораў мастацтва.

Звыш шасцідзесяці спецыялістаў выпусціў Беларускі тэатральна-мастацкі інстытут. Маладым манументалістам, лепшым з іх, уласцівы грамадзянскасць, любоў да сваёй зямлі, цікавасць да яе гісторыі. Але яшчэ часта з-за незацікаўленасці ў лёсах маладых мы губляем іх для мастацтва пры велізарных выдатках на адукацыю. Занятасць па спецыяльнасці, майстэрні, вытворчая база — гэтыя пытанні трэба вырашаць ужо зараз, не адкладваючы надалей. А давер, добразычлівасць старэйшых дапаможа моладзі знайсці свае шляхі, адчуць адказнасць, вырасці спецыялістам. Аб гэтым гаварыў у сваім выступленні Г. Жарын.

Тая колькасць музеяў, якая існуе ў рэспубліцы, сказаў М. Басалыга, відавочна, недастатковая. Творы мастацтва «асядаюць» у запасніках, яны страчаны для сучаснікаў і мастакоў — пра гэта трэба гаварыць, гэта неадкладная справа і клопат усіх. Чым можна вытлумачыць тое, што ў Дзяржаўным мастацкім музеі БССР дасюль няма аддзела графікі? І ўсё пры такіх дасягненнях, якія ёсць у нас у гэтай галіне. У рэспубліцы ёсць мастакі, творчасць якіх трэба глыбока вывучаць. Сведчанне гэтаму — выстаўка заслужанага дзеяча мастацтваў БССР Г. Вашчанкі, чыя творчасць магла б легчы ў аснову не аднаго мастака, магла б стаць асновай школы, сапраўднай беларускай савецкай школай.

Клопатам аб рабоце з моладдзю, аб заўтрашнім дні беларускага мастацтва было прасякнута выступленне першага сакратара праўлення Л. Шчамялёва. Маладыя мастакі, сказаў ён, імкнуцца перадаць сваё бачанне свету. Розныя па характарах і таленту, маладыя заявілі пра сябе цікава, і выстаўка, пры ўсіх выдатках, атрымалася. Яна прывабіла шырокую грамадскасць, у залах выстаўкі адбылося многа сустрэч.

На думку Л. Шчамялёва, моладзі трэба імкнуцца да выяўлення значных тэм, да грамадзянскасці, да пошуку паўсядзённага і плённага.

Пленум абмеркаваў творчасць групы маладых жывапісцаў, манументалістаў, графікаў і прадстаўнікоў дэкаратыўна-прыкладнога мастацтва, рашыўшы пытанне аб іх прыёме ў Саюз мастакоў СССР. Праблема фарміравання ідэйнай перакананасці і майстэрства маладых мастакоў, якая стала прадметам абмеркавання на чарговым, як і на папярэднім сакавіцкім пленуме,— складаная і шматгранная. Станаўленне таленту, духоўны і прафесійны рост маладога мастака павінны быць у цэнтры ўвагі ўсёй работы праўлення творчага саюза. І прынятая пленумам пастанова па разгледжанаму пытанню вызначыла тыя кірункі, па якіх будзе праводзіцца далейшая работа.

У рабоце пленума прымалі ўдзел сакратар ЦК КПБ **А. Т. Кузьмін**, загадчык аддзела ЦК КПБ **А. Л. Петрашкевіч**, намеснік міністра культуры БССР **А. М. Ваніцкі.**

Беларуская кніга ў ГДР

У сталіцы Германскай Дэмакратычнай Рэспублікі Берліне адбылася выстаўка беларускай кнігі і кніжнай графікі, прысвечаная 60-годдзю БССР і Кампартыі Беларусі.

На выстаўцы экспанавалася звыш 800 назваў грамадска-палітычнай, навукова-тэхнічнай, мастацкай, дзіцячай, вучэбнай літаратуры, альбомы па краязнаўству і выяўленчаму мастацтву, а таксама — каля 200 твораў кніжнай графікі: А. Кашкурэвіча, Г. і Н. Паплаўскіх, Б. Заборава, В. Шаранговіча, А. Лось, У. і М. Басалыгаў і іншых.

У раздзеле палітычнай літаратуры шырока былі прадстаўлены творы класікаў марксізму-ленінізму, кнігі Л. І. Брэжнева, выданні, прысвечаныя 60-годдзю БССР і Кампартыі Беларусі. Вялікую цікавасць у наведвальнікаў выстаўкі выклікалі сувенірныя выданні гэтага года: альбом «У. І. Ленін у выяўленчым мастацтве Беларусі» і кнігі Л. І. Брэжнева «Малая зямля» і «Адраджэнне».

Багатымі і разнастайнымі па зместу былі на выстаўцы раздзелы мастацкай літаратуры: зборы твораў Янкі Купалы, Якуба Коласа, Петруся Броўкі, Максіма Танка, Аркадзя Куляшова, Івана Шамякіна, выбраныя творы і асобныя кнігі многіх беларускіх пісьменнікаў.

У цэнтры экспазіцыі асобнымі, з густам афармленымі стэндамі, былі вылучаны раздзелы: «Творы беларускіх пісьменнікаў, удастоеныя Ленінскай і Дзяржаўных прэмій СССР і БССР», «Кнігі, адзначаныя ўзнагародамі ўсесаюзных і рэспубліканскіх конкурсаў «Мастацтва кнігі», «Сувенірныя выданні».

Шматлікая колькасць наведвальнікаў выстаўкі беларускай кнігі і графікі сведчыць аб вялікай цікавасці грамадзян ГДР да культурных здабыткаў беларускага народа.

М. ЗАПОЛЬСКІ.



Адкрыццё выстаўкі беларускай кнігі і графікі ў ГДР.

У выставачных залах.

Прэс-канферэнцыя з журналістамі ГДР.

ТРЫВАЛА І НАДОЎГА

Да 75-годдзя з дня нараджэння Піліпа ПЕСТРАКА

Сёлета яму было б семдзесят пяць, і яшчэ сёлета дзе-небудзь на вуліцы, у калідоры рэдакцыі можна было бачыць яго каржакавата-круглявую, мажную постаць. Нягледзячы на сталы век, да самага нядаўняга часу ён нёс на сабе пячатку ад прыроды моцнага, па-сялянску здаровага чалавека. На галаве заўжды быў капялюш, у руках — партфель, дзе ў падсуседдзі рукапісаў, тоўстай кнігі з закладкамі добра пачуваліся толькі што купленыя на базары рабрысты крамяны яблык ці залаціста-гладкая цыбуліна. Базары ён любіў — па-сялянску ці, можа, паводле звычкі гарадскога чалавека, які не-не ды і пасумуе па вёсцы.

Дасылаў і прыносіў у рэдакцыю рукапісы ён найчасцей напісаныя ад рукі — зграбным, выразным, нават трохі прыхарошаным почыркам, і папера была нейкая асаблівая — блакітная ці жаўтлявая. І ў почырку па-асабліваму выдавала гаспадарова душа, ясная і трошкі мудрагелістая ў гэтай сваёй яснасці. Паглядзіш, пачнеш чытаць і міжволі падумаеш: харошы чалавек пісаў. Вядома, падумаеш яшчэ і таму, што ведаеш у ім гэтае харошае.

Прыгажосць, гожства, харошасць — вось што ён найбольш любіў у акаляючым жыцці і што пастаянна падкрэсліваў у абліччы і душэўным ладзе блізкіх сабе герояў. Колькі харошага, мудрага замілавання, светлай узрушанасці разліта на старонках ягоных твораў — асаблівай, пестракаўскай прасветленасці, што прымушала нас дзе-нідзе пагаджацца нават з ідылічнасцю. Але ён не быў сузіральнікам. Гэтага не дазваляла яму несакрушальнае маральнае здароўе і бескампраміснасць жыццёвай пазіцыі. І героі ягоныя такія. Высакароднымі парываннямі маладосці, адвагай у барацьбе і творчасці надзяліў ён і Андрэя Касцевіча з «Сустрэнемся на барыкадах», і Платона Грушку з «Серадзібора» — гэтых найбольш значных сваіх герояў з найбольш значных раманаў. У самім ім, у ладзе ягоных паводзін жыў і натуральна выяўляўся, не растрачаны з гадамі, высокі запавет рэвалюцыйнай маладосці, жыла ідэйная загартоўка агітатара-партыйца, вера ў пераможнасць дабра і справядлівасці — вера, што па-свойму, мусіць, вырасла да звычкі ў гады доўгіх турэмных зняволенняў пад час белапанскай Польшчы. Мусіць, адтуль, з турэмных гадоў, засталася ў яго і ўдзячная, нават трохі забабонная любоў да кнігі, нахіл да эрудыцыі і тэарэтычных разваг.

Калі-нікалі ды і ўспамінаецца мне адна бяссонная ноч, праведзеная з ім, аддадзеная дэкламаванню вершаў і прозы (тут трохі і я памагаў), успамінам пра былое, колішняе, маладое (тут адно я слухаў і здзіўляўся). Міцкевічаўская «Ода да маладосці», чытаная спачатку ў арыгінале, а потым адпаведна па-беларуску і руску, цягнула за сабою згадку пра шылераўскі гімн радасці — і Шылер таксама чытаўся, а потым неяк сама па сабе ўсплывала старая камунарская песня і пялася ціха, з заплюшчанымі вачамі, але пранікнёна і рашуча.

Мяне заўсёды па-харошаму здзіўляла ў ім чысціня эстэтычнага і маральнага чуцця, гэткі пестракаўскі, калі можна так сказаць, смак да прыгажосці. Ці абыходзілася тут без экзальтаванасці? Я не рашыўся б адказаць сцвярджальна, бо ў пестракаўскім захапленні заўсёды адчувальна праглядвала здаровая, народная аснова этыкі і прыгажосці. Ды вось і людзі з народа найбольш удаваліся яму. І наадварот, ахвотна выводзячы ў сваіх творах інтэлігентаў, ён ніколі не прапускаў, каб не падкрэсліць абавязкова іх дэмакратызм, блізкасць менавіта да народнага разумення працы і карысці, дабра і хараства. І вучоны аграном Платон Грушка, і доктарка Вера Лукашэвіч («Серадзібор») пераканальныя для нас таму, што аўтар умее самае звычайнае, здавалася б, зусім не інтэлектуальнае асяроддзе «падцягнуць» да іх: інтэлігентнасць і народнасць не кантрастуюць, а дапаўняюць адно другое. У старога калгасніка Несцера Падковы з таго ж «Серадзібора» інтэлігентнасці, духоўнага запасу, дальбог, куды больш, чым у іншых патэнтаваных інтэлігентаў з каторага сучаснага «інтэлектуальнага» рамана. Кампазіцыйныя пралікі, нарысавасць можна знайсці ў Пестрака, а вось ўжо ў схільнасці да паўзучага эмпірызму яго не абвінаваціш. Пестрак умеў без усялякай натугі апазітываваць побыт, адчуць у рэчы прысутнасць чалавека. Мне падабаецца такі рэалізм, бо ён шырокага дыхання, ён ад цэльнасці погляду на свет.

У Пестрака амаль няма апісання дзеля апісання. Добра ведаючы, напрыклад, сялянскі побыт, ён разумеў, як цесна знітаваны ён з усім ладам жыцця вясковага чалавека, наколькі ён неаддзельны ад традыцый, успамінаў, наколькі ён адухоўлены чалавечай дзейнасцю. У «Серадзіборы» апісанне Несцеравай хаты перарастае ў вобраз самога гаспадара, робіцца ўвачавідкі нейкай своеасаблівай і філасофіяй, і паэзіяй сялянскага жыцця. У апавяданні «Аўдоцця і яе ўнучак» адчуванне старой і малым трывожлівай невядомасці свайго лёсу без усялякага пачуццёвага нагнятання перададзена нейтральным апісаннем: «Неяк незвычайна ціха ўсюды: не чуваць ні мычання кароў, ні бляння авечак. Толькі часам убяжыць у сенцы певень і, асцярожна зірнуўшы адным вокам у хату, палахліва адсоквае». На такім апісанні кожны міжвольна спыніцца, яно непадробна мастацкае.

І разам з тым Пестрак не скупіцца на непасрэдна-аўтарскую характарыстыку, пераходзячы дзе-нідзе нават на лірычную дэкламацыю, і амаль заўсёды гэта прымаецца чытачом з прычыны непаўторна-пестракаўскага ладу выказвання.

Чытачу цяжка меркаваць, як у таго ці іншага пісьменніка выспявае задума твора, як ён збірае для яго матэрыял, які шлях праходзіць ад задумы да яе ўвасаблення. Колькі магу меркаваць, працэс пісання для Пестрака, мусіць, ускладняўся менавіта вывучэннем матэрыялу, ужываннем у яго, блізкасцю герояў да рэальных людзей, самім жанрам хронікі, які найчасцей абіраўся пісьменнікам. Пэўная бессюжэтнасць тут наколькі памагала, настолькі і перашкаджала. Раман і абмяжоўваўся канкрэтнай рэальнасцю, і мог тым часам бясконца доўжыцца ў ёй. Жыццё падганяла, але магло і паставіць у тупік. Нейкім чынам так было з «Серадзіборам», яшчэ, магчыма — з «Лесавічанкай». Пра гэта нам скажуць яшчэ даследчыкі і крытыкі.

Пестрак пражыў багатае і гераічнае жыццё. Не кожнаму былі б па сіле выпрабаванні, што выпалі яму на жыццёвай дарозе. Ён выйшаў пераможцам з іх, і літаратура сталася сведкай гэтай перамогі чалавека і грамадзяніна. Ён меў выдатны талент, глыбока народны па сваёй прыродзе, паглыблены і ўзбагачаны пастаянным аўтарскім клопатам аб яго не толькі грамадскай, але і культурнай каштоўнасці. Натуры артыстычнай, Пестраку было зразумелае багдановічаўскае парыванне да «красы і светласці, і прастору», а гэта ўжо несумненная адзнака сапраўднага мастацтва.

Лепшае з напісанага ім застанецца ў нашай літаратуры трывала і надоўга.

Міхась СТРАЛЬЦОЎ.

АД ПЕРШАГА КРОКУ

БЕЛАРУСКАЯ МУЛЬТЫПЛІКАЦЫЯ СЁННЯ

Спачатку трошкі гісторыі. Яшчэ ў 20-я гады, калі беларуская кінематаграфія рабіла свае першыя крокі, у дакументальных, навукова-папулярных стужках «Белдзяржкіно» выкарыстоўвалася мультыплікацыя. Асноўная частка карцін здымалася па заказу розных арганізацый. Мультыплікацыя дапамагала жыва і вобразна раскрыць папулярныя лозунгі часу. Так, у 1925 годзе ў фільме «Меліярацыя БССР», знятым па заказу Бабруйскага акружнога камітэта ЛКСМБ, мультыплікацыя даводзіла да масавай аўдыторыі непасрэдную карысць асушэння і выкарыстання балотных зямель. На экране ўзнікалі мультыплікацыйныя дыяграмы, схемы, а таксама надпісы, зробленыя «жывымі» (гэта значыць — рухомымі) літарамі.

Зазначым, што ішоў час масавага стварэння так званых «агітпрапфільмаў» — карцін, у якіх актуальныя заклікі часу ўвасабляліся ў ігравых альбо паўігравых сюжэтах. Сцэны, знятыя з удзелам акцёраў, змяняліся ў фільмах непасрэднай, адкрытай агітацыйнасцю плаката. Успомнім, якія папулярныя былі тады «Вокны РОСТА», які ўплыў яны аказвалі на графіку, асабліва на мову плаката, на стыль мультыплікацыйнага кіно. Пад уздзеяннем востра гратэскавых малюнкаў У. Маякоўскага ў Беларусі быў створаны фільм Г. Балцянскага і А. Найдзіча «Кастрычнік і буржуазны свет», выпушчаны на экран да 10-годдзя Вялікага Кастрычніка. Высокі пафас рэвалюцыі, услаўленне яе ідэй спалучаліся ў фільме з сатырычнай абмалёўкай яе ворагаў. Магутны рабочы з молатам, селянін з сярпом пераўтвараліся на экране ў чырвонаармейца — абаронцу Радзімы. Інтэрвенты былі прадстаўлены ў вобразе шматгаловай гідры, што акружыла граніцы Савецкай краіны. Прычым цікава, што ўжо тады аўтары ўжылі «калаж» — сінтэз малюнка з фотаздымкамі рэальных ворагаў рэвалюцыі. Рабочы і селянін тапталі гэтых вялікіх і малых гадаў. Аўтары вобразна выкарыстоўвалі надпісы, якія быццам самі сабой пераходзілі ў малюнак, нараджалі яго. Так, слова «капіталізм» пераўтваралася ў малюнак крэйсера і танка, а з іх узнікала слова «вайна». Фільм гаварыў з масамі вобразнай мовай лозунга, закліку і разам з тым мовай гумару, трапнага, хаця часам па-народнаму грубаватага. Вялікая і недвухсэнсоўная дуля вырастала пад носам у Чэмберлена, які хацеў заваяваць Краіну Саветаў.

Жартаўлівымі былі першыя беларускія мультыплікацыйныя фільмы, адрасаваныя дзецям — «Жывыя дамы» А. Найдзіча і Н. Агнёцава (1928 г., пра неабходнасць велаў у розных галінах навукі) і «Бунт зубоў» (1928 г., аўтары В. Астроўскі і Н. Казлоўскі — пра асабістую гігіену падлетка).

Як бачым, ужо гэтыя першыя работы мультыплікатараў рэспублікі былі зроблены ў важных і неабходных жанрах: палітычны плакат, адрасаваны дарослым, смешныя і павучальныя фільмы-гутаркі для дзяцей.

На жаль, у гісторыі нацыянальнай кінематаграфіі склалася так, што дзесяцігоддзі аддзялялі пачатак развіцця нашай мультыплікацыі ад яго прадаўжэння. Тым больш каштоўныя крокі, якія зроблены ў апошнія гады. Вялікую цікавасць да мультыплікацыйнага фільма праяўлялі ў гэты перыяд нашы дакументалісты. У аб'яднанні «Летапіс» ствараліся фільмы, якія па сутнасці з'яўляюцца арыгінальнымі і ў чымсьці наватарскімі работамі.

Так, вялікай папулярнасцю ў дзіцячай аўдыторыі карыстаўся фільм В. Шаталава пра марское падарожжа маленькага і смелага мышаняці Піка, якое адчувала сябе ў душы марскім ваўком. В. Шаталаў, сам славуты наш марскі падарожнік, у лірыка-гумарыстычнай форме выказаў у фільме ненасытную прагу да марскіх хваляў, штормаў, нечаканых сустрэч, адкрыццяў. Рамантычнасць фільма была падкрэслена свежай і трапяткой музыкай Ш. Калаша, святочнасцю каларыту маляваных фонаў. Тут мультыплікацыя, якая дапамагла стварыць казачнай прыгажосці пейзажы, плённа спалучалася з загыміраванай рэальнай прыродай. А галоўным героем — мараком Пікам — было сапраўднае, жывое мышаня.

Вядомы дакументаліст І. Пікман таксама паспрабаваў свае сілы ў мультыплікацыі. Яго вабіць арыгінальны стыль цеснага сілуэтнага фільма, не надта развіты параўнальна з маляваным і лялечным фільмамі. У І. Пікмана здымаюцца акцёры пантамімы, прычым на экране мы бачым іх сілуэты адначасова з яркімі маляванымі дэталямі. Малюнак тут — арганічная частка твора. Трэба адзначыць і асаблівую тэматычную накіраванасць фільмаў «Прытча пра ваду», «Прытча пра зямлю», «Прытча пра паветра». Так, гэта вострагратэскавыя сучасныя прытчы, нездарма яны былі адзначаны дыпломамі на Міжнародным фестывалі экалагічных фільмаў у Балгарыі. Сучаснасць вобразнай мовы фільмаў дапамагае выявіць сучаснасць іх думкі, іх ідэі. Аўтары яшчэ раз прымушаюць нас задумацца аб ахове прыроды, аб небяспечнасці алкагалізму, курэння. Даўно вядомыя ісціны, дзякуючы іх вобразнаму асэнсаванню, быццам набываюць значэнне першаадкрыцця.

Работы В. Шаталава і І. Пікмана — гэта як бы подступы да павароту нашай кінематаграфіі ў бок неабсяжных магчымасцей мультыплікацыйнага фільма. Нарэшце — ужо даўно наспеў час гэта зрабіць — у апошнія 5 гадоў на «Беларусьфільме» быў наладжаны і сістэматычны выпуск маляваных і лялечных стужак.

Маладая беларуская мультыплікацыя, якая перажывае сваё другое нараджэнне, прыйшла ў свет мастацтва, якое выпрацавала шматлікія спосабы вобразнага пераасэнсавання свету мовай малюнка і пластыкі. Выдатныя работы ствараюцца не толькі на «Саюзмультфільме», але і ў Латвіі, Эстоніі, Малдавіі, Грузіі, на Украіне, у Казахстане. Першы мультыплікацыйны фільм выпушчаны сёлета ў Кіргізіі. Плённа развіваюцца самыя розныя жанры — байка, казка, прытча, філасофскае эсэ, балада, легенда, гумарэска, анекдот і г. д. Самая простая лінія, якая чароўна пераўтвараецца ў чалавечкаў, звяроў, розныя прадметы ў адных карцінах, суседнічае з багатай жывапіснай мовай карцін пазітычнага напрамку. А лялечныя фільмы вабяць нас бязмежнай прасторай фантазіі аўтараў, якія могуць нас прымусіць палюбіць і нябачанае ў прыродзе стварэнне — Чабурашку, і лялек, якія сапернічаюць па псіхалагічнай напоўненасці з жывымі людзьмі (напрыклад, у фільме А. Бураўса «Казета»).

Такім чынам, маладая беларуская мультыплікацыя апынулася адразу ў суседстве з творамі самага высокага класа. І сведчанне самых сур'ёзных да яе адносін — правядзенне ў Мінску выязнога пленума Усесаюзнай камісіі па мультыплікацыйнаму кіно Саюза кінематаграфістаў СССР.

Праграма беларускіх мультыплікатараў дэманстравалася сумесна з новымі работамі майстроў рэспублік нашай краіны. І размова ішла ў агульным кантэксце клопатаў аб развіцці вобразнай мовы гэтага прыгожага і непаўторнага віду мастацтва, якое сёння ўсё больш адчувае неабсяжнасць сваіх магчымасцей. Крытэрый жа быў — для ўсіх мастацтваў адзіны — выражэнне глыбокай ідэі пры дапамозе непаўторных сродкаў менавіта дадзенага віду мастацтва. Сярод невялікай пакуль яшчэ колькасці беларускіх мультфільмаў — казкі, заснаваныя на традыцыях нацыянальнага фальклору («Касец-волат», «Мілавіца», «Дудка-весялушка»); вясёлыя і павучальныя гісторыі пра жывёл, дзе за простай фабулай схавана недвухсэнсоўная мараль, адрасаваная маленькім гледачам: не трэба выхваляцца, належыць быць сціплым («Квака-задавака»); заўсёды дапамагай сябрам («Аленчына кураня», «Папяровая казка»); не хітруй, не цурайся працы («Цімка і Дзімка»). Ісціны ўсе гэтыя простыя і вядомыя, але ж справа кінематаграфістаў — адкрыць іх нанава, зрабіць так, каб дзеці натуральна засвоілі гэтыя маральныя нормы. А тут ужо ўсё залежыць ад фантазіі мастака, яго таленту. І, безумоўна,— ад бездакорнага валодання сваёй прафесіяй, рамяством.

Каб абмеркаваць работы беларускіх калег, у рэспубліку прыехалі сусветна вядомыя рэжысёры мультыплікацыі — І. Іваноў-Вано (аўтар фільмаў «Крадзенае сонца», «Канёк-гарбунок», «Дванаццаць месяцаў», «Ляўша», «Сяча пры Кержанцы»), Ф. Хітрук (яго работы — «Фільм, фільм, фільм!», «Канікулы Баніфацыя», «Вінні-Пух», «Востраў», «Юнак Фрыдрых Энгельс»), Р. Качанаў (стваральнік карцін «Пісьмо», «Чабурашка», «Кракадзіл Гена»), І. Гурвіч («Легенда пра палымянае сэрца», «Казка пра месячнае святло»), Р. Раамат («Стралок», «Поле», «Антэны ў ільдах»), Х. Парс («Цвік», «Чарамора»), Б. Сцяпанцаў («Малыш і Карлсан», «Скрыпка піянера»). Прыехалі таксама кіназнаўцы краіны, якія распрацоўваюць пытанні тэорыі мультыплікацыі,— В. Волкаў, С. Асенін, Н. Венжар.

Выступаўшыя на пленуме адзначалі, што за гэтыя некалькі гадоў, колькі існуе і развіваецца беларуская мультыплікацыя, сталі ўвачавідкі прыкметнымі рысы яе прафесіяналізацыі. Амаль не сустрэнеш сёння натуралістычнага капіравання чалавечай мімікі, якая так непрыемна ўспрымаецца ў маляваным фільме. А яшчэ зусім нядаўна мы бачылі гэта (напрыклад, у карціне «Аленчына кураня»). Больш мэтанакіраванай стала работа мастакоў-мультыплікатараў, сталее прафесіяналізм рэжысёраў, цікава праяўляюць сябе мастакі. Прадстаўленая праграма ў цэлым — гэта ўжо не вучнёўскія работы, хаця сярод аўтараў большасць — дэбютанты. Беларускія майстры мультыплікацыі актыўна і няспынна вучацца — яны пачынаюць сваю дзейнасць у той час, калі існуе класіка савецкай і сусветнай мультыплікацыі, і тут пачатковец павінен валодаць пэўным узроўнем майстэрства.

Прыемна, што некаторыя з прадстаўленых фільмаў давалі падставы для такой сур'ёзнай прафесійнай размовы без скідак на маладосць. Напрыклад, лялечны фільм «Цімка і Дзімка» (сцэнарыст і рэжысёр М. Лубянікава, аператар Г. Куранны, мастак Д. Мохаў) прываблівае нейкай асаблівай непасрэднасцю, абаяльнасцю галоўных персанажаў — коціка і мядзведзя. Просты расказ пра сумленнага працаўніка і хітраватага гультая аўтары здолелі падаць з такой дасціпнасцю, з такімі выразнымі жартаўлівымі дэталямі, што глядач міжволі шчыра ўсміхаецца, захапляючыся, калі героі трапляюць ва ўсё новыя нечаканыя сітуацыі. Акрамя Цімкі і Дзімкі, у фільме ёсць і вельмі арыгінальная, камічная карова-прыгажуня, і разумнае мышаня са сваім індывідуальным характарам. Персанажы непаўторныя, а характары іх канцэнтруюць тыповыя чалавечыя рысы — мо таму з такой цікавасцю і глядзіцца фільм. Гэты твор з поўнай падставай прыводзіўся ў размовах на пленуме разам з лепшымі работамі іншых студый — «Пра малпу» («Саюзмультфільм»), «Шаўковы кутасік» («Казахфільм»). Наогул беларускія кінематаграфісты-лялечнікі паказалі нядрэнны ўзровень майстэрства. Многім спадабаўся арыгінальны па сваёй фактуры, па асаблівым гумару, з якім зроблены «саламяныя» персанажы фільма «Дудка-весялушка» (сцэнарыст Б. Лобан, рэжысёр Я. Ларчанка, аператары Т. Логінава і Я. Топер, мастакі Я. і П. Ларчанкі). У ім адчуваюцца традыцыі народных вырабаў з саломкі, але аўтары здолелі іх пераасэнсаваць, зыходзячы з сучаснага погляду на традыцыйныя фігуры знаёмых персанажаў. Кожная лялька (мужык, баба, хлапец, дзеўка, нават карова) радуе вока багатай фантазіяй і гумарам, з якім яны зроблены. Каб гэты фільм быў больш цэласным у мастацкіх адносінах, яму не хапіла пэўнай сюжэтнай распрацоўкі. Стварыўшы такіх арыгінальных персанажаў, аўтары быццам не зусім ведалі, што з імі рабіць, і лялькі замітусіліся на экране ў нейкім калейдаскопе, так, што мы амаль не паспяваем іх разгледзець.

Культура лялечнага фільма сёння вельмі высокая, тут свае законы тыпізацыі, свае прынцыпы псіхалагічнай абмалёўкі персанажаў, якія беларускім кінематаграфістам яшчэ трэба будзе дэталёва спасцігаць на практыцы.

Пэўныя спрэчкі выклікалі і нашы маляваныя стужкі, асабліва заснаваныя на народных казачных матывах. У фальклоры акрэсліўся вобраз народнага героя — ці то асілка, ці простага сялянскага сына, сціплага і працавітага. Менавіта гэты апошні тып персанажаў абраны аўтарамі фільмаў «Мілавіца» (сцэнарыст В. Тарас, рэжысёр Ю. Бутырын, мастакі Г. Сямёнаў, В. Тарасаў, аператар Л. Вісарыёнава, кампазітар Л. Захлеўны) і «Касец-волат» (сцэнарысты Г. Карпава і Г. Удавянкоў, рэжысёр Л. Шукалюкаў, аператар Л. Вісарыёнава, мастак Я. Ларчанка). Але ж у гэтых фільмах героі знешне не надта прывабныя, у іх адчуваюцца хутчэй рысы карыкатурнасці, нават празмернага гратэску. Да таго ж сцэнарыі гэтых стужак не даюць героям магчымасці пасапраўднаму праявіць сваю сілу і кемлівасць — занадта ўжо ўсё вырашаецца само сабой. Народная казка патрабуе пошукаў цэльнага мастацкага вобраза, своеасаблівага стылю. Тут гэта не да канца ўдалося. Але ж несумненныя і дасягненні — настолькі добра намаляваны Цуда-Юда ў фільме «Касец-волат»: чорнае пудзіла з чырвонай зяпай надзвычай камічнае, у яго босыя ногі і тонкія рукі з магутнымі лапамі.

Наогул, пошукі адзінства стылю ў каларыстычным вырашэнні маляванага фільма — важная праблема для беларускіх кінематаграфістаў. У шэрагу фільмаў мы бачым стракаты колер, аляпаватасць, нязграбнасць у каларыстычнай гаме (гэта тычыцца, напрыклад, фільмаў «Аленчына кураня», «Мілавіца», «Квака-задавака»). А між тым, наколькі высокай можа быць культура колеру, сведчаць, напрыклад, прадстаўленыя ў праграме пленума фільмы эстонскага рэжысёра Р. Раамата «Поле» і «Антэны ў ільдах». Гэта сапраўдная паэма колеру — ад сціпнага, стрыманага манахромнага адлюстравання да багацця таноў і адценняў прыроды — заснежанай, зімовай, расквечанай зелянінаю вясны, упрыгожанай жаўцізной асенняга поля. Гэта высокае жывапісна-пластычнае майстэрства мультыплікацыі, прычым Р. Раамат удала выкарыстоўвае тэхніку мяккіх пераплываў. У яго колер ільецца, пяе, быццам бачная мелодыя.

Аўтары беларускага фільма «Ён прылятаў толькі аднойчы» (сцэнарыст Р. Хуснутдзінава, рэжысёр Л. Шукалюкаў, аператар Л. Вісарыёнава, мастак Т. Жыткоўская) таксама своеасабліва выкарыстоўваюць колер. Гэта фантастычная гісторыя пра іншапланецяніна, які аднойчы наведаў зямлю, атрымаў у дар ад адной сям'і ружу, а потым дасылаў такія ружы са сваёй далёкай планеты. Таленавіты сцэнарыст Р. Хуснутдзінава — майстар паўтаноў, лірычных інтанацый, паўнамёкаў. І таму зрокавае ўвасабленне яе драматургіі патрабуе асаблівага рэжысёрскага клопату. На жаль, у фільме вытанчаная фантастычнасць дзеяння знайшла ўвасабленне толькі ў паўразмытых адценнях блізкіх па танальнасці колераў, якімі намаляваны героі. Пастаноўшчыкі не здолелі праявіць глыбіннасць задумы сцэнарыста, фільм стварае няяснае ўражанне, здаецца быццам незавершаным.

Такім чынам, задача прафесіяналізацыі, удасканалення майстэрства, набыцця неабходных навыкаў — сёння галоўная для майстроў беларускага мультыплікацыйнага кіно. Хацелася б, каб за гэтым першым крокам — стварэннем серыі карцін — адбылося сталенне нашых майстроў лялечнага і маляванага фільма. Каб пашырыўся жанравы дыяпазон іх твораў, адрас іх работ. Каб звярнуты яны былі не толькі да маленькіх, але і да дарослых гледачоў. Каб больш цеснымі сталі іх сувязі з глыбіннымі вытокамі нацыянальнай культуры.

Праблем і клопатаў у маладой беларускай мультыплікацыі нямала. Але ж адбылося самае галоўнае — хай прыпоўнена, але ж сапраўднае другое нараджэнне.

Вольга НЯЧАЙ.

СПОВЕДЗЬ ГІТАРНАЙ СТРУНЫ

Гітара! Колькі сказана пра яе слоў захаплення! Ведала гітара і квецень славы, і твань забыцця; бывала і прынцэсай, і золушкай «пры двары яе вялікасці Музыкі». Але заўсёды мела яна сваіх энтузіястаў, сваіх паплечнікаў.

Уладальніца мяккага і спецыфічнага гуку, выключна шырокага арсеналу выразных сродкаў, лірычнасці і шчырасці, гітара па праву стала найбольш папулярным і любімым інструментам шырокіх народных мас. Але сам інструмент — рэч неадухоўленая, пакуль не крануць яго рукі музыканта. А калі гэта рукі Льва Андронава — гітара загаворыць. Загаворыць амаль чалавечым голасам. І ўсё будзе ў ёй: і боль незваротнай страты, і памяць сэрца, будуць пачуцці глыбокія. Вось тады мы і ўбачым быццам дзве гітары. Адна — музычны інструмент, другая — паэтычны сімвал, сімвал вялікай душы, поўнай высакародных чалавечых пачуццяў.

Леў Андронаў дастаткова вядомы і ў музычным свеце нашай краіны, і за мяжой. Шматгадовая канцэртная дзейнасць прынесла яму заслужанае прызнанне аматараў гітары. Яго ігра адразу ж прымушае слухаць. Слухаць, здавалася б, такія знаёмыя і простыя перабоpы струн. Ён бярэ гітару ў рукі не толькі з тым, каб проста сыграць, — каб выказацца, і за вонкавай лёгкасцю мы чуем маленькі сімфанічны аркестр.

Гітара Андронава гучыць у эфіры; яна гучыць у канцэртных залах Масквы, Ленінграда, Кіева, Новасібірска, Брацка, на Далёкім Усходзе і ў Грузіі, у вытворчых цэхах і ў клубах працаўнікоў вёскі. Леў Андронаў неаднаразовы госць і Беларусі.

Вось і нядаўна мінчане з захапленнем прымалі выступленні Л. Андронава. Яго віртуознасць і натхненне — палоняць. Чысціня гуку, чысціня пасажаў — унікальная. Разнастайныя праграмы яго канцэртаў. Гучыць музыка ўсіх эпох і стыляў. Тут і В. Галілеі, Л. Мілан, І.-С. Бах; тут чуем і І. Альбеніса, М. дэ Фалья, Э. Віла-Лобаса і савецкіх кампазітараў — Д. Шастаковіча, М. Рачменскага, В. Шабаліна... Ён першы і адзіны выканаўца канцэрта для гітары з сімфанічным аркестрам Б. Асафьева.

Асабліва беражліва адносіцца Андронаў да скарбніц рускага народнага музіцыравання. Апрацоўка і варыяцыі народных песень гучаць непаўторна і каларытна. Нарэшце, ён суправаджае канцэрты Б. Штокалава, Г. Каравай, Г. Янкоўскай.

Вядомасць і папулярнасць Андронава — гэта вядомасць і папулярнасць мастака, які спалучыў у сабе «дзве гітары». Тонкі і тэмпераментны музыкант, у гэтай сваёй асаблівасці Андронаў — з'ява унікальная. Ён, бадай, адзіны цяпер захавальнік старадаўніх традыцый, прадстаўнік той музычнай стыхіі, якая ў апошнія гады зноў прывабіла мільёны слухацкіх сэрцаў.

Разумеючы істотную ролю гітары ў пытаннях музычнага выхавання шырокіх народных мас, Л. Андронаў дастойна нясе нялёгкую працу прапагандыста - канцэртанта і педагога.

Пасля кожнага выступлення да яго за кулісы прыходзяць усе, каго захапляе гітара. Прыходзяць не проста так, а абавязкова з пытаннямі: з чаго пачаць? дзе набыць? што лепш? і да т. п. І ўсе пойдуць з пачуццём задавальнення, усім ён дасць здавальняючы адказ, таму што і па-за сцэнай яго мастакоўская мэта — служэнне людзям.

Л. Андронаў.
Фота А. ДЗМІТРЫЕВА.

М. КОШАЛЕЎ.

ПРА ГУСЛЯРА

Аўдыторыя ў «Песняроў» вялікая. І надзейная: не гадзіну — гады складвалася. І таму ў нечым — неапраўдана-спагадлівая ў сваёй добразычлівасці, як правіла, усё прымае непахісна-безагаворачна. Зрэшты, як жа інакш: хіба не жывіць усякую любоў ды прыхільнасць перш-наперш бязмежная вера?... Лёгка было мне, пакінуўшы стороннія чуткі, чыесьці меркаванні па-за канцэртным парогам, слухаць перадсвяточнае выступленне «Песняроў». Як трымаюць яны артыстычную форму, як сцвярджаецца іх густ, як у новым застаюцца яны сабою ранейшымі.

Новы твор — паэма-легенда «Гусляр» (тэкст Янкі Купалы, музыка Ігара Лучанка, аранжыроўка Уладзіміра Мулявіна) — працяг іх ранейшых пошукаў ва ўзбуйненых эстрадных формах, чарговы зварот да класічнай беларускай паэзіі. Звычайна, гаворачы пра новае, яго з нечым параўноўваюць. З чым жа параўноўваць гэтую прэм'еру: з першай вакальна-сцэнічнай кампазіцыяй ансамбля «Песня пра долю» (таксама па вершах Я. Купалы), з музычнай асновай — дыпломнай кантатай І. Лучанка «Курган» ці з літаратурнай крыніцай — славутай Купалавай паэмай?... Сказаць пра большую тэатралізаванасць «Песні...» (намёткі дзеяння, сістэма персанажаў, касцюмы, танец) у параўнанні з аратарыяльным аскетызмам «Гусляра» (тут жывапісны заднік ды шчодрая ігра святлом)?. Сказаць, што аранжыраваны лучанкоўскі «Курган» падоўжыўся ў часе? Сказаць, што купалаўскі тэкст застаўся непарушны? Але ўсё гэта не скажа пра якасць новага твора.

Паспрабуем інакш.

Як для вока — ласкавае святло, так для слыху — тая кранальная эпічная інтанацыя, за якой — апавядальнік-Купала, за якой — блізкі да беларускага фальклору лучанкоўскі меладызм, за якой — непаўторны «пастаральны» почырк «Песняроў». Як для вока — рэзь бліскавіцы, так для слыху — інтанацыйны, гарманічны, рытмічны і тэмбравы «гармідар», бяздушныя інструментальныя хады, што нагадваюць «музыку» дэтэктыўных стужак. Відавочна, тут мелася на ўвазе характарыстыка агіднага свету княжаскага хорама. Толькі ж і гратэск, здаецца, павінен мець меру... У новым творы добра відаць індывідуальнасць кожнага стваральніка. Калі ж хочацца ўбачыць сінтэз, «швы» замінаюць: шкада — бачыш эклектыку...

Гэтыя радкі — не аналіз, не ацэнка. Гэта інфармацыя пра першае ўражанне. Хаця і рэцэнзіі пішуцца падчас па першаму ўражанню... Як бы там ні было, аўдыторыя ў «Песняроў» надзейная: новы твор прыняты з удзячнасцю.

С. БЕРАСЦЕНЬ.

ДЭБЮТ ЧАРОЎНАГА ДУЭТА

Імя Станіслава Італінскага стала вядома беларускім аматарам музыкі восенню 1972 года. Дзевятнаццацігадовы музыкант, студэнт Маскоўскай дзяржаўнай кансерваторыі на Усесаюзным конкурсе піяністаў у Мінску атрымаў званне лаўрэата І прэміі. Сведкаў таго складанага спаборніцтва ўразіла выкананая С. Італінскім саната до мінор Ф. Шуберта. Жывая, трапяткая плоць гэтай цудоўнай музыкі раскрывала сваю шчырасць пад пальцамі піяніста. Не выпадкова музыканты старэйшага пакалення ўспаміналі ў тыя дні імя Уладзіміра Сафраніцкага. У маладым піяністе яны бачылі пераемніка гэтага паэта фартэпіяна, яркі рамантычны талент...

Мінула шэсць гадоў. За першай перамогай з'явіліся новыя. С. Італінскі—лаўрэат V Міжнароднага конкурсу імя П. Чайкоўскага, Міжнароднага конкурсу ў Брусэлі. І сёлетняй восенню яго зноў слухалі мінчане. На гэты раз піяніст выступіў у новым амплуа: у камерным ансамблі са скрыпачом Уладзіславам Італінскім, студэнтам V курса Маскоўскай дзяржаўнай кансерваторыі (клас прафесара Л. Когана). У канцэрце прагучалі творы Л. Бетховена, С. Пракоф'ева, І. Стравінскага, М. Равеля, І. Брамса. Музычны вечар быццам абвясціў нараджэнне цудоўнага дуэта.

Саната № 5 для фартэпіяна і скрыпкі фа мажор Л. Бетховена, якая адкрыла канцэрт, была выканана па-майстэрску. Светлыя таны інтэрпрэтацыі дакладна адлюстравалі сутнасць санаты, названай «Вясенняй» і напісанай у шчаслівы для Бетховена час, калі кампазітар быў літаральна палонены маладой арыстакраткай Джульетай Гвічардзі. Іншы раз, праўда, хацелася пажадаць скрыпачу большай цеплыні гучання інструмента, большай эмацыянальнай свабоды (напрыклад, у II частцы—adagio molto espressivo). У цэлым жа саната была сыграна з добрым густам, з надзвычайным адчуваннем ансамбля. Такое тонкае ўзаемнае ўлоўліванне імпульсаў выканання, дасканаласць дуэта не часта пачуеш з канцэртнай эстрады.

Яркімі інтэрпрэтатарамі падаліся музыканты ў санаце № 2 для скрыпкі і фартэпіяна рэ мажор С. Пракоф'ева, блізкай па свайму вобразнаму строю да яго «Класічнай сімфоніі» і «Золушкі». Не было «прапушчана» ні аднаго выгіну мелодыі, ні адной мадуляцыі. Адчувалася і належная тонкая (але ненаўмысна далікатная) дэталізаваная выразнасць, уважлівае, прачулае выкананне кожнай асобнай інтанацыі—як у добрым дэкламацыйным спяванні—і выключны размах вобразаў, быццам выкананых разцом скульптара.

З вынаходлівай маляўнічасцю і лёгкасцю артыстычнай эксцэнтрыкі быў выкананы «Дывертысмент» для скрыпкі і фартэпіяна І. Стравінскага. У канцэртнай рапсодыі «Цыганка» М. Равеля музыканты перадалі мудрагелістую змену настрояў сачынення.

Дэбюту спадарожнічаў бясспрэчны поспех. Адзначым, што і Уладзіслаў, і Станіслаў Італінскія валодаюць сапраўды фенаменальным тэхнічным апаратам, і пры розным характары іх яркіх талентаў мужная віртуознасць выдатна спалучаецца з паэтычнасцю, тонкасцю ў глыбокім прачытанні сутнасці твора. У скрыпача У. Італінскага наперадзе—Міжнародны конкурс у Парыжы. Зычачы яму перамог, будзем думаць, што і на гэтым шляху яго падтрымае верная рука вопытнага партнёра, сталага мастака, паэта фартэпіяна—С. Італінскага.

Наталля СЦЕПАНЦОВА.

ТАЛЕНТ-ПОШУК-СТЫЛЬ

З палону авацый артыстаў вызвалілі словы вядучага, звернутыя ў залу: «Літва ад Беларусі не так далёка: наведвайцеся ў Вільнюс. Ці яны да вас завітаюць». Ды справа ж не ў кіламетрах: каб паслухаць гэтых музыкантаў, мінчане ехалі ў Ленінград, у Талін. Падзвіжнікі мастацтва лёгкія на пад'ём. Вось і самі музыканты: той працаваў у Архангельску, другі быў свердлаўчанінам, трэці жыў у Вільнюсе. І мала — знайшлі адзін аднаго: сумелі ж усе сабрацца ў Вільнюсе, іграюць разам...

Трыо сучаснага камернага джаза пад кіраўніцтвам В. Ганеліна неаднойчы заваёўвала званне лаўрэата на джазавых фестывалях — усесаюзных, міжнародных (не выключэнне — XI Сусветны фестываль моладзі і студэнтаў у Гаване). Так што сярод мінскай публікі былі тыя, хто ўжо ведаў пра мастацтва гэтай музычнай супольнасці. Але для большасці канцэрты нашых гасцей сталі неспадзяванай сустрэчай са своеасаблівай, нетрадыцыйнай для завай манерай. В. Ганелін (фартэпіяна, басет), У. Чакасін (духавыя), У. Тарасаў (ударныя) паказалі дасканалую тэхніку, імправізатарскую дасціпнасць, дзівоснае адчуванне партнёра, якое і жывіць джазавы арганізм. У безназоўных кампазіцыях каліва загадзя знойдзенага патанала ў бясконцым непадабенстве нованароджанай гукавой плыні. Слухачы рабіліся сведкамі складаных творчых працэсаў, якія адбываліся на сцэне, — нічога падобнага не бывае на канцэртах нават самых натхнёных выканаўцаў - інтэрпрэтатараў ужо «гатовай» музыкі... Трапіўшы ўпершыню на выступленне вільнюскага трыо, можна ці хутка прызвычаіцца да яго манеры, ці не прыняць яе зусім. Але, бадай, нельга не аддаць належнае музыкантам, якія так апантана ахвяруюць сябе мастацтву.

У час канцэрта фотааб'ектыў А. Дзмітрыева «падпільнаваў» аднаго з удзельнікаў трыо — У. Чакасіна.

С. ВЕТКА.

Уладзіміру ШАХАЎЦУ — 60

Вядомаму беларускаму пісьменніку Уладзіміру Шахаўцу спаўняецца 60 гадоў. У сувязі з гэтым праўленне Саюза пісьменнікаў Беларусі накіравала юбіляру прывітанне, у якім гаворыцца:

«Дарагі Уладзімір Міхайлавіч!

З выпадку Вашага 60-годдзя шлём Вам, нашаму таварышу і сябру па пяру, свае шчырыя віншаванні.

Выхадзец з сялянскай сям'і, Вы прайшлі вялікую жыццёвую школу: працавалі рахункаводам у калгасе, потым сакратаром сельсавета, вучыліся на рабфаку, настаўнічалі ў сельскай школе. У часе Вялікай Айчыннай вайны сталі ў рады партызан, а потым як воін Савецкай Арміі завяршылі свой баявы шлях у Берліне.

У пасляваенныя гады Вы скончылі Беларускі дзяржаўны універсітэт імя У. І. Леніна і паспяхова працавалі на ніве журналістыкі. Спачатку супрацоўнічалі ў газеце «Літаратура і мастацтва», потым ў рэдакцыі часопіса «Полымя». З 1948 г. Вы на рэдактарскай рабоце ў Дзяржаўным выдавецтве Беларусі, дзе займалі пасады загадчыка рэдакцыі дзіцячай літаратуры, намесніка галоўнага рэдактара выдавецтва.

З першымі вершамі выступілі Вы ў друку ў 1937 годзе. Пасля вайны надрукавалі шэраг кніг прозы — «Землякі», «Будзьце здаровы», «Пасля вяселля», аповесці для дзяцей «Крылаты дзень», «Чорны снег», зборнік дзіцячых апавяданняў «Пісьмо да сябра».

У Вашых творах паўстаюць вобразы нашых сучаснікаў, людзей няўрымслівых, працавітых і шчырых, бясконца адданых партыі і Радзіме. Вельмі шырокі дыяпазон тэм, якія прыцягваюць Вашу творчую ўвагу.

Паспяхова працуеце Вы і ў галіне перакладу. Дзякуючы Вам беларускія чытачы атрымалі на роднай мове паэмы «Мцыры» і «Ізмаіл-бей» М. Лермантава, лаасобныя вершы А. Пушкіна і У. Маякоўскага, «Макбет» В. Шэкспіра, «Звычайную гісторыю» І. Ганчарова і іншыя творы.

Ветэран выдавецкай справы, Вы карыстаецеся заслужанай павагай у выдавецтве «Мастацкая літаратура», дзе Вы зараз працуеце, за сваю гуманнасць, сардэчнасць і добры рэдактарскі густ.

Жадаем Вам, дарагі сябра, творчага натхнення, моцнага здароўя, шчасця».

Рэдакцыя штотыднёвіка «Літаратура і мастацтва» далучаецца да гэтага віншавання і жадае Уладзіміру Міхайлавічу доўгіх год жыцця, плёну ў творчай працы.

Дабрыня

Уладзіміру ШАХАЎЦУ ў дзень 60-годдзя

Усяго сябе аддаць з юнацтва
Людзям, любай справе, дабрыні.
Ад навал сівець ды не згінацца.
Давяраць вірам і глыбіні.
Зімы партызанскія і вёсны
І сягоння чуюць цішыню.
Мусіць, кожны дзень быў высакосны
І на смерць, і на разгул агню.
Радасць, быццам сцежка сувязнога,
Шустрая, знікае ў гушчарах.
Адлічыла перамога многа
Хуткіх вёрст праз непагадзь і страх.
Адгрымелі тлумна часу жорны.
Вецер веццем хрысціцца наўзмах.
Едзе з умалотам век мажорны.
Цепліцца вуголлем Млечны Шлях.

Рыгор БАРАДУЛІН.

СТАЛЫ ТАЛЕНТ

Старэйшаму беларускаму мастаку, вядомаму ілюстратару дзіцячай кнігі Анатолю Валянцінавічу Волкаву — 70. Яго малюнкі трывала ўвайшлі ў залаты фонд беларускага мастацтва. А некаторыя нават сталі хрэстаматыйнымі. Цяжка ў нашай рэспубліцы знайсці чалавека, які б пачынаў пазнаваць свет без вельмі дасціпных, пагледжаных у жыцці волкаўскіх вобразаў. Дастаткова прыгадаць яго ілюстрацыі да аповесці Міхася Лынькова «Міколка-паравоз», каб адчуць з якой любоўю ставіцца мастак да паказу герояў дзіцячых кніг. Міколка — маленькі грамадзянін. Яго не зблытаеш з кім-небудзь іншым.

Ілюстрацыі да паэмы Якуба Коласа «Міхасёвы прыгоды», да зборніка Цёткі «Для маленькіх» і асабліва да казак — цэлы свет, маляўнічы і цікавы. Казкі... Гэта і беларуская народная «Лёгкі хлеб», і ўкраінская «Саламяны бычок», і казкі А. С. Пушкіна.

Няхай першы поспех прыйшоў яшчэ ў канцы 40-х гадоў, калі ён зрабіў малюнкі да паэмы Якуба Коласа «Новая зямля», шмат старонак творчасці Волкава, прысвечаных дзецям. І гэта не толькі ілюстрацыі да кніг, а і станковыя лісты «Дзеці 20-х гадоў», «Юныя мінчане», «Дваровая каманда». Станковыя акварэлі мастака вельмі маляўнічыя, прыгожыя па сваіх колеравых спалучэннях, што сведчыць пра выдатныя жывапісныя здольнасці. І гэта не выпадкова, бо свой творчы шлях у мастацтве Волкаў пачынаў як жывапісец. І вучыўся ён таксама ў выдатнага жывапісца, свайго бацькі Валянціна Віктаравіча Волкава, з імем якога звязана не адна слаўная старонка ў гісторыі беларускага выяўленчага мастацтва.

Талент мастака шматбаковы, ёмісты. Цяжка знайсці хоць адну галіну мастацкай творчасці, дзе б ён не пакінуў свой след: жывапіс, плакат, сатырычныя замалёўкі жанравага і палітычнага характару ў часопісе «Вожык»...

Сорак пяць гадоў аддадзена любімай справе. Але творчая палітра мастака не старэе. Гледзячы на апошнія яго працы — ілюстрацыі «Наш адрас — дзіцячы сад» і «Калабок — залаты лабок», цяжка паверыць, што стварыў іх мастак, якому спаўняецца 70 гадоў. Па-сапраўднаму маладыя гэтыя творы.

Быць карысным людзям, прыносіць ім асалоду ад сутыкнення з сапраўдным мастацтвам — такое творчае крэда Волкава. І гэтай творчай праграме ён застаецца верны да канца.

Т. ШУМСКАЯ.

МАСТАЦТВА НА ТЭЛЕЭКРАНЕ

Тэлебачанне, якое трывала ўвайшло ў наш дом, як часцінка культуры і духоўнага жыцця, стала аб'ектам клопату не толькі саміх яго работнікаў, але ўсіх творчых саюзаў, навукова - даследчых інстытутаў, якія займаюцца праблемамі мастацтва. Усё больш цеснымі становяцца кантакты тэлебачання з мастацтвазнаўцамі і журналістамі. Бо ўсе мы з'яўляемся тэлегледачамі і ўсе зацікаўлены ў паляпшэнні якасці перадач, якія ідуць на нашых дамашніх экранах. Менавіта пра гэта гаварыў намеснік старшыні Дзяржтэлерадыё В. Чанін, адкрываючы пасяджэнне «круглага стала», які быў наладжаны Саюзам журналістаў рэспублікі і праходзіў на тэлебачанні.

Тэлежурналісты сустрэліся з мастацтвазнаўцамі, выкладчыкамі эстэтыкі ВНУ, работнікамі рэспубліканскага друку. Сваімі думкамі, заўвагамі, пажаданнямі падзяліліся дактары мастацтвазнаўства Е. Бондарава, Ю. Чурко, кандыдаты мастацтвазнаўства В. Нячай, Г. Ратнікаў, В. Салееў, Т. Кузняцова, журналістка Т. Цюрына.

Гаспадары расказалі пра найбольш значныя перадачы, якія пазнаёмілі гледачоў з тэатральным жыццём рэспублікі, з музычным, выяўленчым і кінамастацтвам. Тэма пасяджэння за «круглым сталом» была: прапаганда мастацтва сродкамі тэлебачання.

На Беларускім тэлебачанні ідзе шэраг перадач і пастаянных цыклаў, прысвечаных розным відам мастацтва. Гэта такія, як «У святле рампы», «Тэатральная гасціная», «24 кадры ў секунду», «Рэзананс», «Камертон», «Спектр» і іншыя.

Даволі часта тэлебачанне расказвае пра мастакоў, рэжысёраў, акцёраў, стварае творчыя партрэты дзеячаў культуры. Аднак, і гэта адзначалі ўсе выступаючыя, мала яшчэ такіх, якія запомніліся гледачу, выклікалі шырокі водгук. І нярэдка такое здараецца таму, што перадачы гэтыя грашаць драбнатэм'ем, малалікасцю пытанняў, якія яны закранаюць. Перадачы па мастацтву павінны асвятляць не толькі праблемы мастацтва, але і закранаць праблемы жыцця. Бо мастацтва заклікана дапамагаць асэнсоўваць жыццё, зразумець яго.

Хацелася б, каб знаёмства з тым або іншым дзеячам культуры і мастацтва не абмяжоўвалася расказам толькі пра яго творчасць. Але і «выдавала» б яго думкі, яго жыццёвую пазіцыю, яго светапогляд. Каб на экране адбывалася раскрыццё асобы чалавека. А пакуль што часцей за ўсё глядач чуе з экрана завучаны тэкст, бачыць адрэпеціраваныя сцэны і не прыкмячае жывога руху думкі і пачуцця.

Пераканаўча гаварылі ўдзельнікі «круглага стала» пра тое, што рэдка яшчэ на нашым тэлебачанні ідуць такія перадачы, у якіх бы вёўся дыялог, у якіх бы сутыкаліся розныя думкі, розныя погляды на адну і тую ж з'яву.

Вельмі бракуе яшчэ перадачам імправізаваных, непасрэдных зносін людзей, якіх глядач бачыць на экране. Спробай наладзіць такія імправізаваныя кантакты можна лічыць новую цыклавую перадачу «Тэатральная гасціная», якая пакуль толькі зрабіла заяўку на непасрэдны кантакт людзей, якім ёсць пра што расказаць, і таму яны цікавыя і гледачу.

Пашырыць кола субяседнікаў гледача, відаць, можна было б, запрашаючы на тэлебачанне самых розных людзей — не толькі мясцітых, чыя творчасць шырока вядома, пра каго ўжо створаны фільмы, напісаны артыкулы і кніжкі.

У прыватнасці, рэдка з экрана чуюцца галасы маладых мастакоў. А ў апошні час у рэспубліцы з'явілася шмат новых імён, шмат новых таленавітых твораў...

Слушныя заўвагі былі зроблены ў адрас тэлерэжысуры, якая слаба яшчэ карыстаецца выяўленчымі сродкамі. А эмацыянальнае ж уздзеянне мастацтва дасягаецца пераважна за лік відэараду. Менавіта тэлебачанне здольна перадаць усю эмацыянальную глыбіню твора мастацтва.

І вельмі вялікі недахоп той перадачы, якую можна слухаць не гледзячы на экран, таксама як радыё. Таму больш трэба «працаваць» выяўленчымі сродкамі.

Дарэчы, недастаткова яшчэ выяўленчых сродкаў і ў афармленні ўсіх перадач, не толькі па мастацтву. Пакуль яшчэ на рэспубліканскім тэлебачанні няма адзінага стылю афармлення — ад застаўкі на экране да інтэр'ера. Не знойдзена яшчэ свайго фірменнага, адметнага мастацкага афармлення.

Асабліва шмат заўваг было зроблена ў адрас перадач так званага часопіснага тыпу, якія грашаць пэўным штампам. Гэтыя перадачы часцей за ўсё носяць інфармацыйна - каляндарны характар.

Відаць, большы рэзананс выклікалі б перадачы буйныя, з удзелам людзей, якія працуюць у розных відах і жанрах мастацтва. У такіх перадачах павінны ставіцца праблемы, агульныя як для літаратуры, так і для мастацтва, бо літаратура і мастацтва рашаюць агульныя задачы, якія падказвае наша жыццё, наша сучаснасць. І, магчыма, лепш было б замест мноства асобных дробных цыклаў ствараць буйныя, больш значныя па зместу і больш цікавыя для гледача.

І, нарэшце, выступаючыя за «круглым сталом» скардзіліся на тое, што большасць перадач па мастацтву ідзе ў самы нязручны для гледача час — удзень, альбо позна вечарам.

Было выказана таксама пажаданне, каб рэспубліканскія газеты і часопісы больш удзялялі ўвагі рабоце Беларускага тэлебачання, часцей друкавалі рэцэнзіі на асобныя пастаноўкі, артыкулы па праблемах тэлебачання.

Бо клопат у тэлежурналістаў і работнікаў рэспубліканскага друку адзін — палепшыць якасць перадач.

Р. БАКУНОВІЧ.

ДАР НЕСУЧЫ ЛЮДЗЯМ

Да 70-годдзя з дня нараджэння Міколы ЗАСІМА

Цікавасць да паэзіі, народжанай рэвалюцыйнай барацьбой, не паслабляецца з часам. А калі палымяныя вершы падмацоўваюцца і вогненнай біяграфіяй паэта, то яна ўзрастае ўдвая.

Сваё права на паэтычнае слова Мікола Засім заваяваў у семнаццаць гадоў, калі давялося зведаць нары пружанскай турмы. Голас шчырага сэрца прабіўся з-за крат. У адным з варыянтаў аўтабіяграфіі паэт запіша: «Працую, як вол, шмат чытаю. найбольш люблю Крапіву». Вызначальныя рысы асобы мастака, чыёй улюбёнай зброяй стане вострае сатырычнае слова, пародыя, гратэск.

За рэвалюцыйную падпольную дзейнасць у 20—30-я гады ўлады шмат разоў М. Засіма арыштоўвалі. Патрэбна была грамадзянская мужнасць, каб у гады змрочнай рэакцыі далучыцца да праграмы з'езда заходнебеларускіх пісьменнікаў, які абвясціў прынцыпы камуністычнай партыйнасці і народнасці вызначальнымі.

Мастацкае слова паэта гучала са старонак прагрэсіўных заходнебеларускіх выданняў: часопісаў «Маланка», «Літаратурная старонка», «Асва», газет «Наша воля», «Наша праца». З-за цэнзурных меркаванняў ён часта мяняў псеўданімы, але чытач лёгка пазнаваў яго слова, што трапляла сваёй вастрынёй у секвестратара, асадніка, паліцыянта і іншых служак панства.

Створанае М. Засімам да верасня 1939 года арганічна ўвайшло ў скарбонку савецкай літаратуры. У 1940 годзе паэт быў прыняты ў Саюз савецкіх пісьменнікаў.

Выпрабаванні першых дзён вайны, калі давялося пахаваць бацькоў і многіх сяброў, не зламалі волю М. Засіма. Будучы інструктарам Антыфашысцкага камітэта Брэсцкай вобласці, паэт прымаў непасрэдны ўдзел у распрацоўцы і правядзенні партызанскіх аперацый, пісаў вершы, якія даходзілі да чытача праз газеты «Зара» і «За Радзіму».

Мара пра асобнае выданне вершаў у М. Засіма ажыццявілася ў 1947 годзе з выхадам зборніка «Ад шчырага сэрца». Затым была кніга «Вершы» (1954). Першы зборнік паэта вылучаўся абвостранасцю грамадзянскага пачуцця пры паказе напружаных падзей і пачуццяў барацьбы.

У гэты час усесаюзны чытач знаёміцца з яго некаторымі творамі праз пераклады, зробленыя А. Твардоўскім і М. Луконіным. Твардоўскага ўразіла блізкасць паэта да ўзораў вуснай народнай творчасці, да сучаснай насычанай востра-палітычным зместам байкі, гумарэскі, частушкі, песні. Прыйшоўшы ў паэзію ад жыцця працоўнага народа, М. Засім прынёс з сабой непаўторны круг тэм і вобразаў, сваё паэтычнае бачанне свету ў разнастайных праявах.

І сёння, напярэдадні юбілею Савецкай Беларусі, з узрушанасцю ўспрымаецца ўсхваляванае слова М. Засіма, звернутае да Радзімы, роднай зямлі, да ўсіх людзей працы:

Павер мне, мой бацькоўскі
краю,
Як песні пра цябе пяю,
Здаецца мне—я засяваю
Насеўкам родную зямлю.
Мая ты родная зямліца!
Хто палюбіў цябе навек,
Таму ты творчасці крыніца,
І той шчаслівы чалавек.

Мікалай ЧАМЕЗА.

БЕЛАРУСЬ У СЭРЦЫ

Ён зачароўвае кожнага, каму даводзіцца з ім сустракацца, маладой юначай энергіяй, бадзёрасцю, нястомнай дапытлівасцю, цікаўнасцю да самых разнастайных праяў імклівага жыцця. Такі наш сябар быў і ў тую ўжо далёкую— дзесяцігадовай даўніны — сцюдзёную зіму, калі ўпершыню прыехаў да нас, у Беларусь. Потым прыехаў яшчэ раз, потым . зноў, неўзабаве ў Сафіі выйшлі дзве кнігі — «Беларусь — белая балада» і «Бярозы, я ў палоне ў вас!» (зборнік вершаў), якія газета «Работнічэска дзела» назвала лепшымі сярод усяго напісанага ў Балгарыі пра нашу краіну за апошнія два дзесяцігоддзі.

Акрамя гэтага, у балгарскім друку з'явіліся шматлікія пераклады твораў Я. Купалы, Я. Коласа, М. Танка, І. Навуменкі, П. Макаля, А. Вярцінскага, Р. Барадуліна, В. Зуёнка, зробленыя С. Паптонеым. Ён быў адным з арганізатараў такіх анталагічных выданняў, як «Беларускія апавяданні», «Беларускія паэты—адно пакаленне»; па яго ініцыятыве выдавецтва ЦК БКП «Партвыдат», дзе ён працуе, уключыла ў свой план на 1979 год кнігу А. Адамовіча, Я. Брыля і У. Калесніка «Я з вогненнай вёскі...»

Аднак не толькі паспяховым асваеннем беларускай тэмы ён вядомы ў Балгарыі. Ёсць на яго радзіме цудоўны край — Дабруджа, край земляробаў і рыбакоў, край сучаснага машынабудавання і электроннай прамысловасці. Тут у С. Паптонева вельмі многа добрых знаёмых—ад кіраўнікоў акружкома партыі да кааператараў і вескі Далінц. Гэта пра іх, працаўнікоў гарадоў і сёлаў Сілістранскай акругі, С. Паптонеў напісаў раманы, якія сталі папулярнымі, «Кожны едзе куды-небудзь», «Самая паўночная поўнач», «Апошні стрэл», аповесці «Цуд», «Нечаканы вобыск», кнігі апавяданняў, шматлікія творы для дзяцей і юнацтва, зборнікі вершаў «Арлінае гняздо» і «Адзіны месяц сакавік». Па выніках літаратурнага 1975 года раман «Самая паўночная поўнач» быў прызнаны адным з лепшых твораў у Балгарыі на сучасную тэму, а крыху раней аповесць «Самы доўгі скачок Карнеліі» атрымала прэмію за лепшы твор для дзяцей і юнацтва.

Пісьменнік прызнаецца, што Беларусь назаўсёды ўвайшла ў яго сэрца, што на ўсё жыццё палюбіў, як ён пісаў, «гэты добразычлівы, гасцінны і мужны народ, які здзейсніў ратны і працоўны подзвіг,.. гэту зямлю, дзе спявае рачулка і салавей і не астыў яшчэ попел». І таму беларуская тэма ўрываецца ў кожную яго новую публіцыстычную кнігу. Падарожжа па нашай рэспубліцы ён успамінае ў кнізе «Адлегласці». У «Сібірскім сшытку» С. Паптонева і яго кнізе пра Казахстан — «Абудзіць мяне святло» — зноў гучыць рэха гераічнай абароны Брэста і аперацый беларускіх партызан. І, нарэшце, у самай апошняй сваёй кнізе «Кап'ё», напісанай у выніку паездкі па краінах Афрыкі, С. Паптонеў піша аб тым, як у эфіопскай сталіцы Адыс-Абебе трызніліся яму беларускія бярозы, беларуская зямля.

Тое, што робіць з маладой, бадзёрай энергіяй балгарскі пісьменнік-камуніст Стэфан Паптонеў, — узор сапраўднага, дзелавога ўкладу ва ўмацаванне неўміручай савецка-балгарскай дружбы. І ў гэтыя дні, калі адзначаецца пяцідзесяцігадовы юбілей нашага шчырага сябра, хочацца пажадаць яму новых выдатных поспехаў у гэтай высакароднай справе, новых цудоўных кніг, якія з радасцю, я ўпэўнены, сустрэне чытач і ў нас, у Беларусі.

Ванкарэм НІКІФАРОВІЧ.

Стэфан ПАПТОНЕЎ

Знаёмства

Мы па сутнасці ведаем вас,
рыцараў
пісталета й атруты,
вы шпурляеце ў бомбачках газ
балерыне пад ногі люта,
тупаеце ў шаленстве
так,
што са сцэны сыходзіць Ойстрах,
бруд на Горкага льеце ўсмак.

Вы, аматары сцэнак вострых,
вы стараліся памагчы,
каб рыдала дачка дыпламата,
вы пракраліся ў змроку начы
да машыны свайго сабрата,
быў ён, можа, унукам якраз
Нэтэ,
гнеў ваш дарэмна лютуе.

Не чапайце,
яна не для вас —
Серп і Молат —
эмблему святую,
што як мак узыходзіць
над
банкамі, небаскробамі ветла.
Не кранайцеся сцягу,
нат
не чапайце цень яго светлы.
А пачатак нявінны —
з свістка,
з правакацыі,
з факельнай ночы.

А пасля —
Бяроза-рака...

Так было, помнім мы,
неаднойчы.

Пяшчотнасць

Рэкі і азёры сіне-плынныя.
Ад бяроз ласкавыя лясы.
Мурагі на ўсе лугі нахлынулі...
Ляж —
і прычасціся да красы.

Патані —
у цішыні калыскавай:
статак звоніць звонам дабрыні.

Ды зірні —
маланкай белай бліскае
рыба смела ў белай быстрыні,
а праз хвілю, з радасцю зашлюблена,
плынь пяе,
гуляе
ў хараство.

Хоць пяшчота беззваротна згублена
ў цэлым свеце —
тут яна жыве.
Тут—у буднях, святах непаспешлівых.
Тут—у арматуры з сінізной.
Тут—у позірках таемна-ўсмешлівых,
са слязой затоенай адной.

І на ўсход алені адступалі ўсе
з войскам у суровыя гады.
І на захад наступалі, рваліся
з войскам да вясны, як да вады.

Ашукаліся стратэгі розныя, —
улічыць пяшчотнасць не змаглі...
Мабыць,
зброяй той была найгрознаю,
што змятала арміі з зямлі.

Бо пяшчотнасць
невытлумачальная,
як ракетна-атамны сакрэт...

Ворагаў прыводзіла ў адчай яна,
аніпераможная,
як свет.

Даланя

Ліст лазовы,
нібы даланя.

Ці ў Шампані заблуджу да дня,
ці ў спакоі віцебскага лесу,
ці адстану раптам ад экспрэса
ў горадзе, дзе глушыць цішыня,
і не буду разумець ні слова, —
мне падасць свой голас ліст лазовы
з самых нетраў віцебскага лесу,
ці з Шампані на пачатку дня.
Ліст лазовы,
нібы даланя.

Пераклаў Рыгор БАРАДУЛІН.

Праўда

Маёй вясны жывыя краскі
ратуй:
жывымі, ў іх красе, —
і нас не ўтопіць золак гразкі,
завея нас не занясе.

Ад мёртвых слоў,
ад песень лішніх:
каб заспяваць іх — не памкне,
як я цябе, ратуй мяне,
ратуй мяне ад слоў увішных,
што нібы дробныя манеты,
рука бяздумна раздае...

Ратуй зярняты майго лета —
я ўстурбаваны пра твае.
Кажу і клічу:
будзь такая,
кажы і кліч:
будзь сам такі!..

Я знаю: лепшая людская
надзея дзівіцца ў вякі.
Будзь Праўда.
Без такой завяну,
змарнею на тваіх вачах...
А ўсё астатняе спазнана,
як доўгі аднастайны шлях.

Пераклаў Алесь РАЗАНАЎ.

Анатолю ЧАРКАСАВУ — 50

Спаўняецца 50 гадоў з дня нараджэння пісьменніка Анатоля Чаркасава. У сувязі з гэтым праўленне Саюза пісьменнікаў Беларусі накіравала яму прывітанне, у якім гаворыцца:

«Дарагі Анатоль Паўлавіч!

Мы, Вашы сябры па пяру, сардэчна вітаем Вас у дзень Вашага пяцідзесяцігоддзя.

Закончыўшы ў 1956 г. факультэт журналістыкі Беларускага дзяржаўнага універсітэта імя У. І. Леніна, Вы пачалі сваю працоўную дзейнасць у Дзяржаўным выдавецтве Беларусі, дзе прайшлі шлях ад карэктара да рэдактара кніг дзіцячай літаратуры.

Першыя Вашы нарысы, што былі надрукаваны ў часопісе «Бярозка», засведчылі, што ў беларускую дзіцячую літаратуру прыйшоў цікавы літаратар. У 1960 г. выхоўзіць у свет Ваша кніга «Балотны скарб», праз тры гады новая — «Цудоўны камень», у якіх Вы шчыра і пранікнёна расказалі юным чытачам аб прыродных багаццях нашай рэспублікі, аб цікавых прафесіях геолагаў, будаўнікоў і шахцёраў, аб важных адкрыццях у галіне навукі і тэхнікі.

У наступных сваіх кнігах «Волаты на дарогах» і «Старонкі слаўнага летапісу» Вы яшчэ ярчэй пацвердзілі свой талент навуковага папулярызатара і публіцыста.

Прыемна адзначыць, што Вы плённа працуеце і ў жанры дакументальнага кіно, па Вашых сцэнарыях пастаўлены фільмы «Мазырскі ліст» і «Наш завод — наш дом».

Чалавек нялёгкага лёсу, Вы праявілі мужнасць і вялікую сілу волі, каб атрымаць адукацыю, стаць пісьменнікам, жыць багатым жыццём сапраўднага працаўніка-грамадзяніна. З'яўляючыся рэдактарам выдавецтва «Мастацкая літаратура», Вы шмат сіл і клопатаў аддаяце выпуску кніг для падрастаючага пакалення, дапамагаеце маладым пісьменнікам павышаць літаратурнае майстэрства.

Жадаем Вам, дарагі сябра, новых творчых здзяйсненняў, моцнага здароўя, вялікага шчасця».

Рэдакцыя штотыднёвіка «Літаратура і мастацтва» далучаецца да гэтага віншавання і жадае Анатолю Паўлавічу доўгіх год жыцця, здзяйснення новых творчых задум.

ПАД ЛЯЖАЧЫ КАМЕНЬ...

У верасні г. г. Міністэрства культуры, Міністэрства сельскай гаспадаркі, Дзяржкіно БССР і прэзідыумы БРК галіновых прафсаюзаў прынялі пастанову аб правядзенні рэйдаў праверкі гатоўнасці сельскіх культасветустаноў рэспублікі да работы ў асенне-зімовых умовах.

Сёння мы знаёмім чытачоў з матэрыяламі рэйда, праведзенага у Крычаўскім раёне.

Далёка за межамі Крычаўшчыны вядомы фальклорна-этнаграфічны калектыў Пакладаўскага сельскага клуба. У яго складзе мясцовыя хлебаробы, інтэлігенцыя, шмат моладзі. У рэпертуары ансамбля «Вячоркі» вясельныя, святочныя карагоды, народныя песні. Ніводнае свята на сяле не абыходзіцца без самадзейных артыстаў. Творчае жыццё калектыву не замірае ні летам, ні зімой. Наадварот, узімку яно нават актывізуецца, бо клуб тут выдатны — цёплы, утульны, чысты. Сюды заўсёды з ахвотай ідуць вяскоўцы.

Такіх асяродкаў культуры ў Крычаўскім раёне нямала. Званне «Клуб выдатнай работы» носяць Сычыкоўскі і Асавецкі сельскія клубы. Званне «Бібліятэка выдатнай работы» — Іванаўская і Маляцічацкая бібліятэкі. Тут выдатна падрыхтаваліся да работы ў зімовых умовах. Памяшканні своечасова адрамантаваны, завезена паліва.

І ўсё ж такі падрыхтоўка культасветустаноў раёна да работы ў асенне-зімовых умовах у цэлым пакідае жадаць лепшага.

У кожным з пяці сельскіх Саветаў, дзе пабывала рэйдавая брыгада, можна знайсці клубы і бібліятэкі не падрыхтаваныя да зімы. Возьмем, напрыклад, Іванаўскі сельскі клуб, што на тэрыторыі Лабковіцкага сельсавета. Пабудаваны ён подаўна, але яшчэ ні разу не рамантаваўся. У дзвярах шчыліны, сцены і столь брудныя. Такі ж непрывабны выгляд мае і Лабковіцкі сельскі Дом культуры. Да таго ж тут яшчэ і працякае дах. Большасць асяродкаў культуры не забяспечаны палівам.

Мы доўга гутарылі са старшынёй сельсавета І. Новікавым. Ён прызнаецца:

— Пра клубы і бібліятэкі пакуль што яшчэ не думалі.

Пакуль... Калі ж тут будуць думаць, калі восьвось ляжа зіма.

Такую ж, прыкладна, карціну можна наглядаць на тэрыторыі Батвінаўскага сельсавета. Не даходзяць рукі да асяродкаў культуры ў мясцовых кіраўнікоў. Варадзькоўскаму сельскаму клубу даўно ўжо быў выдаткаваны шыфер. А вось хто будзе рамантаваць дзіравы дах—яшчэ і цяпер невядома. Старшыня сельскага Савета І. Раманаў кажа, што гэта павінен рабіць калгас, а старшыня калгаса М. Кавалёў — што сельсавет.

Дарэчы, на тэрыторыі гэтага сельскага Савета памяшканні культасветустаноў старыя, некаторыя знаходзяцца ў аварыйным стане. Ну хто, напрыклад, з ахвотай пойдзе ў Калінінскую сельскую бібліятэку, дзе і паравое ацяпленне няспраўнае, і столь працякае.

Яшчэ больш непрыглядны малюнак мы наглядалі ў Дарагоўскай бібліятэцы Касцюковіцкага сельсавета. Дах дзіравы, тынкоўка паабсыпалася. Тое самае можна ўбачыць і ў Залесавіцкай сельскай бібліятэцы. На жаль, даўно не зазіралі сюды ні старшыня сельскага Савета Шчаўканогаў, ні старшыня мясцовага калгаса Краўчанка. А між тым, у гэтай гаспадарцы пустуе некалькі памяшканняў, куды даўно можна было б перавесці бібліятэку.

Не заняў прынцыповай пазіцыі да ўсіх гэтых фактаў раённы аддзел культуры (загадчык тав. Патапенка).

Рэйдавая брыгада: Л. Вячоркін, старшы метадыст Рэспубліканскага метадычнага кабінета Міністэрства культуры БССР, С. Іваньковіч, старшы метадыст Магілёўскага абласнога Дома народнай творчасці, С. Якубенка, метадыст Крычаўскага раённага Дома культуры.

МІНСКІ ІНСТЫТУТ КУЛЬТУРЫ

ПРАДОЎЖЫЎ ТЭРМІН

прыёму дакументаў на падрыхтоўчае аддзяленне па 25 лістапада. Звяртацца па адрасу: Рабкораўскі завулак, 8.

РЭКТАРАТ.

ТУДЭМА—СЮДЭМА...

У ГАСЦЯХ

Хвядос Сойка ў роднай вёсцы не быў гадоў дзесяць. І вось у адзін свой водпуск сказаў сам сабе: «Хопіць! Хоць на два—тры дні, а заеду».

Дзядзька Сцяпан—больш нікога з блізкай радні ў вёсцы ў Хвядоса не засталося — быў так рады прыезду пляменніка! Закалоў парася, адкруціў галовы дзесяці курам і прыцягнуў з сельмага скрынку рознакаліберных бутэлек.

Прыйшлі суседзі — дзед Анціп, аднакласнік Сяргей Баразна і калгасны рахункавод Скакун.

Хвядоса пасадзілі на самае ганаровае месца за сталом — на покуце.

— Ну, пляменнічак, дзякуй, што прыехаў, — сказаў дзядзька. — Пасядзім, пагамонім, паўспамінаем. А пакуль па маленькай, за прыезд.

І дзядзька напоўніў гранёную шклянку, па самы верх.

— Мнагавата, дзядзька Сцяпан,—заікнуўся Хвядос.

— У нас, браце, па-простэму, — азваўся Сяргей Баразна.

— На пачатак — норма, — пазіраючы ўбок, сказаў рахункавод Скакун.

— Ты, Хведарка, не супраціўляйся, — падмігнуў дзед Анціп. — Ты — у гасцях.

— Будзь здаровы, госцейка! — сказаў і дзядзька Сцяпан, адным глытком асушыўшы свой посуд.

Хвядос заплюшчыў вочы і асіліў палову шклянкі.

— Крыўду ў шклянцы хочаш аставіць? — пляснула ў далоні цётка Дар'я.

— Ды я... не... — выціраючы вочы і ледзь пераводзячы дыханне, пачаў апраўдвацца Хвядос.

— Не пярэч, Хвядоска... Дацягні да канца, — пакрыўдзіўся дзед Анціп.

Хвядос здаўся і дапіў шклянку.

— Вось гэта па-нашаму! — пахваліў яго дзядзька Сцяпан і зноў напоўніў шклянкі.

— Цяпер для гамонкі... Каб весялей гаварылася... Давай, Хвядоска!

Мікола КОРЧ

Хвядос коса зірнуў на шклянку.

— Ты не пярэч! — рубануў далонню паветра дзед Анціп. — Не пярэч! Колькі гадоў на роднай старане не быў, га?

— Ты, Хведар, нос не занось угору. — Строга сказаў Сяргей.

— На пачатак — норма, — гледзячы міма госця, азваўся рахункавод.

У два заходы Хвядос зноў перакуліў шклянку.

Падзейнічала. Загаварылі ўсе адразу. Але слухаць не было каму і дзядзька Сцяпан зноў наліў шклянкі.

— Дзядзька Сцяпан!.. Мне... таго...

— Маўчы...

— Не пярэч!

— На пачатак — норма...

Хвядос матнуў галавою, пабялеў, быццам яму трэба было скакаць у прорву, і выпіў шклянку да дна.

— Ды я ж і не п'ю гарэлкі. Ніколі не п'ю, — ледзь варочаючы языком, сказаў Хвядос і зваліўся пад стол.

Дзед Анціп пачухаў бараду:

— Бач ты яго, не п'ю, кажа, а набраўся...

ТЛУМАЧАЛЬНЫ СЛОЎНІК

АБІБОК — асоба з пабітым бокам.

БАБЫЛЬ — бабулін унук.

ВЯЗАЦЬ — садзіць вязы.

ГАСЦІНЕЦ — маленькі госць.

ПРЫСТАНЬ — выцвярэзнік.

М. ШУЛЬГА.

Юозас БУЛОТА

АПЕРАТЫЎКА

Не ведаю, ці любіце вы ранішнія пяцімінуткі, а я — вельмі. Прыходзіш на работу, ля дзвярэй чакае цэлы натоўп. Неіярплівыя, сярдзітыя — чуеш, што зараз кінуцца на цябе, як ільвы, і разнясуць на шматкі. А ты спакойна заходзіш у кабінет, садзішся за пісьмовы стол, пасля прыадкрываеш дзверы і спакойна гаворыш: «Дарагія таварышы, позіру пачакаць некалькі хвілін. У мяне пяцімінутка».

Гоман у натоўпе расце, расце, расце і нарэшце замаўкае.

Праз дзве гадзіны, калі закончылася пяцімінутка, у пачаткальні застаюцца толькі самыя цярплівыя «львы», але і яны ператварыліся ў «трусянят». А з такімі вырашыць справу — гульня, некалькі мінут і па справе. А калі б не было ранішніх пяцімінутак, дык яны ж мучаліся б аж да абеду, нервавалі б.

Не думайце, што нашыя ранішнія аператыўкі — гэта толькі анекдоты! хіхі-хаха. Перш за ўсё сур'ёзныя размовы пра работу. Бо пяцімінуткі і ёсць для таго, каб абмеркаваць пякучыя праблемы вытворчасці. Сёння, напрыклад, шэф гаварыў пра дысцыпліну працы: адзін позніцца на тры мінуты, другі на чатыры, а мінуты гэтыя пасля ў гадзіны выліваюцца, якія мы трацім беззваротна, непрадуктыўна, назаўсёды. Прайшоўся шэф па нашых галовах! Крытыкаваў нас паўтары гадзіны.

Нядаўна на пяцімінутцы мы абгаварвалі вельмі важную справу. У нашай установе паявілася «высокая камісія»: выкрыла нейкія мінусы. Што нібыта наведвальнікі па некалькі гадзін чакаюць, а іх скаргі цэлымі месяцамі ляжаць у нашых пісьмовых сталах. І ўвогуле працуем мы не так, як трэба, або і зусім нічога не робім. Над вывадамі камісіі мы дыскуціравалі на пяцімінутках цэлы тыдзень, па дзве гадзіны кожны дзень. Уявіце, колькі часу трацім на пустыя размовы, колькі на розныя плёткі. І колькі гэта забірае часу, адведзенага для работы.

Цяпер ніхто не можа скардзіцца на нас, што дарэмна чакае да абеду: бо якраз у гэты час мы дыскуціруем, як хутчэй і лепш вырашыць яго справу.

Пераклаў з літоўскай У. СТРУМІЛА.

Сцяпан КРЫВАЛЬ

Вось бы наяву!

Сон прысніўся графаману
(Па сакрэту: Торбе Яну!):
Старшынёй ён стаў калгаса,
Дзе вырошчваюць... Пегасаў.

Мікола ВЯРШЫНІН

ЯК Я АДНОЙЧЫ БЫЎ ЖАНАТЫМ

Таварыш мой, пытаеш ты,
Чаму дасюль я халасты.
А я аднойчы жонку меў,
Аб тым вядома толькі мне.

Прыйшлі мы, памятаю, ў ЗАГС,
Там запісалі хутка нас,
А жонка — мара, ад такой
З нас кожны страціў бы спакой.

Але як выйшаў за парог,
Я на нагах стаяць не змог,
Апанаваў раптоўны жах,
Пачаў я вянуць на вачах.

Браточкі, што я нарабіў?
Ды я ж, як вецер, вольны быў.
Куды, бывала, захачу,
Туды, як птушка, палячу.

І як ужо мне зараз быць,
Што з гэтай жонкаю рабіць?
І не змірыцца мне, чаму ж
Не кавалер я ўжо, а муж?

Халодны пот мяне прабіў...
Пачаў будзільнік звон.
І я бясконца рады быў,
Што гэта толькі сон.

Рыгор РОДЧАНКА

Надрукуем!

Вожык напісаў пародыю на творы Ваўка і пайшоў у рэдакцыю «Лясны прамень», каб здаць яе ў друк.

— Твор неблагі,—прачытаўшы пародыю, сказаў Дзяцел.— Вы ўдала схапілі завываннe і наогул творчую манеру Ваўка, але друкаваць яе мы не будзем. І не таму, што Воўк у лесе не маленькая фігура. Не!.. Хоць што ні кажыце, а ён паважаная асоба, нядаўна яму прысвоена ганаровае званне «Заслужаны санітар лесу». А чаму вам не напісаць пародыі на Зайца ці на Мыш? Касавокасць Зайца і мышыны піск даўно заслугоўваюць асуджэння. Напішыце і прыносьце. Абавязкова надрукуем!..

Ад Дзятла Вожык выйшаў акрылены. Ён адчуў, што засвярбелі іголкі: натхненне не пакідала творцу.

РОЗДУМ ПАЧАТКОЎЦА

— Абразкоў зраблю
з дзесятак —
Скажуць: «Трошкі драбнавата.
Ні інтрыгі,
Ні сюжэта,
Несур'ёзна, браце, гэта...»

Напішу апавяданне —
Ды ці возьмуць да выдання:
«Шмат вады,
Залішне гумы,
На эцюд адзін — задумы...»

Напішу аповесць я —
Скажуць: «Тэма не твая...»

Напісаў бы я раман—
Ды ці траплю з ім у план?
Ляпнуць фразу,
Як пячатку:
«Ці не дужа для пачатку?..»

Мікола ЧАРНЯЎСКІ

Можа, мне
За вершы ўзяцца?
А ці ж буду друкавацца?..

Шмат жадання,
Шмат ахвоты,
Ды з чаго пачаць?..

— З работы!

ТВАРЭЦ

— Дзе тэму ўзяў
Для кніжкі гэтай?
На трактарным?..
Ці, можа,
На БелАЗе?..
— Дзе ўзяў?
Ды тут ніякага сакрэту:
Аж пад зямлёю —
Да шахцёраў лазіў!..
— Цікава, гм-м...—
Тварэц-дружбак скрывіўся,—
Я да такога, брат,
Яшчэ не апусціўся...

ДЗІВАК-ЧАЛАВЕК...

Малюнкі П. КОЗІЧА.

Анатоль ЗЭКАЎ

ЯК ЛЁГКА ДЫХАЮЦЬ ПАЭТЫ...

Як лёгка дыхаецца ў маі...
М. ЧАРНЯЎСКІ.
Як лёгка дыхаць летам...
І. МАРКЕВІЧ.
Як лёгка дыхаецца зноў...
Р. БАРАВІКОВА.

Зімой, вясной, а хто і летам,
Нібы ў палоне нейчых мар,
Натхнёна дыхаюць паэты,
Забыўшыся на ганарар.
Радкі, як медзянкі, напеўна
Звіняць на радасць маладым.
Паэты і жывуць, напэўна,
Што лёгка дыхаецца ім.

«Литература и искусство» — орган Министерства культуры и правления Союза писателей БССР. Минск.

«ЛІТАРАТУРА І МАСТАЦТВА»

Выходзіць па пятніцах на шаснаццаці старонках.

Ордэна Працоўнага Чырвонага Сцяга друкарня выдавецтва ЦК КП Беларусі.

Індэкс 63856 12345678910 12345678910 АТ 23567

Адрас рэдакцыі: 220600, ГСП, Мінск, вул. Захарава, 19.

Тэлефоны: прыёмнай рэдакцыі — 33-24-61, намесніка галоўнага рэдактара — 33-25-25, адказнага сакратара — 33-44-04, аддзела грамадска-палітычнага жыцця і інфармацыі — 33-22-04, аддзела прозы і паэзіі — 33-24-62, аддзела крытыкі і бібліяграфіі — 33-24-62, аддзела тэатра, кіно і музыкі — 33-21-53, аддзела выяўленчага мастацтва, архітэктуры і вытворчай эстэтыкі — 33-21-53, аддзела культуры — 33-24-62, аддзела пісем і масавай работы — 33-22-04, выдавецтва — 23-52-85, бухгалтэрыі — 23-77-65.

Рукапісаў рэдакцыя не вяртае.

Галоўны рэдактар Алесь АСІПЕНКА.

Рэдакцыйная калегія:

Заір АЗГУР, Ефрасіння БОНДАРАВА, Барыс БУР'ЯН, Мікола ГІЛЬ (адказны сакратар), Уладзімір ГНІЛАМЁДАЎ, Юрый ГРЫГОР'ЕЎ, Канстанцін ГУБАРЭВІЧ, Васіль ІВАШЫН, Віктар КАВАЛЕНКА, Аляксандр КАПУСЦІН (намеснік галоўнага рэдактара), Уладзімір НЯФЁД, Нічыпар ПАШКЕВІЧ, Аляксей ПЫСІН, Міхаіл САВІЦКІ, Барыс САЧАНКА, Язэп СЕМЯЖОН, Юрый СЕМЯНЯКА, Мікола ТКАЧОЎ, Юлія ЧУРКО.